Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЧЭРВЕНЯ 2009 г.
АЎТОРАК
№ 114
(26472)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

БЕЛАРУСЬ ШЧЫРА ЖАДАЕ ПАБУДАВАЦЬ З ЕЎРАПЕЙСКІМ САЮЗАМ ДОБРЫЯ АДНОСІНЫ

Беларусь шчыра жадае пабудаваць з Еўрапейскім саюзам добрыя адносіны, заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 22 чэрвеня на сустрэчы ў Мінску з камісарам ЕС па знешніх сувязях і еўрапейскай палітыцы суседства Бенітай Ферэра-Вальднер.

Фота БЕЛТА.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што заўсёды быў прыхільнікам адкрытай палітыкі, і прапанаваў правесці «абсалютна сумленную і шчырую размову». «Апошнім часам у ЕС ёсць палітыкі, якія лічаць, што Лукашэнка вядзе нейкую гульню з Еўропай, што ён такі-сякі і нічога не збіраецца мяняць у краіне і ў адносінах з Еўропай. За ўсе свае гады прэзідэнцтва я ніколі не дазваляў сабе паводзіць сябе несумленна, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Можа, я не падобны на дыпламата, але я лічу, што палітыка павінна мець адкрыты характар. Нават калі табе сёння гэта нявыгадна, трэба сказаць праўду, таму што праз некаторы час усё роўна адкрыецца хлусня і з сітуацыі выходзіць будзе вельмі складана».

Звяртаючыся да Бенiты Ферэра-Вальднер, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што гатовы адказаць на ўсе пытанні, «нават калі гэта будуць вельмі няёмкія пытанні».

Прэзідэнт падкрэсліў, што Беларусь хацела б выбудаваць нармальныя адносіны з Еўрасаюзам, паколькі Еўропа з'яўляецца суседам Беларусі, на краіны ЕС прыпадае палавіна тавараабароту, да таго ж гандлёвае сальда для Беларусі складаецца дадатнае. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Еўрасаюз вельмі тэхналагічны, а Беларусь мае высокатэхналагічную эканоміку, і таму без супрацоўніцтва з ЕС наша краіна не можа далей развіваць сваю эканоміку. «Чаго мы хочам ад Еўропы? Каб еўрапейцы разумелі, што Беларусь — не толькі геаграфічны цэнтр гэтага кантынента, тут жывуць вельмі прыстойныя, сумленныя, працавітыя людзі, тут існуе незалежная суверэнная дзяржава, і замахвацца на гэта, як бы некаму ні хацелася, мы дазволіць не можам», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Паводле слоў, супрацоўніцтва з ЕС для нашай краіны мае значэнне таксама ў крэдытна-фінансавай сферы.

Гаворачы аб тым, што Беларусь можа прапанаваць са свайго боку Еўропе, Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што гэта не толькі яе геаграфічнае становішча на скрыжаванні транспартных магістраляў, яе транзітныя магчымасці, але і пытанні забеспячэння бяспекі. «Мы злучальнае звяно паміж Еўрапейскім саюзам і Расійскай Федэрацыяй, — сказаў Прэзідэнт. — Праз тэрыторыю Беларусі праходзяць асноўныя нафтавыя і газавыя артэрыі, аўтамабільныя і чыгуначныя шляхі, прычым усё гэта знаходзіцца ў добрым стане, лепшым, чым у нашых суседзяў».

Акрамя таго, паводле слоў кіраўніка дзяржавы, Беларусь ніколі не мела нараканняў з боку Еўропы наконт таго, што яна не забяспечвае асноўныя элементы бяспекі ЕС. Наша краіна актыўна змагаецца з нелегальнай міграцыяй, наркатрафікам, перавозкай радыеактыўных матэрыялаў. Акрамя таго, у рэспубліцы абсалютна стабільная абстаноўка: няма міжканфесіянальных і нацыянальных канфліктаў. На думку Прэзідэнта, «гэта стварае тую аснову, на якой Беларусь і Еўрасаюз могуць будаваць свае адносіны».

Аляксандр Лукашэнка падзякаваў Бенiце Ферэра-Вальднер за тое, што, нягледзячы на шчыльны графік работы, яна прыехала ў Беларусь. Ён таксама падкрэсліў, што ад гэтай сустрэчы залежыць вельмі шмат. «Мы шчыра жадаем, хоць камусьці гэта не падабаецца, пабудаваць з вамі добрыя адносіны», — запэўніў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Бенiта Ферэра-Вальднер звярнула ўвагу на тое, што яна з'яўляецца першым камісарам ЕС, які знаходзіцца з візітам у Беларусі. На яе думку, гэты візіт мае сімвалічнае значэнне і сведчыць аб наяўнасці патэнцыялу, які існуе ў адносінах Беларусі і Еўрасаюза.

Як падкрэсліла камісар ЕС, Беларусь знаходзіцца на скрыжаванні еўрапейскіх дарог, а таму наша ўзаемадзеянне павінна быць «вуліцай з двухбаковым рухам».

Бенiта Ферэра-Вальднер нагадала, што краіны ЕС звярнуліся да Беларусі з просьбай выканаць «шэраг пажаданняў», некаторыя з іх былі выкананы. «Тыя захады, якія вы зрабілі, далі магчымасць еўрапейцам пераасэнсаваць падыход да вашай краіны, — адзначыла яна. — Калі будзе жаданне з вашага боку, то будзе гатоўнасць і з нашага наладжваць супрацоўніцтва». Камісар ЕС падкрэсліла таксама, што Еўрасаюз паважае суверэнітэт Беларусі, ведае яе гісторыю і разумее, як складана быць мостам паміж Усходам і Захадам.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Б.ФЕРЭРА-ВАЛЬДНЕР ПАДТРЫМЛІВАЕ ІДЭЮ ЗНІЖЭННЯ КОШТУ ШЭНГЕНСКАЙ ВІЗЫ ДЛЯ БЕЛАРУСАЎ ДА 35 ЕЎРА

Камісар ЕС па знешніх сувязях і еўрапейскай палітыцы суседства Бенiта Ферэра-Вальднер падтрымлівае ідэю зніжэння кошту шэнгенскай візы для беларусаў да 35 еўра. Аб гэтым яна паведаміла ў Мінску журналістам, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Гаварыць аб адмене візавага рэжыму для Беларусі пакуль рана, паколькі для істотнай візавай лібералізацыі неабходна адпаведнае рамачнае пагадненне, якога пакуль няма», — сказала Бенiта Ферэра-Вальднер. Пры гэтым яна паведаміла, што ў час сустрэчы з ёю Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка выказаў просьбу аб зніжэнні кошту шэнгенскай візы для грамадзян Беларусі з 60 да 35 еўра. «Гэта пытанне павінна быць абмеркавана і вырашана кожным членам ЕС. Я пастараюся давесці гэта пасланне, якое я як еўракамісар падтрымліваю», — дадала Бенiта Ферэра-Вальднер.

БАНКАЎСКАЯ СІСТЭМА БЕЛАРУСІ ЗАХАВАЛА ДАВЕР НАСЕЛЬНІЦТВА

Банкаўская сістэма Беларусі захавала давер насельніцтва: укладў ў банках з пачатку года павялічыліся на 19 працэнтаў, а ў параўнанні са студзенем—маем 2008 года — амаль на 1/3. Аб гэтым далажыў Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку старшыня Праўлення Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч.

Пётр Пракаповіч таксама паведаміў, што Нацыянальны банк Беларусі змяніў межы дапушчальных ваганняў курсу беларускага рубля адносна карзіны валют з плюс/мінус 5 працэнтаў да плюс/мінус 10 працэнтаў. Адпаведнае рашэнне было прынята Праўленнем Нацыянальнага банка 22 чэрвеня 2009 года. Гэта значыць, што цяпер тэарэтычна межы вагання кошту карзіны складаюць ад Br864 да Br1056.

Такое рашэнне было прынята ў сувязі з тым, што кошт карзіны да сённяшняга дня выйшаў на верхнюю мяжу калідора ваганняў, а асноўныя валюты, якія ўваходзяць у карзіну (долар ЗША, еўра, расійскі рубель), у свеце паводзяць сябе нестабільна. Для таго, каб не было тэхнічных пытанняў з выхадам за межы граніцы, Праўленне Нацыянальнага банка пашырыла калідор ваганняў кошту карзіны.

Гэта не значыць, што кошт карзіны будзе хутка набліжацца да межаў новага пашыранага калідора. Цяпер перадумовы для значных ваганняў валютнага курсу адсутнічаюць, цяпер няма неабходнасці ні ў зніжэнні курсу, ні ў яго ўмацаванні. На працягу бліжэйшых месяцаў курс беларускага рубля адносна карзіны валют застанецца на ўзроўні, максімальна блізкім да існуючага цяпер. «Мінімум месяц сітуацыя не будзе змяняцца», — сказаў Пётр Пракаповіч.

Што датычыцца далейшага развіцця сітуацыі, то ў Нацбанку лічаць, што беларускі рубель на працягу года будзе і ўмацоўвацца, і аслабляцца. Пры гэтым у Нацбанку выказваюць надзею, што сітуацыя будзе паляпшацца і неабходнасць рэзкіх ваганняў не ўзнікне. За перыяд з пачатку года курс беларускага рубля ў цэлым быў у межах аб'яўленага раней калідора ваганняў карзіны плюс/мінус 5 працэнтаў. У асобныя дні беларускі рубель умацоўваўся да карзіны да 6 працэнтаў і зніжаўся да 5 працэнтаў. «Мы прымаем адпаведныя рашэнні на валютным рынку ў залежнасці ад існуючай сітуацыі. Мы не зацыкліваемся на прынятых рашэннях і не лічым, што яны з'яўляюцца канчатковымі. Нацбанк кожны дзень аналізуе сітуацыю, прымае тыя ці іншыя ўзважаныя рашэнні», — сказаў Пётр Пракаповіч.

(Заканчэнне на 2-й стар.)



Фота БЕЛТА.

Акцыя «Звон смутку» на Буйніцкім полі на Магілёўшчыне».

Мемарыяльная дошка ад імя Прэзідэнта Беларусі адкрыта на тэрыторыі былога канцлагера Дахау

На тэрыторыі былога канцэнтрацыйнага лагера Дахау ўрачыста адкрыта мемарыяльная дошка ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Як сказаў на цырымоніі кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Уладзімір Макей, «у гэты трагічны дзень пачатку ўварвання ваеннай машыны трэцяга рэйха на тэрыторыю маёй Радзімы мы адкрываем яшчэ адзін памятны знак ахвярам нацыянал-сацыялізму — тут на тэрыторыі былога пекла, лагера знішчэння Дахау, будзе мемарыяльная дошка, прысвечаная вязням з Беларусі, якія знаходзіліся і загінулі тут».

Гэты памятны знак — трэці на тэрыторыі Германіі, устаноўлены ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, адзначыў Уладзімір Макей.

Ён выказаў удзячнасць усім, хто мае дачыненне да ідэі стварэння памятнага знака ў Дахау, і тым, хто аказаў рэальную падтрымку ў рэалізацыі праекта. Мемарыяльны знак Дахау паслужыць новым пакліканням ня памяць аб бязвінных вязнях канцлагера і незлічоных беларускіх ахвярах нацысцкага генацыду.

Канцлагер Дахау быў адным са звёнаў жудаснага ланцуга сацыяльнацыяналістычнага тэрору. Сярод расстраляных, замучаных голадам, задушаных газам вязняў было нямала беларусаў. «На жаль, мы не можам назваць агульную колькасць ахвяраў, не ведаем імён усіх дэпартаваных ў гэта страшнае месца жыхароў нашай краіны», — сказаў Уладзімір Макей. Ён выказаў удзячнасць тым, хто сёння праводзіць у Германіі даследаванні, хто працуе з архівамі. «Мы расцэньваем гэту цяжкую працу не толькі як уклад у народную памяць, але і як пацвярджэнне веры ў тое, што любыя міждзяржаўныя палітычныя і іншыя рознагалоссі, любыя канфлікты павінны вырашацца цывілізавана», — сказаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

Фота БЕЛТА.

Уладзімір Макей таксама выказаў упэўненасць у тым, што беларуска-германскае ўзаемадзеянне ў гэтай высакароднай справе будзе і ў далейшым служыць умацаванню разумення і чалавечага даверу паміж нашымі народамі і ўсімі людзьмі з іншых краін.

На ўрачыстай цырымоніі адкрыцця мемарыяльнай дошкі ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь з былым канцлагеры Дахау прысутнічалі прадстаўнікі генеральных консульстваў Расіі, Украіны, Францыі, ЗША, прадстаўнікі фракцый і палітычных партый у парламенце федэральнай зямлі Баварыя, генеральны дырэктар Дзяржканцылярыі федэральнай зямлі Баварыя, мэр Дахау, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і дзелавых колаў.

У сваю чаргу генеральны дырэктар Дзяржаўнай канцылярыі федэральнай зямлі Баварыя Марцін Ноймаер адзначыў, што былым вязням канцлагера неабходна аддаць даніну памяці. Баварыя, як і Германія ў цэлым, усведамляе гістарычную адказнасць і імкнецца зрабіць усё, каб перадаць перасцярогу будучым пакаленням.

Уладзімір Макей ад імя Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь усклаў вянок да міжнароднага манумента вязням канцэнтрацыйнага лагера Дахау. Вянкі ўсклалі таксама гендырэктар Дзяржаўнай канцылярыі федэральнай зямлі Баварыя, прадстаўнікі грамадскай арганізацыі «Народны саюз Германіі па доглядзе ваенных магіл».

Канцэнтрацыйны лагер Дахау быў створаны ў 1933 годзе ў Баварыі недалёка ад Мюнхена. Вязнямі Дахау за час яго існавання з 1933 па 1945 год сталі больш за 200 тыс. чалавек з 30 краін. Лагер, першапачаткова разлічаны на 6 тыс. чалавек, быў пастаянна перапоўнены, умовы ўтрымання ў ім былі асабліва катастрафічныя ў канцы вайны.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

СУСВЕТНЫ БАНК ЗНІЗІЎ ПРАГНОЗ ДЛЯ СУСВЕТНАЙ ЭКАНОМІКІ

Сусветны банк лічыць, што рэцэсія ў сусветнай эканоміцы насамрэч глыбейшая, чым раней чакалася, і паніжэнне сусветнага ВУП складзе сёлета 2,9%, а не 1,7%, як раней прагназавалася. Як гаворыцца ў паведамленні банка, свет уступае ў паласу больш павольнага эканамічнага росту.

У цэлым рост сусветнага ВУП павінен аднавіцца ў 2010 годзе і дасягнуць 2% (у краінах, якія развіваюцца, — 4,4% у 2010 годзе і 5,7% у 2011 годзе), лічыць Сусветны банк.

«АЛЬ-КАІДА» АБЯЦАЕ ВЫКАРЫСТАЦЬ ЯДЗЕРНУЮ ЗБРОЮ ПАКІСТАНА, КАЛІ ЎДАСЦА

Лідар тэрарыстычнай арганізацыі «Аль-Каіда» у Афганістане Мустафа Абу аль-Язід у нядзельным інтэрв'ю тэлеканалу Al-Jazeera заявіў, што калі з'явіцца такая магчымасць, то «Аль-Каіда» выкарыстае ядзерную зброю Пакістана супраць Злучаных Штатаў.

Эксперты б'юць трывогу, што ядзерная зброя Пакістана можа апынуцца ў распараджэнні баевікоў, бо дзеянні рэгулярнага пакістанскага войска паказалі, што вайскоўцы не могуць эфектыўна супрацьстаяць нападам талібаў.

НА ПРЭЗІДЭНТА ІНГУШЭЦІІ ЗДЗЕЙСНЕНЫ ЗАМАХ

Магутнасць выбухавай прылады, выкарыстанай для замаху на прэзідэнта Інгушэціі Юнус-Бека Яўкурава, склала да 200 кг у тратыловым эквіваленце, паведамляюць расійскія інфарма агенцтвы са спасылкай на крыніцу ў сілавых структурах Паўднёвай федэральнай акругі.

Бомба спрацавала каля дзевяці гадзін раніцы 22 чэрвеня на шляху картэжа прэзідэнта рэспублікі. Пры замаху загінулі чатыры чалавекі, пяцёра, уключаючы Яўкурава, атрымалі раненні. Учора стала вядома, што Юнус-Бек Яўкураў быў дастаўлены ў рэанімацыю, праводзілася аперацыя. Да аперацыі стан Яўкурава быў стабільным, ён знаходзіўся ў прытомнасці. Чакалася, што параненага прэзідэнта перавязуць самалётам у адзін з маскоўскіх шпіталяў. Паводле некаторай інфармацыі, жыццё прэзідэнта ў бяспецы.

ДАВЕР ВЫБАРШЧЫКАЎ ДА АБАМЫ ЎПЕРШЫНЮ СТАЎ АДМОЎНЫМ



Упершыню пасля абрання на пасаду прэзідэнта ЗША паказчык падтрымкі дзейнасці прэзідэнта ЗША Барака Абамы выбаршчыкамі стаў адмоўным. Колькасць амерыканцаў, незадаволеных палітыкай яго адміністрацыі, на два працэнты перавысіла лік тых, хто безумоўна падтрымлівае Абаму.

КІРГІЗІІ ПРАПАНАВАЛІ ЗАХАВАЦЬ БАЗУ «МАНАС» ЗА МІЛЬЯРД ДОЛАРАЎ

ЗША гатовыя прапанаваць Кіргізіі за захаванне амерыканскай авіябазы «Манас» мільярд долараў, паведамляе «Незалежная газета».

Паводле звестак выдання, гэтая сума можа быць выдзелена пад выглядам інвестыцый з боку Турцыі.

З РАСІІ Ў ЭСТОНІЮ ІМІГРЫРАВАЎ ВОСТРАЎ

У Эстонію з Расіі прыплыў густа парослы лесам участак сушы плошчай у 4 гектары. Кавалак расійскай тэрыторыі адшчапіўся ад берага ў Нарвскім вадасховішчы, па тэрыторыі якога праходзіць мяжа паміж дзвюма дзяржавамі. Плынню гэтую плывучую выспу прыбіла да эстонскага берага.

КОЛЬКІ СТРАЦІЛІ НА КРЫЗІСЕ МАНАРХІ?

Пятнаццаць найбагацейшых каралеўскіх дынастый свету страцілі за год рэцэсіі 22 мільярды долараў, або 17 % свайго капіталу, які складае на гэты момант 109 мільярдаў долараў, падлічыў часопіс Forbes.

Найбольшыя страты адзначаныя ў шэйха Дубая Махамеда бэн Рашыд аль-Мактума, які «збяднеў» за год на 6 мільярдаў долараў з-за абвалу цэнаў на нерухомасць. Яго амбіцыйны праект стварэння і забудовы рукатворных выспаў, названы «восьмым цудам свету», упаў у цане на 50 %.

ПАСЕ ХУТЧЭЙ ЗА ЎСЁ АДНОВІЦЬ ДЛЯ БЕЛАРУСКАГА ПАРЛАМЕНТА СТАТУС СПЕЦЫЯЛЬНА ЗАПРОШАНАГА

ПАСЕ хутчэй за ўсё прыме рэзалюцыю па аднаўленні для беларускага парламента статусу спецыяльна запрошанага. Аб гэтым заявіў на адкрыцці ў Страсбургу летняй сесіі Парламенцкай Асамблеі Савета Еўропы прэзідэнт ПАСЕ Луіс Марыя дэ Пуч, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

«Асамблея хутчэй за ўсё прыме рэзалюцыю па аднаўленні статусу спецыяльна запрошанага для беларускага парламента. Гэта першы крок з боку Савета Еўропы з канкрэтнымі ўмовамі, гэта падзеная рука беларускаму парламенту, і я перакананы, што гэта дасць плён», — сказаў Луіс Марыя дэ Пуч. Калі 23 чэрвеня асамблея прагаласуе за аднаўленне статусу, то ён будзе адноўлены на год, потым ПАСЕ зноў вернецца да разгляду гэтага пытання. Беларуская парламенцкая дэлегацыя прыме ўдзел у дыскусіі па сітуацыі ў Беларусі, якая адбудзецца 23 чэрвеня ў Страсбургу ў ходзе летняй сесіі ПАСЕ. Дэлегацыю ўзначальвае намеснік старшыні ніжняй палаты беларускага парламента Валерый Іваноў.

МІР, ЗАЛЕВА: КАМУ — КРЫС НОРМАН, КАМУ — ШАШЛЫЧОК З КВАСАМ

Уражанні пад дажджом

Карэспандэнт «Звязды» тры дні пад моцнай залевай мужна наведваў «Музычныя вечары ў Мірскім замку».

Нагледзеўшыся па тэлевізары прыгожых карцінак з канцэртаў пад сценамі Мірскага замка, людзі, як апантаныя, тысячамі скіраваліся туды на мінулых выхадных. Спадзеючыся, відаць, добра адпачыць і пабачыць знаёмых артыстаў. У рэальнасці — з-за дажджу выйшла крыху інакш...

(Заканчэнне на 4-й стар.)

НЕВЯДОМЫЯ АДКРЫЛІ АГОНЬ ПА БЕЛАРУСКІХ ПАГРАНІЧНІКАХ НА ГРАНІЦЫ З УКРАІНАЙ

Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Дзяржпагранкамітэце. Невядомыя на аўтамабілях перагарадзілі дарогу нараду пагранічнікаў. У бок пагранічнікаў прагучалі выстралы. Затрымана шасцёра мясцовых жыхароў.

НЯВЕСТЫ ПРЫ ПАРАДЗЕ

Прыгожае жыццё

У прыгожаны сцягамі і паветранымі шарыкамі картэж з некалькіх кабрыялетаў, магутных байкаў, мікрааўтобусаў, лімузіна — «хамера» — і амаль паўсотні падмоклых, але надзвычай шчаслівых і прыгожых дзяўчат у вясельных сукенках... Так выглядаў «Парад нявестаў-2009», які адбыўся ў нядзелю ў Мінску.

Мерапрыемства, наладжанае святочным інфармацыйным цэнтрам Prazdnik.by, прайшло сёлета ўжо ў другі раз. Арганізатарам давялося разгледзець больш як 600 анкет, але ў выніку кастынгу былі адабраныя толькі 49 прывабных, таленавітых, працаздольных, творчых, дасціпных і разумных дзяўчат. Прычым, як расказала аўтар і кіраўнік Prazdnik.by Алеся Какошнікава, для шэсця ў «Парадзе нявестаў» не абавязкова мець мадэльныя параметры і нават не абавязкова быць у нявесцінym статусе — частка ўдзельніц замужам, некаторыя ўжо маюць дзяцей. «У адборы нас цікавіла галоўнае: прычына, па якой дзяўчаты хочуць удзельнічаць у парадзе. Было важна сабраць пазітыўных і энергічных людзей, якія гатовыя падарыць свята сабе і іншым», — патлумачыла Алеся. Акрамя таго, няўхільна выконваліся дзве ўмовы: узрост больш як 18 гадоў і згода з тым, што Парад нявестаў — зона без курэння.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.06.2009 г. (для б/н разлікаў)

▲ 1 долар ЗША	2 847,00
▼ 1 еўра	3 947,37
1 латвійскі лат	5 668,49
1 літоўскі літ	1 144,43
1 чэшская крона	151,47
1 польскі злоты	879,15
■ 1 расійскі рубель	91,13
1 украінская грыўня	371,67

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ	
USD	31,2408
10 UAH	40,7843
1000 BYR	11,0003
EUR	43,3216

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2009 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

ЦЁПЛА, АЛЕ ДАЖДЛІВА

У аўторак уначы месцамі, а ўдзень на большай частцы рэспублікі — кароткачасовыя дажджы. Уначы — 14—19 градусаў, удзень — 24—30, на поўдні — да 33 градусаў цяпла. 24 чэрвеня пройдуць кароткачасовыя дажджы. Днём магчымы град. Ноччу — 14—19, днём — 23—29, па паўднёвым усходзе — да 30—32 градусаў цяпла.

Масты дружбы са «Звяздой»

Падпіска-2009

Газета «Звязда» працягвае радаваць сваіх падпісчыкаў каштоўнымі прызамі, якія яны выйгралі па выніках падпіскі на 2-і квартал 2009 года.

Чарговы маршрут быў звязаны з Мастоўскім раёнам, дзе каляровы тэлевізар «Віцязь» зачакалася наша падпісчыца са стажам Марыя Шчаржэня. Праўда, трымаць курс на захад Беларусі, маючы на ўвазе толькі адзін «падпісны» пункт, было б не па-гаспадарску чыста з эканамічнага боку і рэкламна-маркетынгавым упушчэннем, каб лішні раз не нагадаць пра сябе на Гродзеншчыне, дзе ў найстарэйшага беларускамоўнага выдання шмат прыхільнікаў. Таму мы з задавальненнем пагутарылі з намеснікам старшыні Карэліцкага райвыканкама Анатолем Маркевічам, абмеркавалі надзённыя пытанні з кіраўніком Навагрудскага раёна Анатолем Кулаком, павіншавалі з днём нараджэння намесніка старшыні Дзятлаўскага райвыканкама Пятра Чырко, ацанілі выдатныя магчымасці ў веданні роднай мовы намесніка старшыні Зэльвенскага РВК Валянціна Семянякі, дамовіліся наладзіць больш цесныя кантакты з кіраўніком Ваўкавыскага раёна Дзмітрыем Гальцом... Прыемна, што ва ўсіх пунктах нашага двухдзённага ваяжу, які ўключыў у сябе дзясятак раёнаў, удалося знайсці з кіраўнікамі раённай «вертыкалі» і паштовых аддзяленняў сувязі ўзаемаразуменне па пытаннях падпіскі і сумеснай работы.

За актыўны ўдзел у віктарыне прызы ад «Звязды» атрымалі Яніна КУДАЎРЭНКА, Алеся СКАСКЕВІЧ і Тацяна ЗАСЦЕНЧЫК (злева направа).

Каляровы тэлевізар «Віцязь» нашай пастаяннай падпісчыцы Марыі ШЧАРЖЭНІ ўручае старшыня Мастоўскага РВК Аляксей ШАФАРЭВІЧ.

Безумоўна, што эпіцэнтрам паездкі стала вёска Пяскі, што ў прыгарадзе Мастоў. Тут у мясцовым сельскім Савеце, на тэрыторыі якога пражывае каля паўтары тысячы душ, нас чакала спадарыня Шчаржэня. Прыемна, што падтрымаць зямлячку ў такі незвычайны дзень згадзіўся старшыня Мастоўскага райвыканкама Аляксей Шафарэвіч. У размове з журналістам «Звязды» ён выказаў падзяку за каштоўны прыз і спадзяванні на тое, што ў наступны раз «Звязда» можа прыехаць сюды і з халадзільнікам. А мы і не супраць. Тым больш, што цяпер «Звязда» абвясціла аб новай гульні як сярод падпісчыкаў, так і сярод паштальёнаў. У абодвух выпадках галоўныя прызы — халадзільнікі «Атлант». Так што, шаноўны Аляксей Сцяпанавіч, за намі не заржавее. Спадзяёмся, што і Мастоўшчына нас не падвядзе наконт захавання ці росту падпісчыкаў.

А ў тым, што яны з'явяцца, мы не сумняваемся. Гэта было бачна па тым, як людзі актыўна ўдзельнічалі ў звяздоўскай віктарыне. У выніку самыя актыўныя атрымалі ад газеты памятныя сувеніры і прызы.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ. Фота аўтара.

Мінск—Карэлічы—Навагрудак—Дзятлава—Зэльва—Ваўкавыск—Масты—Гродна—Бераставіца—Свіслач—Слонім—Мінск.

Банкаўская сістэма Беларусі захавала давер насельніцтва

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Кіраўнік Нацбанка запэўніў Прэзідэнта, што сітуацыя ў грашова-крэдытнай сферы і на валютным рынку поўнасцю кантралюемая. Кіраўніку дзяржавы было даложана, што, нягледзячы на складаныя знешнеэканамічныя ўмовы, на сусветны крызіс, скарачэнне экспарту беларускай прадукцыі, у краіне не была дапушчана дэстабілізацыя валютнага рынка. Банкі задавальняюць патрэбнасці насельніцтва і прадпрыемстваў у валюце ў поўным аб'ёме.

На сустрэчы таксама ішла размова аб рабоце банкаўскай сістэмы краіны за студзень—май і аб рэалізацыі грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі ў 2009 годзе.

Прэзідэнт быў праінфармаваны аб тым, што ў краіне дасягнута стабільнасць ва ўсіх сферах эканомікі, за студзень—май забяспечаны эканамічны рост на ўзроўні 1,4 працэнта, чаго не назіраецца ў суседніх краінах.

Банкі ў поўным аб'ёме ажыццявілі крэдытаванне рэальнага сектара эканомікі. Так, за студзень—май прадастаўленыя эканоміцы крэдытныя рэсурсы выраслі на 17 працэнтаў, што адпавядае прагнозным паказчыкам. У параўнанні з мінулым годам яны выраслі ў 1,6 раза.

Стабільна працуе плацежная сістэма. Праз яе за 5 месяцаў гэтага года прайшло плацяжоў у 1,6 раза больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года.

У выніку прынятых Нацбанкам і ўрадам мераў адбываецца хуткае зніжэнне тэмпаў інфляцыі. Калі ў студзені прырост спажывецкіх цэнаў склаў 4,1 працэнта, то ў маі яны павялічыліся ўсяго на 0,3 працэнта. Такая сітуацыя будзе назірацца і ў бліжэйшы час.

Акрамя таго, Нацыянальны банк рэкамендаваў банкам ажыццявіць далейшае павышэнне ўзроўню даходнасці зберажэнняў грамадзян у беларускіх рублях і знізіць кошт дэпазітаў у замежнай валюце. Гэты крок накіраваны перш за ўсё на забеспячэнне яшчэ большай прывабнасці зберажэнняў у нацыянальнай валюце.

Таксама кіраўнік Нацбанка паведаміў, што меры ў галіне праводзімай курсавой і працэнтнай палітыкі поўнасцю падтрымліваюцца Міжнародным валютным фондам. Беларусь і МВФ маюць узгодненую праграму выхаду з крызісу.

Беларусь чакае, што ў бліжэйшы час Саветам Дырэктараў МВФ будуць завершаны неабходныя працэдуры, звязаныя з прыняццем рашэння аб павелічэнні для Беларусі крэдытнай лініі на $1 млрд, а таксама аб выдзяленні нашай краіне чарговага траншу крэдыту МВФ. Такім чынам, Беларусь ужо ў гэтым годзе атрымае амаль $2 млрд сродкаў МВФ. Гэта будзе тая неабходная аснова, якая забяспечыць далейшую стабільнасць нашай нацыянальнай валюты, стабільнасць эканомікі, выхад Беларусі з крызісу з мінімальнымі стратамі.

Прэзідэнты Беларусі і Венесуэлы ў час тэлефоннай гутаркі дамовіліся аб сустрэчы ў бліжэйшы час

Па ініцыятыве венесуэльскага боку 20 чэрвеня адбылася тэлефонная размова прэзідэнтаў Беларусі і Венесуэлы. Гутарка кіраўнікоў дзяржаў адбылася ў дзень пачатку візіту ў нашу краіну віцэ-прэзідэнта Венесуэлы Рамона Карысалеса, які прывёз пасланне Прэзідэнта Венесуэлы Прэзідэнту Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка і Уга Чавес усебакова абмеркавалі гандлёва-эканамічнае і палітычнае супрацоўніцтва дзвюх краін. Дэталёвая размова адбылася па пытаннях рэалізацыі буйнамаштабных сумесных праектаў у розных галінах — ад будаўніцтва і машынабудавання да нафтахіміі. Асаблівая ўвага ў час гутаркі была ўдзелена ходу рэалізацыі беларуска-венесуэльскага праекта па здабычы нафты ў Венесуэле. Бакамі была падкрэслена неабходнасць актывізаваць гэту работу, надаць ёй большую дынаміку. Кіраўнікі дзяржаў таксама абмеркавалі шэраг міжнародных пытанняў. У прыватнасці, Аляксандр Лукашэнка праінфармаваў свайго венесуэльскага калегу аб выніках візіту беларускай дэлегацыі ў Туркменістан. Сёння гэта вельмі перспектыўная краіна Цэнтральна-Азіяцкага рэгіёну, якая дынамічна развіваецца нават ва ўмовах сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Аляксандр Лукашэнка і Уга Чавес дамовіліся сустрэцца ў бліжэйшы час. Тэрміны сустрэчы, якая адбудзецца ў Мінску, будуць удакладнены па дыпламатычных каналах.

Рамон Карысалес перадаў Прэзідэнту Беларусі пасланне Уга Чавеса

Беларускі бок поўны рашучасці рэалізаваць усе дамоўленасці, дасягнутыя з Венесуэлай. Аб гэтым заявіў 21 чэрвеня Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з віцэ-прэзідэнтам Венесуэлы Рамонам Карысалесам.

У гутарцы з Рамонам Карысалесам кіраўнік беларускай дзяржавы абазначыў ключавыя моманты вынікаў размовы з венесуэльскім лідарам. «Мы вельмі доўга размаўлялі з Уга Чавесам. Мы абмеркавалі ўвесь комплекс нашых адносінаў і, шчыра скажу, агаварылі праблемныя пытанні, якія вы гатовы абмяркоўваць у Беларусі і па якіх гатовы прымаць рашэнні. У сувязі з тым, што Уга Чавес прыедзе сюды ў жніўні-верасні, хацелася б, каб гэты візіт быў выніковым, таму вельмі многае залежыць ад вашага цяперашняга візіту і ад сумеснай работы да прыезду сюды Прэзідэнта Венесуэлы», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы павінны ведаць, што прыехалі да сяброў, якія поўныя рашучасці рэалізаваць усе дамоўленасці», — дадаў ён.

Рамон Карысалес перадаў Аляксандру Лукашэнку пасланне Прэзідэнта Венесуэлы Уга Чавеса.

У параўнанні з 2007 годам у 2008 годзе тавараабарот нашай краіны з Венесуэлай павялічыўся на 298 працэнтаў за кошт росту экспарту і склаў $173,3 млн. Беларускі экспарт узрос больш як на 305 працэнтаў, дасягнуўшы $173,1 млн. Імпарт склаў $147 тыс. (знізіўся ў 6 разоў). Сальда для Беларусі склалася дадатнае ў памеры больш як $172 млн.

У студзені—красавіку 2009 года беларускі экспарт у Венесуэлу ў параўнанні з аналагічным перыядам 2008 года падвоіўся. Імпарт практычна адсутнічаў. У Венесуэлу пастаўляюцца калійныя ўгнаенні, грузавыя аўтамабілі, трактары, тапаграфічныя прыборы і інструменты, прычэпы і паўпрычэпы, шыны, дарожная тэхніка, сельскагаспадарчыя машыны для апрацоўкі глебы, сухое малако. У структуры імпарту асноўную долю складае кава. У 2007 годзе адкрыта і зарэгістравана прадстаўніцтва вытворчага аб'яднання «Беларуснафта». Створана беларуска-венесуэльскае сумеснае прадпрыемства па здабычы нафты на радовішчах Венесуэлы «Петралера БелаВенесалана». Дзейнічае таксама СП па сейсмаразведачных работах «Сісміка БелаВенесалана». У Венесуэле адкрыта прадстаўніцтва ААТ «Белгорхімпрам». Акрамя таго ў Венесуэле зарэгістраваны СП з удзелам ВА «БелАЗ» — «Вен-БелАЗ Каміёнес С.А.», ВА «БелаўтаМАЗ» — «МАЗВен С.А.», ВА «МТЗ» — «ВенеМінск Тракторэс С.А.».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Мемарыяльная дошка ад імя Прэзідэнта Беларусі адкрыта на тэрыторыі былога канцлагера Дахау

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Дахау стаў месцам правядзення медыцынскіх эксперыментаў над людзьмі. Згодна з архіўнымі данымі лагера, якія часткова захаваліся, пацверджана гібель 32 тыс. вязняў. Пры гэтым агульная колькасць загінулых ад голаду і холаду, знясілення, хваробаў, непасільнай працы і здзекаў у выніку пакаранняў смерцю і медыцынскіх эксперыментаў значна большая і застаецца невядомай.

Міністр эканомікі Баварыі можа наведаць Беларусь. Як паведаміў генеральны дырэктар Дзяржаўнай канцылярыі федэральнай зямлі Баварыя Марцін Ноймаер, дамоўленасць аб гэтым дасягнута на сустрэчы з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Уладзімірам Макеем ў Мюнхене. «Міністр эканомікі Баварыі можа прыбыць у Беларусь ужо ў гэтым годзе», — адзначыў Марцін Ноймаер. Плануецца абмеркаваць больш дэталёва магчымасць правядзення ў перспектыве Дзён эканомікі Баварыі ў Беларусі і Дзён эканомікі Беларусі ў Баварыі.

БЕЛТА

КІРАЎНІК ДЗЯРЖАВЫ АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПАВІНШАВАЎ НАРОДНАГА АРТЫСТА БЕЛАРУСІ ВАЛЕРЫЯ РАЕЎСКАГА З 70-ГОДДЗЕМ

Прэзідэнт у сваім віншаванні адзначыў значны ўклад Валерыя Раеўскага ў развіццё нацыянальнага драматычнага тэатра і пажадаў яму здароўя, даўгалецця і натхнення.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

СЧИТАТЬ НЕДЕЙСТВИТЕЛЬНЫМИ СТРАХОВЫЕ ПОЛИСЫ ЗАО «СК «БЕЛРОССТРАХ»:
— Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу (2РН, 2РП) серия БИ № 0750304, 0750308, 0750320, 0793538, 0793539, 0801583.
— Добровольное страхование наземных транспортных средств (авто-каско), ф. 2РН, 2РП серия АК № 0026100.
— Страховой полис (универсальный), ф. 2РП, 2РН (2 листа) серия БИ № 0001373.
— Квитанция 1-СУ серия ГС № 5386700, серия КС № 0274411, 0274777, 0274779, 0275610—0275612.

Утерянный представительством № 3 по г. Минску Белгосстраха бланк страхового полиса **по добровольному страхованию от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу формы 2РН, серия БЛ, № 542565 считать недействительным.**

Грошы

АДНАРАЗОВАЙ ІСТОТНАЙ ДЭВАЛЬВАЦЫІ РУБЛЯ НЕ ПЛАНУЕЦЦА...

НАЦЫЯНАЛЬНЫ БАНК ПАШЫРЫЎ КАЛІДОР ХІСТАННЯ КУРСУ БЕЛАРУСКАГА РУБЛЯ ДА КОШЫКА ВАЛЮТ ДА ПЛЮС-МІНУС 10 ПРАЦЭНТАЎ

Учора праўленне Нацыянальнага банка Беларусі прыняло рашэнне аб змяненні мяжы дапушчальнага хістання курсу беларускага рубля ў дачыненні да кошыка валют: калі раней меркавалася, што курс нацыянальнай валюты да кошыка па выніках года будзе складаць ад 912 да 1008 рублёў (плюс-мінус 5 працэнтаў), то цяпер гэтыя межы пашырыліся да плюс-мінус 10 працэнтаў. Гэта значыць, дапускаюцца хістанні кошту кошыка валют ад 864 да 1056 рублёў.

Што вымусіла галоўны банк краіны змяніць «арыенціры» для беларускага рубля, і ці магчымы ўжо ў найбліжэйшы час істотны скачок курсу нашага рубля да кошыка валют? — пра гэта мы запыталіся ў **намесніка начальніка Упраўлення інфармацыі Нацыянальнага банка Беларусі Міхаіла ЖУРАВОВІЧА.**

— Мэтазгоднасць змянення межаў дапушчальных хістанняў курсу беларускага рубля ў дачыненні да кошыка валют, у прыватнасці, прадыктаваная той няпэўнасцю, якая захоўваецца ў развіцці сусветнай эканомікі ў цэлым, і рызыкамі знешнеэканамічнага асяроддзя, нягледзячы на некаторыя прыкметы стабілізацыі эканомік шэрагу краін, — кажа Міхаіл Журавовіч. — Сёння назіраецца высокая ўзаемная няўстойлівасць сусветных валют. Таму пашырэнне калідора дазваляе нам стварыць рэзервовую магчымасць для больш гнуткай рэакцыі курсавой палітыкі ў тым выпадку, каля з'явяцца дадатковыя неспрыяльныя знешнія фактары.

— На мінулым тыдні курс беларускага рубля да кошыка дасягнуў верхняй пяціпрацэнтнай мяжы. Ці азначае гэта, што апошняе рашэнне Нацыянальнага банка прадыктаванае высокай верагоднасцю далейшага аслаблення нацыянальнай валюты?

— Адразу падкрэслю, што ў найбліжэйшы час Нацыянальны банк не плануе выкарыстоўваць новы пашыраны калідор. Гэта значыць, на практыцы мы не будзем выходзіць за межы хістання ў плюс-мінус 5 працэнтаў. На працягу найбліжэйшых месяцаў курс беларускага рубля ў дачыненні да кошыка валют застанецца на ўзроўні, які максімальна блізкі да таго, што склаўся цяпер. Да таго ж цяпер няма і перадумоў для значнага хістання валютнага курсу. Сітуацыя на валютным рынку і ў грашова-крэдытнай сферы поўнасцю кантралюецца. Айчынныя банкі функцыянуюць устойліва і ўсе плацяжы робяцца своечасова і ў поўным аб'ёме. Між іншым, рост укладаў беларусаў за 5 месяцаў склаў больш за 119 працэнтаў, што сведчыць пра давер насельніцтва да банкаў. Узгадаю, нарэшце, аб тым, што адбываецца і хуткае зніжэнне тэмпаў інфляцыі ў выніку зробленых захадаў: калі ў студзені прырост спажывецкіх цэнаў склаў 4,1 працэнта, то ў маі яны павялічыліся ўсяго на 0,3 працэнта.

— Вы згадалі пра тое, што ў найбліжэйшай перспектыве істотнага змянення кошту кошыка не будзе. Ці існуе такая верагоднасць, што праз пэўны час магчымая аднаразовая дэвальвацыя рубля на тыя ж 10 працэнтаў?

— Калі ў перспектыве курс рубля і будзе змяняцца ў дачыненні да кошыка валют у межах пашыранага калідора ў той ці іншы бок, то гэта будзе адбывацца плаўна, без прымянення значных аднаразовых карэкціровак. Спрыяць жа гэтаму будзе і рэалізацыя прадугледжанага комплексу агульнаэканамічных мерапрыемстваў, заснаваных у тым ліку на поўным выкананні Нацбанкам і Урадам праграмы stand-by з МВФ. У якасці аднаго з такіх захадаў галоўны банк краіны рэкамендаваў іншым ажыццяўляць далейшае павышэнне ўзроўню даходнасці зберажэнняў грамадзян у нацыянальнай валюце, пры тым, што ў маі сярэднія стаўкі па зноў прыцягнутых тэрміновых дэпазітах ужо дасягнулі 20,3 працэнта гадавых. Гэты крок скіраваны, перш за ўсё, на забеспячэнне яшчэ большай прывабнасці зберажэнняў, росту рэсурсаў банкаў і, адпаведна, максімальна поўнага задавальнення банкамі патрэбаў рэальнага сектара і насельніцтва. Акрамя таго, высокі ўзровень працэнтных ставак неабходны для павышэння збалансаванасці валютнага рынку і плацежнага балансу нашай краіны.

Як зазначае Міхаіл Журавовіч, МВФ поўнасцю падтрымлівае захады, што робяцца ў нашай краіне ў курсавой і працэнтнай палітыцы. Акрамя таго, ён падкрэсліў, што гэтыя захады — аснова для разгляду ў найбліжэйшыя дні пытання аб павелічэнні МВФ фінансавання Беларусі яшчэ на 1 мільярд долараў ЗША. У Нацыянальным банку разлічваюць, што рэспубліка атрымае другі транш крэдыту stand-by, які будзе павялічаны з 400 мільёнаў долараў да 675 мільёнаў.

Ігар ШЧУЧЭНКА.

СПАДЧЫНА ЦІ ДАРЭННЕ?

Які падатак неабходна будзе плаціць за кватэру ў выпадку, калі я атрымаю яе ў спадчыну, і ў выпадку, калі кватэру мне падораць. Пры гэтым цяперашняму ўладальніку кватэры я не з'яўляюся сваяком.

Аляксандр, *г. Гомель*

Што датычыцца такой маёмасці, як кватэра, то, як вызначана Законам Рэспублікі Беларусь «Аб падаходным падатку з фізічных асобаў» (артыкул 12, падпункт 1.15 пункта 1), даходы плацельшчыкаў, атрыманыя ад фізічных асобаў у выглядзе спадчыны, не падлягаюць падаткаабкладанню. Якія-небудзь абмежаванні для асобаў, што не з'яўляюцца сваякамі спадчыннадаўца, не вызначаны.

Наконт даходаў, атрыманых у выніку дарэння ад фізічных асобаў (рэзідэнтаў Рэспублікі Беларусь), якія не з'яўляюцца індывідуальнымі прадпрымальнікамі, артыкулам 12 Закона (падпункт 1.16 пункта 1) вызначана, што яны вызваляюцца ад падаткаабкладання толькі ў межах пяцісот базавых велічынь у суме ад усіх крыніц на працягу падатковага перыяду (года). Тут таксама няма абмежаванняў для не сваякоў дарыцеля. Базавая велічыня цяпер складае 35 000 рублёў.

Ёсць яшчэ Закон «Аб падатку на нерухомасць», згодна з якім аб'ектам падаткаабкладання прызнаюцца таксама кватэры, якія знаходзяцца ва ўласнасці фізічных асобаў. Калі фізічнай асобе належыць на праве ўласнасці адна кватэра, то, згодна з артыкулам 4 гэтага Закона, яна вызваляецца ад падаткаабкладання. Пры наяўнасці ў плацельшчыка двух і болей жылых памяшканняў (кватэр, пакояў) вызваляецца ад падаткаабкладання толькі адно жылое памяшканне (кватэра, пакой) па пісьмовай заяве плацельшчыка. Заява падаецца ў падатковы орган па месцы жыхарства, з указаннем месцазнаходжання ўсіх жылых памяшканняў (кватэр, пакояў), што належаць плацельшчыку. Законам вызначаны і іншыя падставы для вызвалення ад выплаты гэтага падатку, але пералічваць іх усе ў гэтым артыкуле не мае сэнсу, паколькі іх даволі шмат.

Гадавая стаўка падатку на нерухомасць для фізічных асобаў складае 0,1 працэнта кошту аб'екта падаткаабкладання.

Такія ўмовы падаткаабкладання пры атрыманні кватэры ў спадчыну і ў выніку дарэння існуюць цяпер. Законы мяняюцца. Якія будуць умовы на момант фактычнага атрымання спадчыны або афармлення дарэння кватэры, прадказаць немагчыма.

ВЫЗНАЧЫЛІСЯ СУПЕРНІКІ Ў ЕЎРАКУБКАХ

22 чэрвеня ў швейцарскім Ньоне прайшла жараб'ёўка першага кваліфікацыйнага раўнда Лігі Еўропы. Сталічны МТЗ-РІПА трапіў у першы кошык жараб'ёўкі турніру. Яго супернікамі маглі стаць «Дынама» (Албанія), «Іртыш» (Казахстан), «Рунавік» (Ісландыя), «Грэвенмахер» (Люксембург), «Суцьеска» (Чарнагорыя). Мінскае «Дынама» трапіла ў пяты кошык, і яго патэнцыйнымі супернікамі былі македонская «Рэнова», азербайджанскі «Сімурк», валійскі «Нью-Сэйнтс» і пазаночнаірландскі «Лінфілд». У выніку падапечныя Славалюба Мусліна згуляюць з македонскім клубам «Рэнова», а МТЗ-РІПА паспаборнічае з «Суцьескай» з Чарнагорыі. Першыя матчы адбудуцца ў Мінску.

Вызначыўся і супернік барысаўскага БАТЭ ў другім кваліфікацыйным раўндзе Лігі чэмпіёнаў. Гэта клуб «Македонія», які выйграў чэмпіянат сваёй краіны з перавагай у шэсцьачкоў над найбліжэйшым супернікам. Першы матч адбудзецца ў сталіцы Македоніі горадзе Скоп'е.

ТОЛЬКІ ТАК...

Кватэрнае пытанне

Мы як маладая сям'я з 1997 года знаходзімся на кватэрным уліку ў райвыканкаме. Муж у складзе сям'і сваіх бацькоў — з 1993-га па месцы працы бацькі. Ці маем мы права на атрыманне бязвыплатнай субсідыі на будаўніцтва жылля па больш ранняй даце пастаноўкі на кватэрны ўлік?

Л.А., *г. Марлёў.*

Умовы і парадак выдзялення аднаразовых бязвыплатных субсідый на будаўніцтва (рэканструкцыю) або набыццё жылых памяшканняў вызначаны Палажэннем, зацверджаным пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 красавіка 2002 г. № 555. Такія субсідыі ў вызначаным парадку выдзяляюцца тым, хто мае ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі права на атрыманне дзяржаўнай падтрымкі на названыя мэты, грамадзянам Рэспублікі Беларусь, што знаходзяцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў, а таксама грамадзянам, якія маюць права на пазачарговае атрыманне жылых памяшканняў сацыяльнага карыстання.

Для грамадзян, якія знаходзяцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы жыхарства і па месцы працы, чарговасць атрымання субсідыі, а таксама яе памер вызначаюцца па больш ранняй даце пастаноўкі на ўлік. Грамадзяне рэалізуюць права на атрыманне субсідыі сумесна з членамі сваёй сям'і па пісьмовай згодзе ўсіх поўнагадовых яе членаў.

У гэтым выпадку адзін з сужэнцаў знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па месцы працы свайго бацькі як член сям'і суб'екта жыллёвых адносінаў. Субсідыя ў вызначаным парадку можа быць выдзелена бацьку з улікам членаў сям'і, якія знаходзяцца разам з ім на кватэрным уліку, пры будаўніцтве жылога памяшкання для паляпшэння жыллёвых умоў сям'і.

Па дзейным заканадаўстве грамадзяне маюць права самастойна знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў (як па месцы жыхарства, так і па месцы сваёй працы — пры наяўнасці адпаведных падстаў) з моманту набыцця поўнай дзеяздольнасці (з дня наступлення паўналецця, а ў выпадку эмансіпацыі або ўступлення ў шлюб да дасягнення поўнагадовага ўзросту — з даты прыняцця рашэння аб эмансіпацыі або ўступлення ў шлюб).

Поўнагадовы член сям'і грамадзяніна, які знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў па пастаянным месцы жыхарства, мае права быць прынятым на такі ўлік асобна (калі ў яго ёсць падставы знаходзіцца на ўліку асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў) па яго пісьмовай заяве з часу прыняцця яго на ўлік у складзе сям'і бацькоў незалежна ад яго ўзросту на дату пастаноўкі на ўлік у складзе сям'і бацькоў, але не раней за дату нараджэння.

Значыць, названай нормай заяўнікі могуць скарыстацца, калі бацька мужа знаходзіўся на кватэрным уліку не толькі па месцы працы з 1993 года, а адначасова і па месцы жыхарства (а такое права ён меў, калі былі падставы, прадугледжаныя Жыллёвым кодэксам). Толькі ў гэтым выпадку можа быць разгледжана пытанне аб налічэнні сям'і субсідыі для будаўніцтва кватэры па больш ранняй даце прыняцця на ўлік асобаў з патрэбай у паляпшэнні жыллёвых умоў (з часу пастаноўкі на ўлік па месцы жыхарства ў складзе сям'і бацькоў).

Віктар САВІЦКІ.

БЕЛАРУСЬ ЗА МАЙ РАЗЛІЧЫЛАСЯ ЗА ГАЗ ПА СЯРЭДНЕГАДАВОЙ ЦАНЕ

ААТ «Белтрансгаз» за май разлічылася за газ па сярэднегадавой цане і прадоўжыць далейшыя плацяжы ў такім жа рэжыме. Аб гэтым паведаміў карэспандэнту БЕЛТА генеральны дырэктар прадпрыемства Уладзімір Маёраў. Аплата за атрыманы газ праведзена ў поўным аб'ёме, як і ў папярэднія месяцы. «Мы аплачваем газ па сярэднегадавой цане ў адпаведнасці з дамоўленасцю кіраўнікоў дзяржаў і будзем прадаўжаць так плаціць», — сказаў гендырэктар.

Абзац

◢ Да 2015 года каля 30 % усёй сядзібнай забудовы ў Мінску плануецца знесці і пабудаваць на вызваленай плошчы шматкватэрныя дамы. Сёння прыватны сектар займае каля 20 % ад усёй тэрыторыі забудовы сталіцы. Гэта каля 15 тыс. прыватных дамоў, дзе пражывае каля 75 тыс. мінчан, або 4,7% насельніцтва горада.

◢ Сёлета ў Беларусі было здзейснена 217 ДТЗ, пасля якіх вадзіцелі зніклі. У іх загінула 49 чалавек і 193 — параненыя. Як падкрэсліваюць спецыялісты службы бяспекі руху, многія з загінулых маглі б выжыць, калі б ім своечасова была аказаная медыцынская дапамога. Як правіла, усе гэтыя злачынствы раскрываюцца, няхай іншы раз і на працягу некаторага часу.

◢ Цела другога хлопчыка, што патануў у Магілёве 23 лютага ў раёне аўтамабільнага моста праз Днепр, знойдзена каля вёскі Салтанаўка, прыкладна ў 12 км ад месца трагедыі. Загінулага хлопчыка знайшлі спартсмены падчас трэніроўкі па акадэмічнай грэблі.

◢ У Мазырскую райбальніцу з дыягназам паражэнне электратокам у нядзелю былі дастаўленыя чатыры 20-гадовыя жыхары райцэнтра. Высветлілася, што ў выхадны яны вудзілі рыбу на вадаёме каля Мазырскага НПЗ. Адзін з рыбакоў, закідваючы вуду, вудзільнам зачапіўся за высакавольтную лінію электраперадач. У выніку не толькі ён, але і тыя рыбакі, хто быў побач, былі ўдараныя электратокам. Два трапілі ў аддзяленне траўматалогіі, адзін — у рэанімацыю.

◢ Супрацоўнікі міліцыі затрымалі жыхара Валожынскага раёна, які ў сталоўцы, дзе ішла падрыхтоўка да вяселля, пасек сталы і параніў міліцыянера. Ён уварваўся ў памяшканне з сякерай і пачаў секчы сталы і камп'ютар. Супрацоўнік міліцыі, які прыбыў на месца здарэння, атрымаў датычны ўдар сякерай па галаве. Раней судзімы зламыснік затрыманы, высвятляюцца прычыны злачынства.

◢ Касір-кантралёр аднаго з мінскіх банкаў з трыма нажавымі раненнямі і крывападцёкамі на галаве была знойдзена ў доме яе бацькоў у Лагойскім раёне. Па падазрэнні ў забойстве затрыманы яе брат, непрацуючы, раней судзімы, і яго знаёмая. Узбуджана крымінальная справа, высвятляюцца прычыны трагедыі.

◢ У Грозным у выніку цяжкай траўмы, прычыненай быком, памёр мясцовы жыхар. Па сведчанні ўрачоў, 1,5-гадовы бычок вострымі рагамі прычыніў свайму 70-гадоваму гаспадару пранікальнае раненне ў вобласць сэрца. Ад атрыманай траўмы пацярпелы памёр.

◢ Санэпідстанцыя Крыма забараніла гатаваць шаурму і шашлык у непрыстасаваных месцах, а таксама гандляваць імі ў тых жа месцах. Пакаштаваць стравы можна толькі ў рэстаране ці кавярні, дзе рызыка заражэння кішэчнымі інфекцыямі мінімальная. Смажыць шашлыкі на вуголлях забаранілі пасля таго, як шматлікія адпачывальнікі паскардзіліся на дым і смурод ад падгарэлай стравы. Змагацца з несанкцыянаваным гандлем будуць уладальнікі пляжаў, міліцыя і мясцовыя ўлады. Забарона будзе дзейнічаць да канца пляжнага сезону.

Поўны абзац

◢ Жанчына з Расіі, поўнае імя якой не называецца, трапіла ў рэанімацыю пасля шостай па ліку аперацыі па ўзнаўленні цнатлівасці. Першую аперацыю ёй зрабілі 6 гадоў таму, перад вяселлем. Наталля выйшла замуж у 24 гады. Яе муж, які быў у яе не першым, надта перажываў з гэтай нагоды. Для яго жанчына і зрабіла сваю першую аперацыю. Праз год пара адзначала юбілей, і жонка зноў зрабіла падарунак мужу. Пасля гэтага аперацыя стала сямейнай традыцыяй. Калі жанчына звярнулася па дапамогу да хірургаў у шосты раз, яе папярэдзілі пра небяспеку для здароўя і нават жыцця, тым не менш, Наталля падпісала адмову ад любых магчымых прэтэнзій і зноў трапіла на аперацыйны стол. На жаль, асцярога была небеспадстаўнай. Аслабленая імунная сістэма пацыенткі не справілася з банальнай інфекцыяй, і жанчына апынулася ў рэанімацыі.

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

Здароўе на талерцы

КЛУБНІЦЫ І СУНІЦЫ — АД КАМЯНЁЎ У НЫРКАХ

Аднымі з самых любімых ягад у летнюю пару, як у дзяцей, так і ў дарослых, з'яўляюцца клубніцы. І гэта не выпадкова, бо яны не толькі вельмі смачныя, але і карысныя.

Па-першае, клубніцы павышаюць імунітэт. Па ўтрыманні вітаміну С яны саступаюць толькі чорным парэчкам. У 5 клубніцах сярэдняга памеру аскарбінавай кіслаты столькі ж, колькі і ў апельсіне. А вось кіслаты фоліевай у іх утрымліваецца значна больш, чым, напрыклад, у малінах і вінаградзе.

Па-другое, клубніцы аказваюць супрацьзапаленчае і антымікробнае дзеянне, нармалізуюць абмен рэчываў і з'яўляюцца выдатным прыродным мачагонным сродкам. Іх прымяняюць пры лячэнні захворванняў насаглоткі, яны дапамагаюць пры хворым страўніку, дыябеце, панкрэатыце, хваробах нырак і мочавыводных шляхоў.

Па-трэцяе, клубніцы — малакаларыйныя (36 ккал на 100 г). Таму, калі хочаце развітацца з парай-тройкай лішніх кілаграмаў, «сядайце» на клубнічную дыету.

Свежыя клубніцы добрыя ў любым выглядзе: з мюслі на сняданне, з вяршкамі або смятанай у фруктовых кактэйлях, у салатах з садавіны на дэсерт і проста самі па сабе.

КЛУБНІЦЫ Ў ШАКАЛАДЗЕ

— вельмі арыгінальная страва. А ўсяго і трэба зрабіць, што растапіць крыху малочнага або белага шакаладу і мачаць у яго клубніцы. Даць шакаладу застыць, паклаўшы на тэфлонавую паперу.

Не менш папулярныя летам і суніцы, якія як лекавы прадукт узгадваліся яшчэ ў літаратуры XIII стагоддзя. У гэтых ягадах выяўлены цукар, лімонная, яблычная, саліцылавая, хінная, аскарбінавая і фоліевая кіслоты, а таксама флаваноіды, карацін, вітаміны групы В, дубільныя і пекцінавыя рэчывы, эфірны алей, клятчатка, жалеза, фосфар, кальцый і іншыя мікраэлементы. Дзякуючы такому багатаму хімічнаму саставу, суніцы надзвычай карысныя для чалавечага арганізма: фоліевая кіслата падтрымлівае работу сардэчнай мышцы, таніны і флаваноіды дапамагаюць пры запаленнях страўнікава-кішачнага тракту, жалеза паляпшае састаў крыві, медзь садзейнічае актывізацыі выпрацоўкі калагену — рэчыва, якое надае скуры эластычнасць і пругкасць. Народная медыцына рэкамендуе варыць з суніц гарбаты, асабліва пры павышанай тэмпературы і кашлі, а настоі з ягад і сунічніку прымяняць у якасці мачагоннага сродку, пры лячэнні цынгі, падагры, пры камянях у нырках і печані.

СУНІЧНАЯ ГАРБАТА

Вазьміце: 100 г сухіх ягад, 100 г сухога сунічніку, 100 г сухіх пялёстак шыпшыны. Сыравіну перамяшайце і захоўвайце ў ёмістасці для чаю. Заварвайце за 5 хвілін перад падачай на стол.

УВАГА! Памятайце, што і клубніцы, і суніцы могуць выклікаць у некаторых людзей алергічную рэакцыю.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Анатоль БУЯЛЬСКІ:

«НЕДАХОПАЎ У «ЗОРАК» НЯМА»

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Жаночая зборная Беларусі па баскетболе скончыла выступленне на чэмпіянаце Еўропы, заняўшы чацвёртае месца. 20 чэрвеня ў заключным матчы за бронзу беларускі саступілі (56:63) іспанкам. За дзень да гэтага нашы спартсменкі прайгралі паўфінальны матч французжанкам, якія ў выніку і сталі чэмпіёнкамі Еўропы. Тым не менш, калі ўлічваць не зусім удалы старт нашай дружыны, а потым матчы з Літвой, Турцыяй і Славеніяй, якія балельшчыкі называлі не інакш як «валідольнымі», (іх нашы дзяўчаты здолелі выйграць), а затым пройгрыш толькі медалісткам турніру, то вынік можна назваць больш чым станоўчым. У нядзелю каманда вярнулася дадому, а ўчора лідары зборнай Наталля Трафімава (Н.Т.), Наталля Марчанка (Н.М.), Таццяна Троіна (Т.Т.) і Алена Леўчанка (А.Л.) на чале з галоўным трэнерам Анатолем Буяльскім (А.Б.) расказалі пра чэмпіянат Еўропы, камандны дух, скандалы ў прэсе, пра свае мары стаць мадэлямі і матулямі, якія пакуль не могуць спраўдзіцца. На сустрэчы прысутнічаў і кіраўнік федэрацыі баскетбола Віктар Камянкоў (В.К.), які расказаў пра ўзнагароджанне, якое атрымаюць дзяўчаты, а таксама пра развіццё віду спорту.

А.Б.: Мы выканалі задачу, якую ставіла перад намі федэрацыя і мы самі. Гэта, бадай, галоўны вынік . Хоць перад турнірам праблем было больш, чым калі-небудзь раней.

Н.Т.: У мяне дваякія пачуцці. Задача выкананая, але хацелася медалёў. А іх не атрымалі.

Н.М.: Прапусцілі свой шанц з французжанкамі, маглі б заваяваць медалі, але ёсць стымул працаваць далей.

А.Л.: Спадзяёмся, што на чэмпіянаце свету пакажам штосьці большае.

Т.Т. Галоўнае, што выканалі не заданне міністэрства, а тыя задачы, якія самі перад сабой ставілі.

В.К. Каб быць прызёрамі, трэба не прайграваць прызёрам — гэта ўсё, што я магу сказаць. Хоць вынікам я задаволены.

— Наталля (Марчанка), як самаадчуванне? Вам было складаней, чым астатнім...

Н.М.: Многія выходзілі на пляцоўку з праблемамі. Адчуваўся дыскамфорт у масцы, але затое я была ўпэўненая, што больш ніхто не «заедзе». Маску, дарэчы, вярнулі ўладальнікам — італьянкам, і, спадзяюся, больш яна не спатрэбіцца.

— Анатоль Сяргеевіч, у матчы за бронзавыя медалі быў адрэзак, дзе каманда саступала 0:18. Увогуле гульня наша нярэдка вызначалася нестабільнасцю. Як гэта пракаментуеце?

А.Б.: Тым і прыцягальны баскетбол, што гуляюць дзве каманды. Ты паказваеш не тое, што ўмееш, а гуляеш супраць таго, што падрыхтаваў супернік. Нават тэх

Радавыя Перамогі

«ДАПАМАЖЫЦЕ АДШУКАЦЬ МЕСЦЫ ПАХАВАННЯЎ МАІХ БРАТОЎ...»

Прывітанне, паважаная рэдакцыя! Звяртаюся да вас з вялікай просьбай: ці не маглі б вы паведаміць мне, дзе пахаваны мой брат Якаў Савіч Бародзіч? Ён спачатку быў у партызанах, потым пайшоў на фронт, ваяваў да канца вайны, а потым загінуў. Дзе яго магілка? Буду за вас маліць Бога. Быў у мяне яшчэ адзін брат — Адам. Ён таксама напачатку быў у партызанах, потым пайшоў на фронт, дайшоў да Берліна — быў там, дзе сядзеў Гітлер... Мы гадаваліся сіротамі, не давялося хадзіць у школу, пасвілі калгасных цялят, потым пайшлі працаваць на ферму...

Кацярына Савічна ГАПАНОВІЧ,
вёска Аляксандраўка Любанскага раёна.

Знайсці адказы на пытанні заяўніцы нам дапамог **галоўны спецыяліст аддзела ідэалагічнай працы Любанскага райвыканкама Андрэй ДРАБУДЗЬКА**, які апроч іншага займаецца пытаннямі ваенных пахаванняў.

Перамога ў Вялікай Айчыннай вайне каштавала нам вельмі дорага. Лёсы тысяч людзей так і засталіся нявысветленымі. Дагэтуль працягваюцца пошукі месцаў пахаванняў загінулых воінаў. З мэтай арганізацыі працы па ўвекавечанні памяці загінулых абаронцаў Айчыны і рэалізацыі на практыцы лозунга «Ніхто не забыты, нішто не забыта» Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі выдаў шэраг даручэнняў і ўказаў. Як распавёў Андрэй Віктаравіч, у адпаведнасці з Пералікам даручэнняў Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі №пр-698 ад 23 красавіка 2003 года па пытаннях арганізацыі ваенна-мемарыяльнай працы ў Расійскай Федэрацыі і Указам № 37 ад 22 студзеня 2006 года «Пытанні ўвекавечання памяці загінулых пры абароне Айчыны», Міністэрствам абароны Расійскай Федэрацыі створаны Абагульнены камп'ютарны банк звестак, што ўтрымлівае інфармацыю пра абаронцаў Айчыны, загінулых ці прапаўшых без вестак у гады Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ў пасляваенны перыяд (ОДБ Мемарыял). Галоўная мэта праекта — даць магчымасць мільёнам грамадзян устанавіць лёс ці знайсці інфармацыю пра сваіх загінулых ці прапаўшых без вестак родных і блізкіх, вызначыць месца іх пахавання. Тылам Узброеных Сілаў Расійскай Федэрацыі (Ваенна-мемарыяльным цэнтрам УС РФ) была праведзена ўнікальная па маштабах, тэхналогіі і тэрмінах выканання праца, у выніку якой створана інфармацыйна-даведачная сістэма глабальнага значэння, што не мае аналагаў у сусветнай практыцы. Звесткі для напаўнення Абагульненага банка звестак узяты з афіцыйных архіўных дакументаў, якія захоўваюцца ў Цэнтральным архіве Мінабароны РФ і ў Ваенна-мемарыяльным цэнтры УС РФ. Асноўны масіў дакументаў — гэта данясенні баявых часцей пра беззваротныя страты, іншыя архіўныя дакументы, што ўдакладняюць страты («пахаванкі», дакументы шпіталяў і медсанбатаў, трафейныя карткі савецкіх ваеннапалонных і г.д.), а таксама пашпарты пахаванняў савецкіх салдатаў і афіцэраў.

Можна знайсці інфармацыю пра званне загінулага, часць, у якой ён служыў, дату і прычыну смерці (забіты, памёр ад ранаў, прапаў без вестак) і месцы пахавання. У банку звестак выкладзены адсканіраваныя копіі ўсіх апрацаваных дакументаў-першакрыніц, дзе ўтрымліваецца інфармацыя пра персаналіі. Гэтыя дакументы дазваляюць з вялікай дакладнасцю ідэнтыфікаваць загінулых, паколькі ў іх часта ўтрымліваецца дадатковая інфармацыя, у прыватнасці, імёны і адрасы родных, якім адсылаліся пахавальныя. У рамках праекта адсканіравана і прадастаўлена ў інтэрнэт-доступ каля 10 мільёнаў аркушаў архіўных дакументаў і звыш 30 тысяч пашпартоў ваенных пахаванняў. Да гэтай базы і звярнуўся ў пошуках адказу на пытанне заяўніцы Андрэй Драбудзька.

*— Бародзіч Якаў Савіч, 1924 года нараджэння, ураджэнец вёскі Аляксандраўка... Дата выбыцця — дата смерці — 21 красавіка 1945 года. Чырвонаармеец быў забіты, месца пахавання, як вынікае з адсканіраваных дакументаў, «с.Франденберг, Восточ. г. Бернау 14 КМ» (або КЛ — дакладна не разглядзець — **Рэд.**), — прачытаў для нас інфармацыю суразмоўца. — Адам Савіч таксама быў чырвонаармейцам-стралком. Забіты ў баі 30 ліпеня 1944 года, месца пахавання — цывільныя могілкі «с. Ломавічы Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці»...*

«Нашы гаспадары «ЗВЯЗДУ» чытаюць ад «А» да «Я», —

сцвярджаюць мілыя жанчыны, з якімі я пазнаёмілася на Валожыншчыне. — І надвор'е па ёй звяраюць», — дадаюць услед.

Адданыя сябры нашай газеты, якія не паленаваліся і завіталі на паштамт у Дзень падпіскі, не засталіся без падарункаў.

1.

— Чытаюць і паважаюць у раёне вашу газету, — кажа **інструктар па падпісцы Валожынскага раённага вузла паштовай сувязі Ганна МАМОНЬКА**.

— Але такіх заўзятых аматараў «Звязды», як муж нашай Соф'і Рыгораўны, яшчэ пашукаць трэба, — падхопліваюць работнікі пошты.

Соф'я МУРАЎСКАЯ (фота 1) не першы год разносіць «Звязду» ў розныя вёскі раёна.

— З нецярпеннем чакаюць родную газету на роднай мове Станіслаў Мікалаевіч Жамоздзік і Унучак Ефрасіння Уладзіміраўна з Улазавічаў, Журкевіч Іван Сямёнавіч з Макараўкі, Сак Лідзія Пятроўна з Аўгустова... Часта сустракаюць мяне на парозе. Хвалююцца, калі прыношу газету крыху пазней, чым звычайна.

У сумцы гэтага паштальёна, нават пасля абходу, заўсёды застаецца адзін нумар «Звязды». Апошняя газета — для любага мужа. Уладзімір Фёдаравіч Мураўскі ўжо больш як 15 гадоў з'яўляецца нашым падпісчыкам. Чытае газету ад коркі да коркі. А пасля пераказвае жонцы.

— Вочы мае шкадуе, — усміхаецца Соф'я Рыгораўна. — Усё самае галоўнае і цікавае так раскажа, што і чытаць не патрэбна.

Уладзімір Фёдаравіч Мураўскі працуе механізатарам у СВК «Паркінг».

З працы вяртаецца позна.

— Прыедзе ў гадзін 10 і першым чынам шукае «Звязду». Бывае, і паесці забудзецца. Пакуль не дачытае да канца — спаць не ляжа. А не, дык адкладзе, а на наступны дзень абавязкова дачытае.

— У мяне няма часу чытаць газеты, — кажа кіроўца Уладзімір Загорскі. — Але я заўсёды ў курсе падзей. Як сустрэну Вову, мы з ім у адну школу хадзілі, дык з задавальненнем слухаю «звяздоўскія» навіны.

— Муж заўсёды сочыць за прагнозам надвор'я. Давярае толькі «Звяздзе». Кажа, «перадасць «Звязда» дождж — значыць быць дажджу. Раз выпісала я замест «Звязды» іншую газету, дык ён мяне ледзь з хаты не выгнаў *(смяецца)*. Што ж рабіць, давялося штодзень набываць газету ў шапіку. Цяпер стараюся мужа не злаваць, нават калі забудуся, што трэба афармліць падпіску, дык дзяўчаты на працы нагадаюць.

Пашчасціла мне пазнаёміцца і яшчэ з адной нашай падпісчыцай — **Нінай Іванаўнай САДОЎСКАЙ (фота 2).** Жанчына больш за 20 гадоў працуе ў раённай газеце «Працоўная слава» бухгалтарам.

— Не адна газета не падабаецца мне так, як «Звязда». Чытаю па магчымасці ўсё, але да «Звязды» ў мяне асаблівае стаўленне, больш трапяткое. Гэта газета ўжо даўно ўвайшла ў наш дом і стала членам нашай сям'і. Мне падабаецца калонка Абзац і Поўны абзац. Муж аддае перавагу публікацыям на палітычную і эканамічную тэмы. Любім беларускую мову. Наша дачка Света — філолог, працуе ў раённай газеце. Любім і паважаем родную газету на роднай мове. Мы з мужам нават спаборнічаем, хто першы выме «Звязду» з паштовай скрыні. Я люблю чытаць свежую газету, калі яна яшчэ пахне друкарскай фарбай, старонкі на вугалках крыху склеіліся...

— Яшчэ адну новую падпісчыцу «Звязды» я знайшла ў Валожынскім Цэнтры культуры.

— Раней выпісвала рускамоўныя выданні, — кажа **метадыст народнага аб'яднання майстроў «Скарбніца» Таццяна ЛАНЬКО (фота 3)**. — І вось некалькі разоў набыла «Звязду». Спадабалася, асабліва «Жырандоля», шмат тут публікацый на культурную тэматыку, інфармацыі пра беларускіх майстроў, беларускую мову. Усё выразаю і складваю ў спецыяльную папку. Акрамя таго, «Звязда» для мяне што падручнік. Часта даводзіцца праводзіць выставы па-беларуску. Чым часцей чытаю гэту газету, тым больш упэўнена размаўляю на роднай мове. Муж ухваліў мой выбар і таксама з задавальненнем далучыўся да ліку «звяздоўцаў».

Соф'я Мураўская, Ніна Садоўская і Таццяна Ланько атрымалі падарункі з рук карэспандэнта «Звязды». А вось спадарыні Зайкоўскай (мы з падпісчыцай, на жаль, размінуліся) вырашылі зрабіць сюрпрыз. Маленькія, але, спадзяюся, прыемныя падарункі ад «Звязды» ёй прынясе разам са свежым нумарам любімы паштальён!

Працягвайце нас чытаць, а мы, у сваю чаргу, будзем і надалей вас здзіўляць, і не толькі падарункамі, але і сваімі матэрыяламі.

Надзея ДРЫЛА,
фота аўтара.
Валожынскі раён.

2.

3.

БЯСПЛАТНЫЯ ТЭЛЕФОННЫЯ РАЗМОВЫ — КОЖНАМУ ЎДЗЕЛЬНІКУ ВАЙНЫ

З 1 па 5 ліпеня — падчас святкавання 65-гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — РУП «Белтэлекам» дазволіць удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны бясплатныя міжгароднія тэлефонныя размовы.

Яны будуць дазваляецца аўтаматычным спосабам або з дапамогай тэлефаніста з хатніх тэлефонаў пэўнай катэгорыі абанентаў. Да іх адносяцца: Героі Савецкага Саюза; поўныя кавалеры ордэна Славы; інваліды Вялікай Айчыннай вайны; удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны; асобы, што прымалі ўдзел у саставе спецыяльных фарміраванняў у разміраванні тэрыторый і аб'ектаў пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі ў 1943 — 1945 гадах; асобы, узнагароджаныя ордэнамі і (ці) медалямі СССР за самаадданую працу і бездакорную воінскую службу ў тыле ў гады ВАВ; асобы, якія працавалі на аб'ектах супрацьпаветранай абароны, мясцовай супрацьпаветранай абароны, на будаўніцтве абарончых збудаванняў, марскіх базаў, аэрадромаў і іншых ваенных аб'ектах у межах тылавых граніц дзейных франтоў, на прыфрантавых участках чыгуначных і аўтамабільных дарог; члены экіпажаў суднаў транспартнага флоту, інтэрніраваныя ў пачатку ВАВ у партах іншых дзяржаў; асобы, што працавалі на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях горада Ленінграда ў перыяд блакады з 8 верасня 1941 па 27 студзеня 1944 года і ўзнагароджаныя медалём «За абарону Ленінграда», і асобы, узнагароджаныя знакам «Жыхару блакаднага Ленінграда»; інваліды з дзяцінства з прычыны ранення, кантузіі, калецтва, што звязаны з баявымі дзеяннямі ў перыяд ВАВ або з наступствамі ваенных дзеянняў, калі яны дасягнулі: мужчыны — 60 гадоў, жанчыны — 55 гадоў.

Таксама ўсе ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны з 1 па 5 ліпеня змогуць бясплатна скарыстацца міжгароднякй сувяззю ў пунктах калектыўнага карыстання «Белтэлекам», аддзяленнях паштовай сувязі і з выдзеленых тэлефонаў шпіталяў.

Акцыя не распаўсюджваецца на тэлефонныя размовы з абанентамі мабільнай сувязі, на доступ у інтэрнэт і карыстанне платнымі даведачна-інфармацыйнымі службамі.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Заказаць бясплатныя міжгароднія тэлефонныя размовы з дапамогай тэлефаніста ва ўсіх гарадах і абласцях Беларусі можна будзе па нумарах:

для абанентаў Брэста і Брэсцкай вобласці — 8-18;
для абанентаў Віцебска і Віцебскай вобласці — 8-18;
для абанентаў Гомеля і Гомельскай вобласці — 8-13;
для абанентаў Гродна і Гродзенскай вобласці — 8-13;
для абанентаў Мінска і Мінскай вобласці — 8-13, 8-18;
для абанентаў Магілёва і Магілёўскай вобласці — 8-18.

Змяненні ў раскладзе

24 і 25 чэрвеня здымаюцца з руху электрацягнікі Мінск, Інстытут культуры — Стоўбцы адпраўленнем у 14.39 і Стоўбцы — Мінск адпраўленнем у 11.46.

Таксама **24 чэрвеня** не будуць курсіраваць электрычкі Мінск, Інстытут культуры — Асіповічы адпраўленнем у 11.50 і Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 14.53. **26 чэрвеня** ў сувязі з правядзеннем пуцявых работ здымаюцца з руху электрацягнікі Мінск, Інстытут культуры — Асіповічы адпраўленнем у 10.31 і Асіповічы — Мінск-Пасажырскі адпраўленнем у 14.03.

Адначасова **25 і 26 чэрвеня** электрацягнік Мінск, Інстытут культуры — Орша адпраўленнем у 10.42 прызначаецца ў шляхі зносінаў Мінск, Інстытут культуры — Крупкі, а электрычка Орша — Мінск-Усходні адпраўленнем у 11.47 прызначаецца ў шляхі зносінаў Крупкі — Мінск-Усходні адпраўленнем са станцыі Крупкі ў 13.28, прыбыццём на станцыю Мінск-Усходні ў 15.56.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Зварот у карпункт «Звязды»

ГАМЯЛЬЧАНІН АБ'ЯВІЎ «ВАЙНУ» КАМУНАЛЬНІКАМ, І ШТО З ГЭТАГА АТРЫМАЛАСЯ

Уладзімір Бутроменка пражывае ў адным са шматпавярховікаў Гомеля са студзеня 2003 года і з'яўляецца ўласнікам кватэры ў парадку атрымання спадчыны па завяшчанні маці, якая памерла. У 1998 годзе яна заключыла дагавор на ўдзел уласніка кватэры ў доме дзяржаўнага жыллёвага фонду па расходах на ўтрыманне, эксплуатацыю і яго рамонт. Сам Уладзімір Іванавіч такога дагавора не заключаў з камунальным жыллёвым рамонтна-эксплуатацыйным унітарным прадпрыемствам «Савецкае» (далей — «КЖРЭУП»).

Звярнуцца ў карпункт нашай газеты яго прымусілі абставіны яшчэ задоўга да Новага года. Ён палічыў: камунальнікі не аказваюць у пэўным аб'ёме тыя паслугі, якія яны павінны аказваць згодна з дагаворам. Звароты да камунальнікаў жаданага выніку не далі, і тады ён не стаў плаціць па тых «жыроўках», пасля чаго яго «пацягнулі» ў суд. У адной з мясцовых газет з'явіўся крытычны матэрыял аб ім як аб злосным неплацельшчыку, а па месцы жыхарства былі вывешаны спісы даўжнікоў, у якіх фігуравала і яго прозвішча.

Вось тады Уладзімір Бутроменка і вырашыў даць «адлуп» камунальнікам, звярнуўшыся ў судовыя інстанцыі. Я, каб увайсці ў курс справы, тройчы прысутнічаў на пасяджэннях суда Савецкага раёна Гомеля, якія адбываліся сёлета.

Той самы «адлуп»...

А гісторыя гэта пачалася яшчэ гады два таму, калі ў іскавай заяве, якую Уладзімір Іванавіч падаў у вышэйназваны суд, напісаў, што КЖРЭУП незаконна бярэ грошы з яго і іншых людзей. Так, тэмпература гарачай вады, якая падаецца ў кватэры, не адпавядае норме, не мяняюцца электралямпачкі на лесвічных пляцоўках, неналежным чынам працуе ацяпляльная сістэма, доўгі час не робіцца касметычны рамонт пад'езда — дома і даху, дрэнна адрамантаваны ганак. На яго думку, неабгрунтавана «дзяруць» грошы за вываз смецця, лішнія яны бяруцца за ацяпленне, бо награвальныя прыборы знаходзяцца ў сцяне дома і напалову грэюць вуліцу. Вось таму ён і адмаўляўся плаціць за камунальныя паслугі. На падставе падлікаў ісцец прасіў суд спагнаць з КЖРЭУП на сваю карысць 786 тысяч рублёў, на чым не спыніўся і ў дадатковым іскавым патрабаванні прасіў выключыць з жыллёва-камунальных плацяжоў налічэнне на капітальны рамонт, забяспечыць бясплатнымі паслугамі электрыкаў і сантэхнікаў, а калі не будуць выкананы работы па ацяпленні, то спагнаць з адказчыка за перарасход вады 100 тысяч рублёў. За тое, што з яго за капітальны рамонт бралі грошы незаконна, КЖРЭУП павінна вярнуць яму заплачаныя 1 049 412 рублёў. І калі ў першай іскавай заяве Уладзімір Іванавіч патрабаваў з КЖРЭУП выплаціць яму за неналежнае выкананне камунальнікамі аказаных паслуг і публікацыю ў газеце інфармацыі, якая ганьбіла яго гонар і чалавечую годнасць, 50 мільёнаў рублёў, дык у дадатковай гэту суму павялічыў удвая.

Суд Савецкага раёна Гомеля, разгледзеўшы матэрыялы справы, прыйшоў да высновы, што заяўнік рацыі не мае і яго іскавую заяву не задаволіў. Таму касацыйная скарга была накіравана ў абласны суд. Вынік — той жа самы. Было гэта ў кастрычніку 2007 года, з чым Уладзімір Бутроменка не пагадзіўся.

Гарачыя баталіі

Таму ў яго заставалася адзіная надзея — на Вярхоўны Суд. У галоўнай судовай інстанцыі краіны канстатавалі: у справе не да канца высветлены ўсе абставіны і абавязалі суд першай інстанцыі перагледзець яе ў складзе новага суддзі.

Мне давялося быць сведкам гарачых баталій, якія разгарнуліся паміж істцом (дарэчы, адваката ён не наймаў) і прадстаўнікамі адказчыка. У час новага разгляду справы Уладзімір Іванавіч, удакладніўшы свае іскавыя патрабаванні, і на гэты раз дапоўніў іх: уцяпліць фасад дома, аднавіць рэцыркуляцыю вады, абавязаць на бязвыплатнай аснове адзін раз у год рабіць абслугоўванне сантэхнічнага абсталявання і г.д.

Адным з галоўных аргументаў адказчыка было тое, што ісцец не заключаў дагавора з КЖРЭУП на аказанне жыллёва-камунальных паслуг і сістэматычна не плаціў за іх, але той тут жа на гэту «атаку» адказваў сваёй: вы не ведаеце, не азнаёміліся, напэўна, з Законам аб абароне правоў спажыўцоў...

Тыя баталіі праходзілі па кожным пункце іскавых патрабаванняў, і апісваць іх падрабязна мы не будзем. Але адзначым, што ў дапамогу істцу выступіла некалькі сведак і высветлілася, што рамонт у пад'ездзе дома не праводзіўся з... 1984 года, што ў нездавальняючым стане знаходзяцца і ганак, і падлога, і прыдамавая тэрыторыя і г.д. І гэта ў той час, калі ў 2006 годзе ў краіне быў уведзены тэхнічны кодэкс па эксплуатацыі жылых і грамадскіх збудаванняў і там вызначана мінімальная працягласць эфектыўнай эксплуатацыі будаўнічых канструкцый і інжынерных сістэм. Так, тэрміны службы падлог з лінолеума — 10, пабелка і афарбоўка сцен, столі і сталярных вырабаў — 8, радыятараў, трубаправодаў і лесвічнай агароджы — 4, капітальны рамонт ганкаў — адзін раз — у 20 гадоў. Нялішне тут сказаць, што дому, у якім жыве Уладзімір Бутроменка, 26 гадоў. Ці рабіліся там рамонты, ці ўсё даводзілася да ладу — у камунальнікаў адказ адзін: а ці ведаеце вы, што ў нас цяжкае фінансавае становішча?

Адным словам, суд вынес наступнае рашэнне: абавязаць КЖРЭУП зрабіць капітальны рамонт пад'езда, замяніўшы лінолеум, плінтусы, выканаўшы пабелку, тынкоўку, афарбоўку і капітальна адрамантаваць ганак. КЖРЭУП таксама павінна выплаціць ісцу ў якасці нанесенай яму маральнай шкоды 250 тысяч рублёў. Што датычыцца ўцяплення фасада дома, то гэта работа не ўваходзіць у пералік асноўных жыллёва-камунальных паслуг, тым больш ўцеплены тарцы шматпавярховіка і яго жыхары не скардзіліся на холад у кватэрах зімой. Пытанне вынасу ацяпляльных батарэй са сцен дома — гэта прэтэнзіі не да КЖРЭУП «Савецкае», бо не гэтае прадпрыемства з'яўляецца праекціроўшчыкам той сістэмы. А што наконт аднаўлення рэцыркуляцыі вады, дык тут трэба сказаць, што выканаць яе намечана сёлета да лістапада, пачаўшы работы ў ліпені.

У астатнім заяўніку адмовлена, бо суд палічыў, што тыя патрабаванні неабгрунтаваныя. Як адрэагавалі на рашэнне суда ісцец і адказчык? Ад іх паляцелі касацыйныя скаргі ў абласны суд, якія ўжо разгледжаны. Вышэйшая інстанцыя, разгледзеўшы матэрыялы справы, не задаволіла ні адзін, ні другі бок, пакінуўшы тое рашэнне без змяненняў, акрамя аднаго. А менавіта: КЖРЭУП павінна аплаціць пошліну ў даход дзяржавы ў памеры не 105 тысяч рублёў, а 210 тысяч. Канец «вайне»? Не ведаем.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ДАЦЬ ШАНЦ

У артыкуле «Адно дыханне ва ўсіх» («Звязда», 18.06.2009 г.) размова ішла пра стаўленне чалавека да жывёлы, прапаноўвалася чытачам прытуліць бяздомнае шчанё.

І вось што з гэтага атрымалася

Працяг тэмы

«Будзем жыць!»

Калі казаць шчыра, то я не чакаў, што столькі ў нас спагадлівых людзей. А магчыма, у «Звязды» чытач іншым не можа быць?

Напачатку я званкі фіксаваў, а затым найперш пытаўся, адкуль тэлефануюць. Бо як завезці шчанё пад Бабруйск, Крычаў ці Кіраўск? Адзначу, што за выключэннем аднаго званка з-пад Смаргоні (сабачку праціла Ядзвіга Лінкевіч) самыя жаласлівыя чытачы аказаліся на Магілёўшчыне і Міншчыне. З Брэстчыны, якая побач, ніхто не патэлефанаваў.

Многія чытачы вельмі прыязна гаварылі пра нашу газету. Вось Ганна Казлова з в. Лаўніца Барысаўскага раёна выпісвае «Звязду» не адно дзесяцігоддзе. «Ужо і не памятаю колькі часу», — сказала яна. Ганне Мікалаеўне падабаюцца многія артыкулы, але найбольш яе кранае пазіцыя газеты адносна Прыроды, жывых істот. А шчанё на здымку вельмі кранула жанчыну і яна нават прапанавала апляцішь дарогу. Дарэчы, падобнае жаданне выказвалі і іншыя чытачы.

Не такі ўжо наш чалавек і раўнадушны: да лёсу выкінутага сабачкі многія не былі абыякавымі.

Хацеў завезці шчанё ў в. Шашкі Стаўбцоўскага раёна, бо Кацярына Вяршына з усіх, хто патэлефанаваў, была найбліжэй да Баранавічаў — за 80 км. Я нават на ўсякі выпадак звязаўся з мясцовым сельсаветам і пачуў, што жанчына са шматдзетнай сям'і, водгукі былі самыя добрыя. Але на наступны дзень пазваніў Аляксандр Каваленка з гэтага ж раёна і сказаў: «Вы хочаце аддаць сабачку ў добрыя рукі — то прывозьце!» Вось і было вырашана паехаць у в. Аталезь, а гэта па дарозе ў в. Шашкі. Калі не ў першай вёсцы, то ў другой шчанё паспадароў знойдзе. Толькі пра гэта крыху ніжэй. Спачатку пра праблему «Біць не біць?», пазначаную ў тым жа нумары, дзе размова ішла пра кінутага сабачку.

Лічу, што праблема гэтая не асобнага чалавека, а грамадства. Менавіта яно вызначае рамкі, у якіх дзейнічае чалавек. І калі дазволена біць, то ён і забівае. Хто можа папракнуць за забітага бяздомнага сабаку (хто за яго заступіцца?), калі камунальныя службы знішчаюць тых сабак тысячамі?

Пра сталасць грамадства сведчыць яго стаўленне да флоры і фаўны, навакольнага асяроддзя. Чалавек не можа быць вышэй за Прыроду, бо ён часцінка яе.

Забіваць — гэта самы лёгкі шлях пазбавіцца на нейкі перыяд ад праблемы, але ён тупіковы. Напомню, што праблему тую стварае не жывёла, а чалавек.

Бяруць шчанят, каб з імі пагулялі дзеці, а як толькі сабачка зробіць мокрую пляму на падлозе — яго за шкірку і на вуліцу.

І чамусьці забываюць, што шчанё не забаўка, а патрабуе сур'ёзнага догляду і выхавання. Не хочаш, каб твая кошка мела кацянят, то зрабі ёй стэрылізацыю і тады не давядзецца выкідваць іх на сметнік. Але ж гэта лішнія турботы, а ёсць вельмі простае выйсце — утапіць, выкінуць, забіць.

З такіх прыватных захадаў і ствараецца агульная карціна. Бяздомных сабак (многія з якіх мелі гаспадароў) неабходна знішчаць, бо яны не ўпісваюцца ў гарадскі пейзаж. Ваўкоў трэба адстрэльваць, бо ад іх адна шкода, чаплі ядуць рыбу і іх забіваюць тысячамі, дзікі з аленямі выходзяць на пасевы...

А зараз вернемся да тых ваўчанят, якіх удалося ўхапіць з логава. Не трэба, вядома, у паляўнічым бачыць дабрадзея, які выратаваў цэлую ферму, адстаяў статак ад ваўкоў, якія на харчы малым перацягнулі б яго. Ды не думаюць паляўнічыя пра таго бычка ці рыбу, а іх турбуе адно: колькі заплацяць за забітае ваўчаня ці чаплю.

А віна ваўчанят толькі ў тым, што іх бацькі — ваўкі. І калі прытрымлівацца такой логікі, то ў дзікай прыродзе трэба вынішчаць многіх драпежнікаў, у тым ліку і крылатых. Хіба ж шулякі не хапаюць куранят і гусянят у вёсках пры лесе?

Але што было рабіць з тымі ваўчанятамі, якіх дасталі з барсуковай нары? Лічу, што ім неабходна было даць шанц на жыццё. Сёння модна паказваць страусаў. Бадай што ў кожным раёне ёсць фермер, які трымае іх. Толькі страусы ўжо не экзотыка. А хто бачыў жывых ваўкоў? Я не сумняваюся, што каб наконт тых ваўчанят з'явілася абвестка, то знайшліся б багатыя людзі (нават за мяжой краіны), якія захацелі б набыць ваўчанят для асабістых вальераў — заплацілі б добрыя грошы. Вось у малых і быў бы шанц на жыццё.

Вунь у Скандынаўскіх краінах ці Канадзе з ваўкамі ды чаплямі нашых праблемаў няма — усім кармоў хапае. У Канадзе паводзіны ваўкоў вывучаюць, ствараюць воўчыя зграі ды выпускаюць на волю. А часам гадуюць для дакументальных і мастацкіх фільмаў. У ЗША агромністыя тэрыторыі адпушчаны пад нацыянальныя паркі і мядзведзі выходзяць на дарогу і просяць у турыстаў пачастунку. А ў Германіі мяне найбольш уразіла тое, што на азімых пасвіліся алені. Статак з васьмі галоў спакойна скуб маладую рунь. Ці магчыма ў нас такая ідылія?...

Неяк ехаў са старшынёй аднаго сельгаскааператыва — аб'язджалі палеткі. На ўскрайку вёскі невялікая чародка гусей хадзіла па азімай пшаніцы. Старшыня збочыў і пачаў на «УАЗіку» ганяцца за гусямі. Не ведаю, колькі тых азімых з'елі гусі, але машына нанесла пасевам шкоду большую.

Ваўкі! Колькі ласёў ды дзікоў знішчаюць у нас браканьеры (і часта тыя, хто іх павінен ахоўваць) за год, то ўсе ваўкі не з'ядуць столькі за ўсё жыццё.

Аднойчы давялося пабываць у фермера, які жыве пры лесе. Вітальня, кухня і суседні з імі пакой усцеленыя шкурамі дзікоў. Налічыў трынаццаць (гэта што ўдалося ўбачыць). «Я не страляю, стрэльба ў мяне толькі каб лісіц напужаць, а гэтыя шкуры я купіў у паляўнічых», — апярэдзіў маё пытанне фермер. Трэба быць дужа наіўным, каб паверыць у гэта. Так што ў параўнанні з чалавекам воўк не такі ўжо і драпежнік.

Але хоціць пра сумнае, бо за лепшае будзе сустрэцца з гаспадыняй, у рукі якой трапіў наш падкідыш. Жанна Каваленка чакала нас і, як толькі мы пад'ехалі, падышла да машыны і ўзяла малое на рукі. І стала разумела, што ў яго ўжо ёсць прытулак. Дом дагледжаны, наўкол кветкі — усё ў парадку. Жанна Іванаўна працуе бухгалтарам у сельсавеце, а яе муж — начальнік змены на цагельным заводзе. Дарэчы, прадпрыемства не мае збояў і зарплату людзі атрымліваюць рэгулярна. На фоне крызісу — гэта ўжо плюс.

— Я выпісвала раней іншую газету, але ў сельсавеце пазнаёмілася са «Звяздою» і скажу, што ў ёй многа цікавага і яна шматгранная. Вось праз «Звязду» і вартаўніка сабе набылі, — усміхнулася гаспадыня.

Пакуль ехалі, шчанё намачыла нам сядзенне, а на развітанне яшчэ і набрахала на нас. Вось такая падзяка.

Але ж самае важнае ў гэтай гісторыі — тое, што знайшліся добразычлівыя людзі. Адгукнуліся і дзякуй ім за гэта.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.
Фота аўтара.

Фотаздымкі АЛКАГОЛІКАЎ вывешваюць побач з БАНДЫТАМІ

Так у Пінскім раёне змагаюцца з «нядбайнікамі», дзеці якіх выхоўваюцца ў дзіцячых дамах

Начальнік аддзела аховы правапарадку Пінскага РАУС Міхаіл ЛЕМЯШЭЎСКІ паказвае тыя самыя абвесткі з надпісамі «Не прадаваць!» і «Мы ўсе плацім за іх!»

Тыдзень таму чорна-белыя аркушы з фотаздымкамі, прозвішчамі і адрасамі алкаголікаў сталі вывешваць ва ўсіх вёсках Пінскага раёна. Ганебныя весткі лепяць у крамах, сельсаветах і на аўтобусных прыпынках. Побач з алкаголікамі вісяць фотаздымкі і фотаробаты крымінальнікаў, што знаходзяцца ў вышуку.

Не паверыўшы спачатку ў гэту інфармацыю, мы без папярэджання прыехалі ў Пінскае раённае ўпраўленне ўнутраных спраў. Была нядзеля, але **начальнік аддзела аховы правапарадку Міхаіл ЛЕМЯШЭЎСКІ** быў на працы і ў літаральным сэнсе змагаўся з п'янствам. На працоўным стале міліцыянера — канфіскаваная бутэлька самагону і стос тых самых абвестак з партрэтамі алкаголікаў. Высветлілася, што вывешваць абвесткі пастанавіла пастаянная камісія Пінскага раённага Савета дэпутатаў.

Глядзіце, на абвестках надпісы «Не прадаваць», — паказвае Міхаіл Лемяшэўскі. — Наша мэта — не толькі забараніць прадаўцам адпускаць гарэлку алкаголікам, але і напужаць іншых грамадзян, каб тыя баяліся купляць для іх алкаголь. Бо змешчаныя ў абвестках асобы адмовіліся ад сваіх дзяцей і злоўжываюць спіртным».

На ганебных паперах надрукаваны не толькі імёны нядбайных бацькоў, але і іх месцы жыхарства. А фотаздымкі выглядаюць як партрэты на надмагільных помніках.

— Ёсць партыя і такіх самых каляровых абвестак, — працягвае Міхаіл Лемяшэўскі. — Наша мэта — у кожнага грамадзяніна выпрацаваць пачуццё нецярплівасці да гэтых асобаў».

І на гэтым змаганне з «нядбайнікамі» ў РАУС не абмяжоўваецца. Участковыя кожную раніцу збіраюць алкаголікаў па вёсках і ў прымусовым парадку развозяць іх па прадпрыемствах. Каб тыя адпрацоўвалі дзяржаве за ўтрыманне іх дзяцей у дзіцячых дамах і сацыяльных прытулках.

— А то бадзяюцца як шалтай-балтаі па вёсцы і гарэлку п'юць, а павінны працаваць, калі ўжо дзяржава ўтрыманне іх дзяцей аплачвае, — лічыць участковы Мікалай Чачун, які таксама працаваў у нядзелю, закапаўшыся ў службовых дакументах. — У нас дзевяць службовых аўтамабіляў, на якіх мы рэгулярна развозім «нядбайнікаў» па працах. Мне лягчэй, бо амаль усе, за каго я адказваю, працуюць на адной ферме. Калі не хапае службовых аўтамабіляў, возім гэтых асобаў на сваіх асабістых машынах. А часам прадпрыемствы выдзяляюць аўтобусы для збору «нядбайнікаў»-бацькоў.

Пытаемся ва ўчасткавага, ці неравыхавалі каго-небудзь усе гэтыя наватарскія метады.

— У мяне амаль усе плацяць дзяржаве грошы за ўтрыманне іх дзяцей. Але такога, каб нехта неравыхаваўся і яму вярнулі дзіця, у ма-

На ганебных паперах надрукаваны не толькі імёны нядбайных бацькоў, але і іх месцы жыхарства. А фотаздымкі выглядаюць як партрэты на надмагільных помніках.

ёй практыцы за два гады не было.

Загародскі сельвыканкам:

«КРЫЧАЛА, ЗРЫВАЛА АБВЕСТКІ, ПАГРАЖАЛА...»

У вёсцы Камень Пінскага раёна ганебныя паперы пачалі вешаць таксама тыдзень таму.

— Але абвесткі ўвесь час нехта зрывае, напэўна нехта падасланы гэта робіць, — разважае прадавачка мясцовай крамы № 11. — На паперах гэтых дзве прыезджыя жанчыны Ала і Люда. Адна працуе на ферме, другая — на пякарні. Калі павесілі паперы, то Ала злегла на бальнічны. Яна нібыта нармальная, пяць гадоў таму прыехала, з ёй жыве двое дзяцей. А Люда, бывае, нап'ецца і на дарозе валяецца, хоць сужыцель яе закадзіраваны.

Супрацоўніцы мясцовага Загародскага сельвыканкама пажаліліся «Звяздзе», што Ала ўжо некалькі разоў прыходзіла да мясцовай улады і патрабавала паздымаць ганебныя абвесткі.

«Крычала, зрывала паперы, пагражала. Хоць у самой сем дзяцей у дзіцячым доме. Што гэта за маці такая! А мы зрываць паперы не можам і не будзем, гэта акцыя».

Яўген ВАЛОШЫН.

Іншая думка

Завуч школы Алена ГАЎРЫЛЮК:

«ЭКСПЕРЫМЕНТ МОЖА ПАШКОДЗІ

Наш культурны асяродак
Жыроандоля
Выпуск № 14 (60)

МІР, ЗАЛЕВА: КАМУ — КРЫС НОРМАН, КАМУ — ШАШЛЫЧОК З КВАСАМ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Рэклама была прыгожай. Паслухаць оперу пад сценамі 500-гадовага замка, патанчыць там жа пад «Воплі Відаплясава» ці пабачыць на свае вочы легенду 80-х Крыса Нормана — добрая перспектыва на выхадныя. На ўсякі выпадак я ўзяў з сабой раскладны турыстычны зэдлік, фотаапарат і падрыхтаваўся атрымліваць асалоду... Асалода не прымусіла сябе чакаць.

Прадчуванне яе апанавала мяне яшчэ на трасе Мінск—Мір, калі спачатку пачало накропваць, а затым занялася ўпэўненая залева. За кіламетр да белай таблічкі «Мір» я ўпёрся ў хвост вялікай чаргі. Пасля 20-хвіліннага прасоўвання ў бок нашай архітэктурнай каштоўнасці стала вядома, што даішнікі пасярод дарогі высвятлялі ў кожнага асабіста, ці не на канцэрт ён едзе. Мір быў перакрыты цалкам такім чынам, што запаркавацьца можна было толькі ў спецыяльна адведзеным месцы. Да яго вяла пакручастая дарога, якая ўрэшце сканчалася... чыстым полем за два кіламетры ад асфальту. Дождж мацнеў, а людзі, месячы бруд напаліраванымі дома туфлямі, дзяліліся ўражаннямі...

Дзень першы

З-за праблемаў з праездам і паркоўкай я быў на месцы, калі канцэрт «Новыя галасы Беларусі» пераваліў за сярэдзіну. Аднак першае, што я пачуў на «Музычных вечарах у Мірскім замку», была рэпліка мясцовага меламана:

— Вася, даставай бутэльку, што ты тармозіш?!

Аматары прыўкраснага прафесійна «ўгаварылі» недапітую пляшку, пасля чаго замітусіліся:

— Пайшлі хутчэй, пакуль у галаву не дало!..

Прычыны для хвалявання ў іх былі. Ад 20-й гадзіны (а канцэрты пачыналіся а 22-й) у Міры немагчыма было набыць алкаголь. Склалася, аднак, уражанне, што ўсе, што хацеў, затарыліся да «гадзіны ікс». Яўна п'яных людзей на канцэрт не прапускалі. Астатніх прапускалі арыгінальным чынам.

— Падыміце штаніну! — загадаў мне баец спецназу на ўваходзе.

— Правую ці левую?

— Спачатку правую, потым левую.

Агледзеўшы мае шкарпэткі (там, паводле іх сцэнарыя, я павінен быў хаваць бутэльку), прыняліся за сумку. Я абачліва пакінуў усё лішняе ў машыне, прыхапіўшы толькі фотаапарат і штатыў.

— Уключыце фотаапарат! — працягвалі свае дзеянні міліцыянеры. Упэўніўшыся, што гэта не бомба, мяне прапусцілі. Агулам такіх кардонаў было тры, і на кожным падобнае паўтарылася.

Тэлеканал АНТ, дзякуй ім, выдаў карэспандэнту «Звязды» чароўны пропуск, які даваў магчымасць трапіць на ўсе канцэрты і нават за кулісы. Аднак я вырашыў карыстацца ім ашчадна. Каб праверыць, што зможа пабачыць і пачуць звычайны глядач, які прыехаў на канцэрт, скажам, з Мінска ці Віцебска.

Высветлілася, што практычна нічога. Арганізацыя канцэрта выглядала так: перад самім замкам усталявалі сцэну і глядацкую залу на 880 месцаў. На гэтыя месцы раздаваліся запрашальныя білеты на прадпрыемствах, ва ўстановах і г.д. Набыць іх было немагчыма, яны былі бясплатныя... Такім чынам, ніводзін госць адназначна не мог з ходу трапіць на запаветныя крэслы.

Паводле ацэнкі міліцыянераў, на канцэрты збіралася ад 15 да 20 тысяч гледачоў. А цяпер уявіце: 880 з іх сядзіць перад сцэнай, а астатнія 15 тысяч стаяць (а дождж усё азартней размывае зямлю пад нагамі) за 200 метраў убаку, глядзяць канцэрт на сярэдняга памеру экране...

Вось хто спрацаваў добра — дык гэта гандаль. Па-за кардонамі міліцыі была выстаўлена мо сотня розных шапікаў з ежаю і пітвом. Каб накарміць народ, пад замкавыя сцены былі сцягнутыя сілы Карэліцкага, Стаўбцоўскага, Навагрудскага, Дзятлаўскага гандлю... Тут табе і шашлычок, і блінчыкі, і чабурэкі з беляшамі, і пірожныя з марожаным, і квас...

— Бярыце паўтара літра! — заклікае мяне прадавачка квасу.

— Дык туды з напоямі не пускаюць, а выпіўшы — лопну!.. — адмекваюся я.

— А што табе: стаў пад плот — і добра!.. — не здаецца спадарыня.

Народ, адчаяўшыся зблізку пабачыць канцэрт, мірна жуе шашлычок, хрумсціць папкорнам і краем вуха слухае «Новыя галасы Беларусі». Слухае, што праўда, у поўнай цемры. Бо асвятлялася выключна пляцоўка, якую ахоплівалі выключна камеры...

Дажаваўшы шашлычок, я пацягнуўся слухаць «Воплі Відаплясава».

— Прывітанне, Беларусь! Прывітанне, Мірскі замак!.. З вам сёння ўкраінскі гурт «Воплі Відаплясава»! — звярнуўся да гледачоў лідар гурта Алег Скрыпка.

Гледачоў, дарэчы, паболела. Бо на «Воплі» не раздавалі запрашальнікі, а, прыбраўшы крэслы, пераўтварылі залу ў танцпляцоўку...

Канцэрт цягнуўся амаль да другой гадзіны ночы. Дождж так і не скончыўся, то суцішваючыся, то набіраючы моц. У выніку дарога да «паркоўкі» пераўтварылася ў брудную кашу. Самастойна выехалі толькі джыпы. Мой «Фордзік» адчайна буксаваў, але нарэшце выкараскаўся, аблеплены граззю па самы дах. Тыя, хто выехаць не змог, знайшлі выйсце — вылавілі недзе мясцовага трактарыста, які па прымальным кошце на вяроўцы па адным выцягваў аўто на асфальт...

Дзень другі

Як чалавек з досведам, я пачаў шукаць, дзе запаркавацца, адразу пасля перасячэння мяжы гарадскога пасёлка. Прыткнуўшыся пад плотам, па асфальце дайшоў да замка.

Сёння была опера і Агурбаш. Я прыехаў паслухаць першае.

— Ааааааааааа! — брала спявачка на сцэне высокую шчымлівую ноту. І тут проста над вухам:

— Тысяча шасцісоты! Тры чалавекі выйшлі, запускайце траіх!.. І канталюйце, каб у зале не курылі!..

Рацыі выдалі, здаецца, усім. І я не супраць — парадак трэба падтрымліваць. Але няўжо цяжка было раздаць да рацыяў навушнікі, каб загады чулі толькі міліцыянеры, а не ўсе навокал?..

Прыхільнікаў оперы, дарэчы, выявілася значна менш, чым новых галасоў Беларусі і «Вопляў Відаплясава». А яшчэ мне падалося, што опера была пад фанаграму. Бо калонкі надрываліся, а артысты на сцэне — не. Паколькі канцэрт называўся «Опера-мадэрн», на сцэне былі скокі, танцы і акрабатычныя эцюды. Пасля ўвогуле высветлілася, што опера — гэта таксама Георгій Калдун і ВІА «Беларусы»...

Дзень трэці

У заключны дзень я прыехаў раней на гадзіну — каб добра запаркавацца і паспець да пачатку канцэрта. У прадуктовай краме на плошчы распытаў міран праз іх уражанні.

— Ведаеце — і добра, і дрэнна, — распавяла мне жанчына ў мясцовым гатэлі. — Мір на гэтыя дні паралізаваны: дадому спакойна не прайсці, машынай не праехаць, дзяцей на вуліцу страшна выпускаць — столькі п'яных... А добра тое, што зарабіць людзям удаецца. Гатэль жа разлічаны на 25 чалавек. Вось і прапануюць міране гасцям за невялікія грошы заначаваць...

На канцэрце — тая ж гісторыя: абраныя шчасліўчыкі сядаюць на крэслы, а тысячы і тысячы гледачоў таўкуцца ў гразі, не бачачы толкам сцэны...

Прыладжваюся побач з бабуляй у сіняй хустачцы.

— А вы па запрашальніку? — пытаюся на вуха.

— Во мой запрашальнік! — паказвае яна свой кіёчак.

Баба Валя жыве непадалёку ад замка, але на канцэрт прыйшла ўпершыню.

— Я тыя два дні не была, — кажа мне баба Валя. — Так бульба зарасла, не да канцэртаў гэтых!.. А тут ужо дождж так надакучыў, што вырашыла схадзіць.

— А хто вам больш падабаецца са спевакоў?

— А, дзетачка, якая розніца!.. Абы песні пелі б!..

Мне здалося, што так думае не адна баба Валя. І гэта дорыць вялікі бонус, некаторым спевакам, ставячы іх на адну прыступку з Крысам Норманам. І яны ж спяваюць песні, і ён!

— І хто вам больш спадабаўся? — цікаўлюся ў бабы Валі на выхадзе з канцэрта.

— Мужчыны!.. — лагодна ўсміхаецца бабуля.

Яшчэ паўгадзіны — і сцэнай завалодвае чарговы «мужчына», легендарны саліст гурта «Смокі» Крыс Норман.

Першыя тры песні Крыс спявае з непадключанай электрагітарай, пры гэтым энергічна на ёй граючы. Пасля Крысу, праўда, даюць гітару з дротам.

— Добрый вечьор, Міньск! — крычыць у мікрафон спявак. І я разумею, што ён не ведае, нават не ўяўляе, дзе знаходзіцца. Выглядае, што спявак прыляцеў, яго пасадзілі ў машыну, прывезлі, пусцілі на сцэну...

— На гітары іграе дзяўчына, якая іграла разам з маёй сяброўкай Патрыцыяй Каас, — паведаміў Крыс па-англійску публіцы.

— Давай, Патрыцыя!.. — раве публіка, пачуўшы знаёмае імя.

Канцэрт скончыўся, далі салют...

Каму — Крыс Норман. Каму — шашлычок з квасам..

Не пашанцавала з надвор'ем...

Глеб ЛАБАДЗЕНКА.
Фота аўтара.

ЁН МУДРАСЦЬ НАРОДА ПАДСЛУХАЎ

Імідж любой дзяржавы, грамадства, калектыву ў многім залежыць ад спраў чалавека. Сярод слынных асветнікаў зямлі беларускай, хто ўпамінаецца ў кнізе з такой назвай, якая выйшла ў 2001 годзе ў выдавецтве «Беларуская энцыклапедыя», ёсць прозвішча Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага — славутага беларускага этнографа, фальклярыста, мовазнаўцы, літаратара. На працягу пяці дзесяцігоддзяў (1890—1940) вывучаў ён побыт і культуру беларусаў, рускіх, украінцаў, палякаў, татар, мардвы, народаў Каўказа. Характэрна, што сярод шляхоў, сродкаў і метадаў этнаграфічнай і фальклорнай працы, узятых на ўзбраенне вучоным, самым адметным было сцвярджэнне дружалюбнасці і добрасуседства паміж народамі гэтых супольнасцяў.



Нарадзіўся А. К. Сержпутоўскі 21 чэрвеня 1864 года ў вёсцы Бялевічы, што на Случчыне. Сям'я будучага вучонага не мела сваёй зямлі, бацька займаўся то сплавам лесу, то лесанарыхтоўкай, працаваў лесніком. У 16 гадоў юнак скончыў Вызненскае народнае вучылішча, пазней — Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Працаваў настаўнікам народных вучылішчаў у Мазырскім і Слуцкім паветах (1884—1893), у Мінскім паштова-тэлеграфным ведамстве.

У 1893 годзе Сержпутоўскі пераязджае ў Мінск. Працуе пісарам у мінскім аддзяленні Сялянскага банка, а затым у паштова-тэлеграфным ведамстве. Праз тры гады ён едзе ў Пецярбург. Работу на паштамце паспяхова спалучае з вучобай у археалагічным інстытуце і на вышэйшых юрыдычных курсах. Вольны ад работы час праводзіць у бібліятэках, наведвае Рускае геаграфічнае таварыства, якое аб'ядноўвала даследчыкаў культуры і побыту народаў Расійскай імперыі. З'яўляецца жаданне самому накіравацца ў экспедыцыю ў родныя сэрцу мясціны Беларускага Палесся. У 1906 годзе Сержпутоўскага запрашаюць на работу ў Рускі музей у якасці рэгістратара этнаграфічнага аддзела. Пачынаецца новая старонка ў яго біяграфіі.

Станаўленне Аляксандра Казіміравіча як грамадскага дзеяча, вучонага, даследчыка пачалося з журналістыкі. У адной з першых сваіх нататак «Голас з глушы», апублікаванай 26 красавіка 1891 года на старонках «Минских губернских ведомостей», ён прапаноўвае ўласную праграму пераадолення непісьменнасці ў вёсцы, раіць адкрываць народныя чытальні, куды б прыходзілі сяляне павучыцца кніжнай мудрасці. У другім матэрыяле, апублікаваным у гэтай жа газеце пад загалоўкам «Прыклад варты пераймання», расказвалася пра тое, што жыхары вёскі Лучыцы Петрыкаўскага павета, атрымаўшы ад памешчыка за работу 20 рублёў на гарэлку, вырашылі на гэтыя грошы адрамантаваць царкву.

У 1906 годзе ён двойчы пабываў у экспедыцыях у Слуцкім і Мазырскім паветах, даследаваў маладаступную палескую частку Беларусі па левых прытоках Прыпяці і сабраў багатую этнаграфічную калекцыю сялянскага адзення, земляробчых прыладаў працы, хатняга посуду, узораў вышыўкі — усяго звыш 1000 экспанатаў. Вынікі першых экспедыцый былі абагуленыя ў вялікім этнаграфічным нарысе «Беларусы-палешукі», адзін з раздзелаў якога быў прысвечаны духоўнай культуры сялян, іх звычаям, традыцыям, рытуалам, святам.

Плённымі былі экспедыцыі Сержпутоўскага ў Літву, Польшчу ў 1907—1909 гг. Адтуль ён прывёз сотні этнаграфічных фотаздымкаў, запісаў шмат народных песень, прыказак, прымавак, рэчавых экспанатаў.

У час камандзіроўкі на Каўказ у 1910 годзе ён набыў звыш 400 экспанатаў, зрабіў 140 фотаздымкаў асобных тыпаў народнасцяў, апісаў шмат побытавых сцэн з жыцця горцаў, выканаў дзясяткі малюнкаў і чарцяжоў дамоў, гаспадарчых пабудоў. Паспяховай была экспедыцыя Сержпутоўскага ў Дагестан у чэрвені 1911 года.

Вывучаючы побыт і культуру розных народаў і этнічных груп, Сержпутоўскі імкнуўся прасачыць, які ўплыў яны рабілі адзін на аднаго.

Аляксандр Казіміравіч быў сапраўдным наватарам беларускай этнаграфічнай навукі і фальклярыстыкі. Ён адным з першых сярод збіральнікаў-фальклярыстаў звярнуў увагу на казачнікаў, песеннікаў, стараўся запісваць тэксты з вуснаў самых таленавітых выканаўцаў. Матэрыялы зборнікаў «Сказки и рассказы белорусов-полешуков» (1911 г.), «Казкі і апавяданні беларусаў Слуцкага павета» (1926 г.), падрыхтаваныя ім, — сведчанне таму. Яны сталі адметнай з'явай не толькі ў беларускай і расійскай фальклярыстыцы, але і ў фальклярыстыцы ўсіх славянскіх народаў. Гэтыя кнігі абверглі думку аб беларускай народнай прозе як пераважна міфічнай творчасці. Яны паказалі ўсяму свету, што беларусы — народ таленавіты, мудры, валодае глыбокім філасофска-эстэтычным мысленнем.

Не абышоў увагай збіральнік і народную песню, якая вабіла яго перш за ўсё меладычнасцю, грамадскім гучаннем. Ён адчуваў у песні адлюстраванне духоўнага жыцця народа, яго маральнага ідэалу.

У галіне вывучэння старажытных вераванняў і светапогляду беларусаў важнае месца належыць фундаментальнаму зборніку А. Сержпутоўскага «Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў» (1930). У гэтай кнізе, якая з'яўляецца вынікам яго шматгадовай збіральніцкай дзейнасці, змешчаны вялікі фактычны матэрыял — каля 2,5 тыс. запісаў легендаў, паданняў, прымхаў, забабонаў, зробленых у паўднёвай частцы Слуцкага павета. Яны даюць магчымасць скласці поўнае ўражанне аб духоўным абліччы беларускага селяніна і негатыўных баках яго светапогляду. Нагадаем чытачам «Звязды», што днямі на прылаўках кніжных крамаў рэспублікі з'явілася перавыданне згаданай кнігі, якая выйшла ў выдавецтве «Вышэйшая школа» пад назвай **«Русальная нядзеля»**. Выдатны падарунак аматарам творчасці А.К. Сержпутоўскага да 145-годдзя з дня нараджэння.

Вялікую каштоўнасць мае рукапісны «Зборнік беларускіх прыказак і прымавак». (Нагадаем, што яны надрукаваныя ў кнізе У. Касько **«Палескі дзівасіл»**. — Мн., 2005). У ім звыш шасці тысяч тэкстаў — больш чым у любым іншым дарэвалюцыйным зборніку. За гэтую працу Сержпутоўскаму быў прысуджаны малы залаты медаль Аддзела этнаграфіі Рускага геаграфічнага таварыства.

Аляксандр Казіміравіч зрабіў важкі ўнёсак у развіццё беларускага мовазнаўства. У сваіх шматлікіх працах ён рэзка крытыкаваў дарэвалюцыйных дэмографаў, якія не лічылі беларускую мову самастойнай, аднесілі беларусаў, што прызнавалі каталіцкую веру, да палякаў, а праваслаўную — да рускіх. Свае думкі і назіранні аб гаворцы беларусаў-палешукоў ён выклаў у грунтоўнай працы «Грамматический очерк белорусского наречия дер. Чудина Слуцкого уезда, Минской губернии» (СПб., 1911). Асноваў для напісання працы паслужылі запісы, зробленыя вучоным у 1906—1907 гадах, а таксама назіранні і нататкі больш ранняга перыяду. Вялікай каштоўнасцю з'яўляюцца дададзеныя да нарыса матэрыялы для слоўніка, якія ўтрымліваюць звыш 2,5 тысячы слоў і фразеалагізмаў. Яны ўражваюць навізной, вобразнасцю, сведчаць пра назіральнасць, мудрасць чудзінцаў.

У часопісе «Чырвоны шлях» Сержпутоўскі супрацоўнічаў з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Цішкам Гартным.

А. Бяжковіч, які доўгія гады працаваў разам з вучоным у Рускім музеі, расказваў пра сяброўскія адносіны Аляксандра Казіміравіча Сержпутоўскага з Янкам Купалам. Шмат вершаў паэта Сержпутоўскі ведаў на памяць. Думаецца, што не без уплыву Купалы і Коласа ён напісаў серыю нарысаў пад рубрыкай «Картинки Белоруссии», надрукаваных на старонках часопіса «Чырвоны шлях» у 1918 г. Гэтыя нарысы Сержпутоўскі падпісваў псеўданімам Навум Смага.

У публіцыстычных нарысах А.К. Сержпутоўскі неаднаразова звяртаўся да тэмы эстэтычнага ўспрыняцця простымі сялянамі фальклору, мастацтва, літаратуры. У нарысе «Музыка» (Чырвоны шлях, 1918, №№ 7-8) ён перадае ўспаміны возчыка пра выдатнага народнага скрыпача Івана Цымбаліста, які сваёй ігрой змог прымусіць плакаць і скакаць усю вёску: «Усе стаяць і слухаюць, а тут усё іх горкае жыццё ўяўляецца ім, як на далоні. Грае Іван, і здаецца да яго ўсё сяло. Усчалі такі роў, такі плач, якія бываюць толькі тады, калі праводзяць рэкрутаў. Равуць бабы... Але раптам Цымбаліст перайшоў на «бычка». І ўся вёска пусцілася ў скокі».

А.К. Сержпутоўскі выступіў і як перакладчык на беларускую мову некаторых паэтычных твораў Тараса Шаўчэнкі. Адна такая нізка вершаў была надрукавана ў часопісе «Чырвоны шлях» (1918, №№4-5).

Большасць літаратурных твораў і перакладаў Сержпутоўскага былі напісаны ў змрочныя гады рэакцыі. Героямі іх былі людзі абязdoленыя, гаротныя, якія не хацелі мірыцца з такім становішчам, заклікалі да барацьбы. Заслуга А.К. Сержпутоўскага ў тым, што ён не абышоў злабадзённых праблем, выступіў у сваіх творах як заступнік беднага люду, яго ідэалаў. Некаторыя свае публікацыі Аляксандр Казіміравіч падпісваў псеўданімам Шарпат — сваёй вулічнай мянушкай. Пад гэтым псеўданімам ён надрукаваў артыкул «Новый этнографический музей» аб адкрыцці ў Петраградзе этнаграфічнага музея. У ім аўтар падрабязна характарызуе беларускія калекцыі, якія захоўваліся ў Рускім музеі, выказвае надзею, што музей стане сапраўдным цэнтрам культурнага жыцця Расіі.

45 прац, з якіх кожная фундаментальная, напісана А.К. Сержпутоўскім па выніках яго збіральніцкай і даследчыцкай дзейнасці. На жаль, большая частка іх была вывезена фашысцкімі рабаўнікамі ў Германію ў час вайны разам з архівамі беларускай Акадэміі навук, і лёс іх невядомы.

Вялікую даследчую, навуковую працу вучоны спалучаў з арганізацыйнай, навукова-метадычнай, асветніцкай дзейнасцю. Па даручэнні Ленінградскага аддзела народнай асветы ў 1926 годзе ён прымаў удзел у выпрацоўцы плана і праграмы навукова-даследчых экскурсій па Савецкім Саюзе, удзельнічаў у рабоце акадэмічнай канферэнцыі па рэформе беларускага правапісу ў Мінску, чытаў лекцыі аб жыцці і побыце беларускага народа ў рабочым Нядзельным універсітэце ў Петраградзе, узначальваў экскурсійнае бюро музея.

Сержпутоўскі прапагандаваў беларускую культуру і навуку, распрацоўваў новыя музейныя экспазіцыі, склаў вопісы беларускай калекцыі, накіраванай у 1939 годзе на міжнародную выставу ў Ліверпулі. Вучоны планаваў стварыць фундаментальную работу аб Беларусі і беларускім народзе і тых зменах, што адбыліся ў яго побыце, светапоглядах і культуры за гады савецкай улады. Смерць, якая наступіла 5 сакавіка 1940 г., не дазволіла здзейсніцца гэтым планам.

Аляксандр Казіміравіч Сержпутоўскі пакінуў прыкметны след у гісторыі вывучэння народнай творчасці беларусаў. Яго працы па этнаграфіі, фальклоры, мовазнаўстве, даследаванні народнага побыту, звычаяў, маралі не толькі ўзбагацілі айчынную навуку, але пераканаўча засведчылі мастацкі талент народа, філасофскі склад розуму, яго востры сацыяльны погляд на свет, упісалі залаты радок у справу нацыянальнага Адраджэння.

Уладзімір КАСЬКО,
кандыдат філалагічных навук.

Нёман зноў нагадаў аб Паўночнай вайне

Вяртаючыся да надрукаванага

Зусім нядаўна, у нумары за 7 мая «Звязда» расказала аб унікальным экспанаце Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея — адной з чатырох гарматаў часоў Пятра Першага, якія былі знойдзены ў Нёмане ў ліпені 1966 года. І вось — зноў напамін аб Паўночнай вайне, чарговыя музейныя рарытэты.

Работнікі рачнога порта выконвалі свае традыцыйныя абавязкі па паглыбленні рэчышча Нёмана ў раёне Старога моста, аднак толькі гравійна-пясчанай сумессю іх «здабыткі» не абмежаваліся. У коўш экскаватара з нёманскага дна трапілі ядры, бомбы, а таксама зліткі, верагодна, кулявога свінцу і некаторыя іншыя прадметы вайсковай маёмасці. Яны датаваныя 1702 і 1703 гадамі, а значыць, як і гарматы, маюць прамое дачыненне да часоў Паўночнай вайны. Пра гэта сведчыць і кляймо Расійскага царства.

Такім чынам, Нёман зноў нагадаў аб драматычных старонках нашай гісторыі, падзеях сакавіка 1706 года, калі расійскія войскі падчас прарыву блакады, адступаючы з Гродна, па загадзе Пятра Першага затапілі шмат узбраення, зарадных скрынак і іншай маёмасці. Пакуль знойдзена толькі невялікая частка з гэтага арсенала і таму можна спадзявацца на далейшыя сюрпрызы ад бацькі-Нёмана.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

А. Луарэт не выключае магчымасць адкрыцця ў Беларусі філіяла Луўра

Генеральны дырэктар Луўра не выключае магчымасць адкрыцця ў Беларусі філіяла вядомага музея. Аб гэтым Анры Луарэт паведаміў 21 чэрвеня ў эфіры праграмы «Контуры» тэлеканала АНТ.

Праўда, цяпер аб гэтым гаварыць пакуль што рана. «Мы будзем развіваць супрацоўніцтва паступова, крок за крокам. Пакуль гэта толькі першы кантакт», — сказаў ён.

Закранаючы тэму адкрыцця двайніка Луўра ў Абу-Дабі, Анры Луарэт адзначыў, што некалькі гадоў таму кіраўніцтву музея паступіў запыт з ААЭ аб магчымасці стварэння такой установы. «Разгледзеўшы прапанову, мы прыйшлі да высновы, што гэта магчыма», — прызнаўся ён.

Анры Луарэт падкрэсліў, што першапачаткова Луўр ствараўся як універсальны музей. «Сёння мы ўсведамляем, што славянскае мастацтва недастаткова прадстаўлена ў музеі. Для таго каб выправіць гэты недахоп, мы ўсё часцей звяртаемся да гэтага напрамку, стараемся працаваць са славянскімі краінамі, уключаючы Беларусь, а таксама плануем арганізоўваць сумесныя праекты», — адзначыў ён.

Па прызнанні дырэктара музея, ён шмат разоў наведваў Расію, быў і ва Украіне. «Для мяне было вельмі важна наведаць Мінск, які з'яўляецца неад'емнай часткай славянскай культуры», — падагульніў Анры Луарэт.

БЕЛТА.

Занатоўкі мастака

ЗНІКНЕННЕ ЖАДАННЯЎ

Чуў і чытаў пра знікненне жаданняў з узростам; чым ты старэйшы, тым меней у цябе розных памкненняў і хаценняў. Цяпер я чакаю, калі ў мяне прападзе ранкавае жаданне курыць. Устаю раніцаю і прыслухоўваюся да арганізма... Мо ў яго, нарэшце, знікла прага да кавы з цыгарэтаю? Паслухаю яго, пакуль зубы чышчу ды апалоскваю твар халаднаватай вадой, паслухаю і зноўку пераканаюся: арганізм жадае ўжыць тытунёвы дым і моцную чорную горкую каву. Добра, што ён не хоча выпіць гарэлкі. Раней хацеў. Ён і цяперака можа пажадаць гарэлкі, але я яму цвёрда адмаўляю. Выдатна, што ягоныя ранішнія пажаданні абмяжоўваюцца кавою і цыгарэтаю. За сваю каву і цыгарэту ён у мяне мусіць яшчэ шмат чаго зрабіць, напрыклад: прабегчы вакол парку, прыняць душ, пагаліць твар, апрануцца ў працоўны строй, з'есці талерку аўсянай кашы... Калі даядаецца каша, я ўжо не спадзяюся на сягоняшняе знікненне жадання пакурыць, я спадзяюся на заўтрашняе знікненне...

РЭКЛАМА Ў МАСКВЕ

Рэкламны рынак Масквы абрынуўся ў крызіс. Што рэкламаваць на шэрых і брудных вуліцах, калі ў людзей усё меней і меней рублёў па кішэнях? Учора я пабачыў на рэкламным стэндзе чырвонага каня. З халоднай і вільготнай шэрасці на мяне лясцеў чырвоны конь з залатым хлопчыкам вершнікам, той самы конь, якога напісаў Пятроў-Водкін. Праз сто метраў на дарозе Шарамецьева—Масква я зноў сустрэўся з вогненна-чырвоным канём. На карціне быў надпіс «Шэдэўры сусветнага жывапісу...» Прачытаць далей я не паспеў, але праз сотню метраў над дарогаю ўзвышаўся стэнд з садавіною Машкова. Пад метровымі фіялетавымі слівамі я прачытаў запрашэнне наведаць Траццякоўскую галерэю. Уся Масква завешана сакавітым жывапісам. Ружовыя бабы Архіпава, чырвоныя бабы Малявіна, белатварыя дзяўчаты Сярова клічуць у галерэю. Мяне такі рэкламны крызіс пацешыў. Жывапіс выйшаў на вуліцы рататваць Маскву, выйшаў рататваць і на нейкі час выратаваў.

КЛІНАЎ І ГЕРМАФРАДЫТ

Авангардыст Артур Клінаў атрымаў развод, у судзе ён скасаваў свой шлюб. Разводзіцца Артур задумаў на ўласным вяселлі, але больш за пятнаццаць гадоў ішоў да рэалізацыі задуманага. Здзейснілася мара: Артур зноўку вольны мужчына, які шукае роднасную мастакоўскую душу для сумеснага пражывання. Патрабаванняў да душы ў Артура даволі многа. Душа мусіць любіць ці палюбіць наш Мінск — горад сонца, яна абавязана шанаваць сучаснае мастацтва і найноўшую літаратуру, душа павінна разумець авангардыста Артура Клінава. Цікава тое, што сэксуальных патрабаванняў Артур не высунуў. Таму душа можа быць як у жаночым, так і ў мужчынскім целе, нават душа мае поўнае права знаходзіцца ў целе гермафрадыта. У такіх абставінах можна парадавацца за гермафрадытаў, бо мы пра іх, зазвычай, нават і не згадваем.

РАКІЦКІ І БІЯГРАФІЯ

Мастак Хобатаў сказаў мастаку Ракіцкаму, што ў яго няма біяграфіі. Ракіцкі спытаў у Хобатава, як прадаць свае малюнкі, а той параіў звярнуцца да спецыяліста, які напіша яму шыкоўную біяграфію мастака ўсяго за дзве тысячы долараў. Калі Ракіцкі распавёў мне пра кошт на біяграфію, я адразу зацікавіўся дарагім жанрам літаратуры. За такія грошы можна напісаць шыкоўную біяграфію з сапраўдным дзівам накшталт таго, што мастак Хобатаў адрэзаў сабе вуха, а яно ў яго прырасло назад, і нават шнар разгладзіўся да незаўважнасці. Можна прыдумаць іншае дзіва пра руку, якая ўначы лётае ў майстэрню і ў поўнай цемрадзі піша нацюрморты... Ракіцкі адмовіўся ад паслуг Хобатава. Дарма. Трэба было замовіць сабе біяграфію, а потым адмовіцца ад яе, калі не спадабаецца. Я абавязкова б замовіў.

ГАНУЛЬКА І ДАНІЛА

На прэзентацыі жончынага фотаальбома «Жанчыны Еўропы» сярод гасцей была і вучаніца маёй жонкі — Ганулька. Яна спраўна здымала вечарынку, а потым заснула на канапе. Стамілася? Але не ў тым яна ўзросце, каб так хутка стамляцца. Напілася? Але не выглядае маладзенькая і сціплая Ганулька на чалавека, які здатны напіцца на фуршэце так, каб заснуць на канапе. Да соннай Ганулькі прыставілі ахоўніка, і на праблему забыліся. На другі дзень Ганулька распавяла, што на вечарынцы да яе падышоў дзевяцігадовы Даніла з фужэрам чырвонага віна. «Цётачка, выпіце...» — папрасіў Даніла. Ён так сказаў гэтае «Цётачка, выпіце...», што Ганулька не змагла адмовіцца. Яна выпіла вялікі фужэр гарэлкі, зафарбаваны віном. Апошняе, што паспела зрабіць Ганулька перад тым як заснуць, гэта сфатаграфаваць хлопчыка Данілу, які зафарбоўвае чарговы фужэр гарэлкі дарагім італьянскім віном. Кадр атрымаўся змазаны, такія кадры не могуць служыць доказамі, але не паверыць Ганульцы няма падставаў. Дый і так, без усялякіх доказаў, мы ўсе цудоўна ведаем, што д'ябал спакусы любіць прымаць форму хлопчыка-анёла.

ВОВА І САБАКА

Сабачка прапаў! Вой-вой-вуй, мой кабялёк уцёк! Людцы добрыя, дапамажыце мне сабачачку знайсці! Лямант на ўвесь інтэрнэт разлятаецца. І знаходзяцца спачувальнікі, і бягуць яны шукаць сабаку, які збег на сакавіцкі загуляж. Вясна, інстынкт пагнаў сабаку ў гайню. Пагуляе і вернецца, нідзе не дзенецца падлюка хвастаты. Голад прыгоніць яго ў цёплую гаспадарову кватэру...

Мог бы я паспачуваць кабялю з ягоным гаспадаром, ды нешта мне не спачуваецца. А не спачуваецца мне з-за Вовы. Пайшоў мой унук з прабабаю Ядзяю ў палац школьнікаў на заняткі па маляванні. У палацы ён запатрабаваў у Ядзі грошы на порцыю какавы з цукрам і вяршкамі. У фае палаца стаіць апарат з какаю, гарбатаю і какаваю. Ядзя грошы не дала. Маўляў, няма грошай і ўсё, а як памалюеш, бацька Мікалай прыйдзе цябе забіраць і купіць какавы.

Бацька прыйшоў, але Вовы ў студыі не было. Выкладчык Іваноў сказаў, што Вова пазычыў у яго тысячу і пабег піць какаву. Мікалай пачакаў крыху і пайшоў сына шукаць. Абышоў ён увесь палац, а Вову не знайшоў. Іваноў расхвалявaўся: дзіця згубілася, недаглядзеў. Дзіця — гэта табе не сабачка, дзіця — гэта сур'ёзна. Чутка пра знікненне хлопчыка ўвобмільг абляцела палац. Шукалі ўсе, хто толькі мог шукаць. Тым часам Вова з пластыкавым кубачкам у руцэ ціха сядзеў у студыі, за сейфам. Прасядзеў ён за сейфам хвілін сорак і выйшаў. Мікалай Вову не біў, але пакараць пакараў — не пусціў на фотавыставу да бабы Алены. На выставе толькі размоў было, што пра Вову, які схаваўся ў сейф. Вядома, як адзін чалавек другому навіну пераказвае: дакладнасць страчваецца, а экспрэсія дадаецца з кожным пераказам.

Літоўскі дыпламат Артурас да гісторыі пра сейф прыляпіў гісторыю пра куфар... Чацвёра дзяцей залезлі ў куфар, закрыліся векам, пачалі задыхацца, але адчыніць цяжкое века не змаглі і сканалі. Ад гісторыі пра куфар Алена ўся збялела. Давялося ёй растлумачыць, што кожнае вясковае і местачковае дзіця ведае страшныя гісторыі пра куфар і шафу, у якіх пазадыхаліся дзеці. Каб падшыванцы не лазілі ў куфры і шафы ды не камечылі адзежу з бялізнаю, дарослыя распавядаюць ім пра жудасныя здарэнні ў зачыненай мэблі. Развесяліць жонку я не здолеў, гісторыя пра Вову і сейф цэлы вечар не давала ёй спакою. Бо дзіця гэта дзіця, гэта не сабака, за дзіця ты перажываеш так, як нават за самога сябе не перажываеш.

ВОВА І САМАЛЁЦІК

Вова навучыўся дасылаць эсэмэскі. Унук даслаў мне намаляваны самалёцік, я выправіў той самалёцік яму. Так і лётае самалёцік ад яго да мяне і ад мяне да Вовы.

Адам ГЛОБУС.

...І ПЯЦЬ «МЕРСЕДЭСАЎ» ДЛЯ «ЗОРАК»

— Спецыяльна для таго, каб пераможца «Еўрабачання» Аляксандр Рыбак прыбыў у Віцебск, закажуць чартарны авіярэйс з Масквы ў Нарвегію, а потым самалёт прыбудзе ў віцебскі аэрапорт. На наступны дзень Рыбак на гэтым жа борце паляціць з «базару», — распавядае кіраўнік дырэкцыі міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Радзівон Бас. — А каб вазіць па горадзе «зорак», спецыяльна з Мінска прыбудуць пяць «Мерседэсаў» самага элітнага класа...

Паводле слоў спадара Баса, пытанне аб прыбыцці на «базар» Рыбака ўзгаднялася з вядомым расійскім прадзюсарскім цэнтрам, які падпісаў з ім кантракт. Яшчэ ў Рыбака ёсць і нарвежскія прадзюсары. Патрабаванні першых вельмі высокія — нават памер бананаў і назву жвачкі трэба ўзгадняць...

На жаль, як расказалі ў дырэкцыі «базару», віцебскія, нават самыя лепшыя, гатэлі больш чым сціплыя для прыёму славутасцяў. Той жа «зорны» гатэль «Лучоса». Не хапае маленькіх гатэляў элітнага класа з апартаментамі. Да чаго раней справы даходзілі — ахова Баскава жыла ў адным гатэлі, а ён с

«КРЫНІЦА» ШУКАЕ МЕНЕДЖАРА

Канцэрн «Белдзяржхарчпрам» аб'явіў адкрыты конкурс па выбары кіруючай кампаніі на ААТ «Крыніца». Пры гэтым, як адзначыла прэс-сакратар канцэрна Ірына Гусева, падобны конкурс у Беларусі праводзіцца ўпершыню.

Кіруючая кампанія павінна гарантаваць стабільную вытворчасць, павышэнне якасці прадукцыі, дасягненне пэўных фінансавых паказчыкаў, а таксама даходны ўзровень работы акцыянернага таварыства, які павінен забяспечыць пагашэнне абавязкаў па інвестыцыйных крэдытах. Прычым удзел у конкурсе могуць прымаць юрыдычныя асобы, якія з'яўляюцца рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, і замежныя кампаніі. Аднак пры ўмове — прэтэндэнты павінны мець досвед кіравання і аздараўлення прадпрыемстваў, што займаюцца вытворчасцю і рэалізацыяй прадуктаў харчавання. Адпаведна, апроч праграмы дзейнасці, тым жа прэтэндэнтам неабходна падаць аўдытарскае заключэнне аб сваім фінансава-эканамічным стане і рэкамендацыі арганізацый, што знаходзіліся ў кіраванні раней.

Дарэчы, варта заўважыць, што ААТ «Крыніца» з'яўляецца найбуйнейшым вытворцам піва ў Беларусі — яго магутнасць складае 24 тысячы дэкалітраў у год.

Сяргей ГРЫБ.

Аб'ём транзіту праз Беларусь можа скласці каля $1,9 млрд

Пра гэта паведаміў журналістам начальнік аддзела развіцця транспартнай дзейнасці і лагістыкі Міністэрства транспарту і камунікацый Беларусі Сяргей Кучынскі. За 5 месяцаў гэтага года аб'ём транзітных перавозак усімі відамі транспарту скараціўся на 15-20 працэнтаў. За гэты ж перыяд аб'ём транзітных чыгуначных перавозак скараціўся на 19 працэнтаў у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года (даходы знізіліся больш чым на 10 працэнтаў), аб'ём транзіту трубаправодным транспартам — на 28,4 працэнта па газе і на 2,7 па нафце. Колькасць транзітных палётаў замежных паветраных суднаў паменшылася на 9,7 працэнта, перавозак замежнымі аўтаперавозчыкамі — на 23,4 працэнта.

Тым не менш, падзенне транзіту праз Беларусь значна меншае, чым у суседзяў. Гэта, на думку Сяргея Кучынскага, абумоўлена нашай гнуткай тарыфнай палітыкай, якая дазваляе не дапусціць абвальнага зніжэння аб'ёмаў транзіту і ўтрымаць яго на наяўным узроўні. У гэтым годзе аб'ём транзіту праз Беларусь можа скласці каля $1,9 млрд.

Галоўнае пытанне, якое можа хваляваць і прафесійных аўтаперавозчыкаў, і аўтааматараў, — гэта тое, ці не збіраецца «Белаўтадор» увесці ў Беларусі платныя дарогі? Намеснік дырэктара дэпартамента «Белаўтадор» Рыгор Шульга адразу адхіліў такія меркаванні. «На сёння пытанне аб платных дарогах не абмяркоўваецца, — заявіў ён. — Кампенсацыя грашовых затрат на выкарыстанне дарог плануецца ажыццяўляць у выглядзе так званых віньетак. Прынамсі, мы разглядаем такі варыянт». Як растлумачыў Р. Шульга, замежны аўтаўладальнік будзе аплачваць пэўную суму не ў залежнасці ад кіламетражу, які «прабяжыць» па беларускіх дарогах яго машына, а за тэрмін знаходжання. На аўтамабілі будзе размешчана наклейка-віньетка. Дарэчы, беларускія перавозчыкі таксама атрымаюць такія наклейкі — толькі з больш працяглым часам дзеяння. Аднак пры гэтым спецыяліст не паведаміў, калі такая практыка пачне ажыццяўляцца.

Іна АРЭХАВА.

Сведения об объекте республиканской собственности, подлежащем разгосударствлению и приватизации

Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность			Республиканское унитарное предприятие «Новоельнянский комбинат хлебопродуктов» РУП "Новоельнянский КХП" Министерство сельского хозяйства и продовольствия Республики Беларусь
Адрес			231470, Гродненская область, г.п. Новоельня, ул. Новогрудская, 37
Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции			Производство готовых кормов для животных, содержащихся на фермах; производство смешанное мясояичное; производство муки, производство крупы
Положение на рынке			Не занимает доминирующего положения
Планируемые сроки разгосударствления и приватизации			2 квартал 2009 г.
Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации данного объекта и его местонахождение			Создание открытого акционерного общества
Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение			Гродненский областной территориальный фонд государственного имущества 220023, г. Гродно, ул. 17 Сентября, 39
Численность работающих, чел.			147
Срок предъявлений претензий			Месяц со дня опубликования
Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей.			12 384 526 000
Стоимость основных фондов – всего, рублей			9 727 019 542
Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га			10,1569
Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей			3 000 000
Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб.			нет
Финансовое состояние объекта, руб.	Балансовая прибыль		343 453 986
	Задолженность	кредиторская	2 020 122 299
		дебиторская	4 375 748 416

УНП 100745627

На слыху

З'ЕЛА 12 МІЛЬЁНАЎ?

У выніку планавай інвентарызацыі, праведзенай у буфеце прадпрыемства «Гандлёвы дом «Гомельдрэў», высветлілася нястача, якую Крымінальны кодэкс трактуе як «у буйных памерах». Па выніках праверкі па паперах усё сходзілася, аднак у сапраўднасці высветлілася, што з лістапада 2008 года па красавік 2009-га ў касу за атрыманыя прадукты не паступіла больш чым 12 мільёнаў рублёў. Як паведаміў старшы следчы аддзела ўнутраных спраў Навабеліцкага раёна Гомеля Дзмітрый Сцяпанчыкаў, 22-гадовая буфетчыца не можа растлумачыць, куды дзеўся харч на такую вялізную суму. Між тым, згодна з законам, суд ёй можа даць ад 2 да 5 гадоў пазбаўлення волі.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

СКРАЎ... КАРОВУ

Ноччу з фермы сельскагаспадарчага вытворчага кааператыва, што ў Сенненскім раёне, скралі карову вагой пад 400 кілаграмаў. За 320 метраў ад фермы знайшлі тушу каровы і вярнулі на ферму. Пад падазрэннем ва ўчыненні злачынства 38-гадовы беспрацоўны жыхар райцэнтра, які на момант падрыхтоўкі навіны адшукваўся. Страту гаспадарка ацаніла ў 1,2 мільёна рублёў. Ферма ахоўваецца, але на момант учынення злачынства вартаўнік чамусьці адсутнічаў.

АДКУЛЬ АГАРОДНІНА НА 7 МІЛЬЁНАЎ?

Супрацоўнікі аршанскага раённага аддзела міліцыі і раённага аддзела Дэпартамента аховы ў вёсцы Грышаны затрымалі аўто «Івека», на якой перавозілі 2,8 тоны гародніны (агуркі і таматы). А суправаджальных дакументаў на іх не было. Як растлумачыў вадзіцель, груз належыць мінскай прыватнай фірме. Склалі адміністрацыйны пратакол. Агуркі і таматы агульным коштам больш за 7 мільёнаў беларускіх рублёў канфіскавалі.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Логойский районный исполнительный комитет

сообщает о проведении **23.07.2009 г.** открытого аукциона на право заключения договоров аренды охотугодий, находящихся в фонде запаса ГЛХУ «Логойский лесхоз».

На аукционные торги выставляется:

Предмет аукциона	Лот 1 Охотничьи угодья, расположенные в южной части Логойского района Минской области, – 14,0 тысяч га
Характеристика объекта	Охотугодья –14,0 тыс. га в т.ч. леса – 2,4 тыс. га, поля 11,5 тыс. га, водно-болтные – 0,1 тыс. га
Место нахождения	Минская область, Логойский район. Охотничьи угодья расположены в южной части района. **Северная граница**: от пересечения дороги Логоза-Кузевичи с рекой Гайна вниз по течению реки Гайна до пересечения с дорогой Добренево-Беланы. Далее на юго-запад по автомобильной дороге через н.п. Беланы, Новое Житье, Малиновка, Зеленый сад до автомобильной дороги Жодино-Дениски. Затем юго-запад по автомобильной дороге Жодино-Дениски до автомобильной дороги на н.п. Августово, далее на север по ней через н.п. Заозерье, Гастиловичи до р. Гайна, согласно биолого-техническому обоснованию. **Восточная граница**: от пересечения дороги Нивки-Гастиловичи с рекой Гайна вниз по течению реки Гайна до административной границы Логойского и Смолевичского районов. Далее на юго-запад по административной границе Логойского и Смолевичского районов до реки Деряженка. **Южная граница**: от пересечения реки Деряженка с административной границей Логойского и Смолевичского районов на запад по ней до административной границы Логойского и Минского районов и далее в этом же направлении по административной границе указанных районов до проселочной дороги на н.п. Метличино. **Западная граница**: от пересечения административной границы Логойского и Минского районов с проселочной дороги на н.п. Метличино на север по автодороге через н.п. Метличино, Веснино, Крапужино, Кондратовичи, Селец, Городище, Логоза, Кузевичи до реки Гайна. Территория фонда запаса охотничьих угодий Логойского района выставляемая на конкурс для передачи ее в аренду для ведения охотничьего хозяйства граничит: на северо-западе – с охотугодиями охотхозяйства ГЛХУ «Логойский лесхоз», на севере – с запретной для охоты зоной вокруг г. Логойска, на востоке – с фондом запаса охотничьих угодий Логойского района, на юге – с охотугодиями Учреждения «Смолевичская общественная организационная структура» РГОО «БООР», на западе – с охотугодиями Логойского охотхозяйства БВОО.
Начальная цена	Всего 20 000 000 руб.
Сумма задатка	2 175 000 (10 % от цены + 5 % базовой величины)
Продавец	Логойский районный исполнительный комитет. Минская обл., Логойский район, ул. Советская, д.15, тел. 55 4 50, (код 8 017 74), 55 8 39 (код 8 017 74)

Аукцион состоится «23» июля 2009 года в 10.00 по адресу: г. Логойск, ул. Советская, д. 15, третий этаж, актовый зал. Заявления на участие принимаются по рабочим дням с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: г. Логойск, ул. Советская, д. 15, отдел экономики. Последний день приема заявления «20» июля 2009 года до 17.00.

Аукциона проводится в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 года № 580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими». Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условия – наличие двух участников.

К участию допускаются юридические лица, подавшие заявление установленной формы, копию платежного поручения, заверенную банком, подтверждающую внесение задатка в размере, указанном в извещении. Сумма задатка перечисляется на р/с № 3604000620014 в филиале 611 АСБ «Беларусбанк», код 518, в г. Логойске. Получатель — Логойский райисполком. УНН 600181814.

Участнику необходимо в срок, указанный в извещении, подать заявление и подписать Соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона и предоставить в уполномоченную организацию следующие документы:

Заявление установленной формы;

Копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации без нотариального удостоверения;

Справку банка или небанковской кредитно-финансовой организации о наличии денежных средств на счете юридического лица или иные документы, подтверждающие платежеспособность юридического лица;

Предложения в письменной форме о выполнении условий торгов запечатанные в отдельном конверте. При этом данные предложения являются окончательными и не могут уточняться в ходе торгов.

При подаче документов на участие в аукционе представители юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Основными условиями проведения торгов на право заключения договора аренды являются организация и рациональное ведение охотничьего хозяйства на территории передаваемых в аренду охотничьих угодий.

Договор арены заключается на 10 лет.

Победитель обязан:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия Логойским райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона охотугодий возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с разработкой биолого-экономических обоснований и карт-схем.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды.

После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2 но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом охотугодий заключается договор купли-продажи на право заключения договора аренды охотугодий.

Порядок проведения аукциона определен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 8 декабря 2005 года № 580 «О некоторых мерах по повышению эффективности ведения охотничьего хозяйства и рыбохозяйственной деятельности, совершенствованию государственного управления ими».

Логойский райисполком (организатор аукциона) имеет право снять предмет аукциона в любой момент до даты его проведения.

Все расчеты по сумме задатка производятся путем перечисления их на расчетный счет Логойского райисполкома № 3604000620014 в филиале 611 АСБ «Беларусбанк», код 518, в г. Логойске, УНН 600181814.

Лішніх грошай не бывае

ДЗЕ ПАДЗАРАБІЦЬ ВЯСКОЎЦУ?

Параўнальна невысокія зарплаты і пенсіі — традыцыйная асаблівасць невялікіх сельскагаспадарчых раёнаў. Разам з тым таксама не сакрэт: калі ёсць сілы і жаданне, узровень уласных даходаў рэальна павялічыць за кошт іншых крыніц. Варта заўважыць, што ў адрозненне ад жыхароў буйных гарадоў магчымасцяў падзарабіць у вяскоўцаў, магчыма, не так шмат. Аднак тут таксама існуюць варыянты, і пра іх — больш падрабязна.

БУЛЬБА І НЕ ТОЛЬКІ

Ці не найбольш распаўсюджаны шлях атрымання дадатковых даходаў — здача сельгаспрадукцыі з уласнага падворка. Агародніну, садавіну, ягады і бульбу прымаюць у раённых нарыхтоўчых канторах і вясковых крамах, апроч таго, прадаць усе лішкі з прысядзібнай гаспадаркі можна з дапамогай раз'язных нарыхтоўшчыкаў — яны наведваюць вёскі паводле папярэдніх заявак.

— Пакуль у асноўным намі прымаецца капуста па 1200, агуркі і маладая бульба па 2000 і садовыя суніцы па 2500—3000 рублёў, — кажа эканаміст па нарыхтоўках Крупскага райспажыўтаварыства Наталля Алексяёнак. — Прычым з цягам часу гэты пералік стане пашырацца, а вось цэны пачнуць паступова зніжацца. Чакаецца, што ў перыяд масавага збору ўраджаю кілаграм той жа капусты будзе «каштаваць» 400—500, агуркоў — 1300—1500, бульбы — 300—400, таварнага яблыка — 1000—1500, а яблыка на перапрацоўку — прыкладна 300 рублёў за кілаграм.

Практыка сведчыць, што з улікам бульбы здача лішкаў сельгаспрадукцыі папаўняе бюджэт сярэдняй вясковай сям'і недзе на мільён рублёў. І гэта — ужо адчувальныя і да таго ж стабільныя грошы. Так, сёння разлікі па нарыхтоўках робяцца «на месцы». А максімальная адтэрміноўка выплат у «пікавы» час нават у горшым выпадку не павінна перавышаць тыдзень.

ХТО ШУКАЕ, ТОЙ І МАЕ

Знайсці вольны час улетку заўсёды цяжка. Але калі ён ёсць, нельга не ўзгадаць аб магчымасцях падзарабіць на ягадах, грыбах і лекавых травах. Да прыкладу, сёлета мінімальныя закупачныя цэны на белы грыб вызначаныя ў 3200, на лісічкі — 2700, ababak, падасінавік і маслёнак — 1000, брусніцы — 1700, журавіны — 1800, чарніцы — 2500 рублёў за кілаграм. Прычым варта заўважыць, што гэта менавіта найменшая «планка». Адпаведна, з улікам ураджаю і попыту «расцэнкі» могуць павышацца.

Як правіла, дадатковыя даходы ўсіх тых, хто займаецца дзікарослымі раслінамі сур'ёзна, складаюць каля 2 мільёнаў рублёў у сезон, і такая лічба — яшчэ не рэкорд. У якасці перавагі падобнага «бізнэсу» можна назваць і па сутнасці «нулявыя» выдаткі. Адно, што ў гэтым выпадку трэба не забывацца на прыродаахоўныя патрабаванні: рабіць зборы неабходна ў вызначаныя тэрміны і толькі рукамі — без выкарыстання тых або іншых тэхнічных прыстасаванняў.

ЛІТР ЦАНУ НЕ ЗМЯНЯЕ

Усё менш папулярнай крыніцай дадатковага даходу становіцца малако. Нягледзячы на дапамогу з пашай і кармамі, адсутнасць праблем са здачай і строгі графік аплаты, «прыватны» статак працягвае скарачацца. Бо догляд каровы — справа цяжкая. І збольшага займаюцца ёй прадстаўнікі старэйшага пакалення.

— У сувязі з пераглядам стандартаў з 1 красавіка змяніліся патрабаванні да закупак малака, яго базісная тлустасць павялічылася з 3,4 да 3,6 %, а гэта паўплывала на магчымасць атрымання даходаў — сёння 100 літраў фізічнай вагі часам можа адпавядаць 90 літрам вагі заліковай, — адзначае старшыня Крупскага райсавета Мікалай Карэцкі. — Аднак у нечым праблему ўдалося змякчыць. Як вядома, сёлета закупачная цана на малако І гатунку для сельгаспрадпрыемстваў зменшылася, а вось для насельніцтва яна засталася ранейшай — 665 рублёў за літр.

Зразумела, што ў першую чаргу малако было і застанецца прадуктам для «асабістага спажывання». Таму хтосьці здае ў дзень толькі па 3 літры і, такім чынам, зарабляе выключна на бохан хлеба. Але ёсць і іншыя прыклады, калі «прыватнікі» трымаюць па 3 каровы і здаюць па 30—40 літраў штодня. У такім выпадку даход у месяц складае ўжо па 600—800 тысяч — гэта сума цалкам супастаўляльная з зарплатай у сельгаспрадпрыемствах.

ТУРПАСЛУГІ З ВАРЫЯНТАМІ

Рост цікавасці да адпачынку ў Беларусі назіраецца ўжо не першы год. А вось «фармат» у гэтым выпадку кожны выбірае самастойна. І калі адны імкнуцца наведаць санаторый ці турбазу, то іншыя лічаць за лепшае проста зняць дом або пакой у вёсцы. А дзе попыт — там і прапанова.

У залежнасці ад многіх акалічнасцяў кошт падобнага адпачынку можа быць абсалютна розным. Рознымі атрымаюцца і даходы. Аднак усім, хто вырашыць падзарабіць такім чынам, нельга скідваць з рахункаў некаторыя правілы. І ў прыватнасці, гаворка ідзе аб падатках.

Ці не самым складаным варыянтам стане здача памяшканняў на кароткі, да 15 дзён, тэрмін — у такім разе давядзецца рэгістравацца ў якасці індывідуальнага прадпрымальніка. Здача памяшканняў на больш працяглы час рэгістрацыі ў якасці ІП не прадугледжвае. Аднак, каб не ўзнікла праблем, неабходна аформіць дагавор найму і плаціць фіксаваны падатак. Напрыклад, у Крупскім і іншых невялікіх раёнах памер такога падатку вызначаны ў 0,4 базавай велічыні ў месяц.

Урэшце, яшчэ адзін варыянт — паслугі ў сферы аграэкатурызму. Рэгістравацца ў якасці прадпрымальніка тут зноў-такі не трэба, дастаткова падаць заяву і заплаціць спецыяльны збор — 1 базавую велічыню, ці 35 тысяч рублёў. Разам з тым для работы ў сферы аграгурызму вызначаны пэўныя ўмовы: здача не больш чым 5 пакояў, вытворчасць сельгаспрадукцыі, арганізацыя адпачынку.

— У аграгурызму ёсць прыхільнікі, і гэта дзейнасць сапраўды можа прыносіць даход — звычайна кошт адпачынку вагаецца ў межах 50—70 тысяч рублёў за суткі, — зазначае галоўны спецыяліст аддзела па фізкультуры, спорце і турызме Крупскага райвыканкама Алена Таболіна. — Аднак няма сумненняў: гасцям сядзібаў неабходна стварыць камфортныя ўмовы пражывання, прапанаваць разнастайныя заняткі. А ў сваю чаргу гэта — грошы. І часам укладанні складаюць дзясяткі тысяч долараў.

КОШЫК — ТАКСАМА ДАРЭЧЫ

Колькі слоў аб аказанні некаторых «сацыяльных» паслуг аднавяскоўцам. Мець статус індывідуальнага прадпрымальніка тут таксама не трэба, няма неабходнасці весці справаздачнасць, галоўнае — падаць заяву і плаціць той жа фіксаваны падатак. Так, у невялікіх раёнах памер такога падатку ў выпадку арганізацыі дзённага догляду дзяцей складае 8, а ў выпадку арганізацыі драблення зерня, выпасу жывёлы ці апрацоўкі прысядзібных участкаў — па 5 еўра ў месяц. Пры гэтым непасрэдна тарыфы на паслугі вызначаюцца «паводле дамоўленасці бакоў».

— На жаль, пакуль гэтыя даволі перспектыўныя віды дзейнасці масавай з'явай не сталі, — заўважае начальнік аддзела кантролю за падаткаабкладаннем індывідуальных прадпрымальнікаў і фізічных асобаў інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Крупскім раёне Галіна Барадаўка. — Больш прыхылося рамесніцтва — аказанне паслуг з выкарыстаннем ручной працы. У нас ёсць людзі, якія зарабляюць кавальскімі вырабамі, вырабамі з гліны, пляценнем з лазы кошыкаў, робяць цяпліцы, альтанкі, сельгасінвентар, бочкі. Што да ўмоў, то яны дастаткова простыя: рамесніку неабходна стаць на ўлік у падатковай інспекцыі і заплаціць збор у памеры 1 базавай велічыні ў год.

ПЕНСІЯНЕР, «БЮДЖЭТНІК», ШКОЛЬНІК

Безумоўна, у першую чаргу платныя грамадскія работы разлічаныя на беспрацоўных. Але не толькі. Пры жаданні звярнуцца ў службу занятасці і паўдзельнічаць у іх могуць падчас выхадных або працоўных водпускаў тыя ж работнікі «бюджэтных» арганізацый. Або пенсіянеры.

Звычайна грамадскія работы звязаныя з сельскай гаспадаркай — пасадкамі, пераборкай бульбы, уборкай ураджаю. А разлікі маюць некалькі «схем»: могуць заплаціць грашыма (як правіла, атрымліваецца па 10—15 тысяч рублёў за дзень), сельгаспрадукцыяй (прыкладам, мяшком бульбы) або прапанаваць змешаны «грашова-натуральны» варыянт.

— Адначасова мы прапануем падзарабіць яшчэ адной катэгорыі — школьнікам, — распавядае намеснік начальніка раённага ўпраўлення па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Алена Смірнова. — На час летніх канікулаў служба занятасці падбірае для іх нескладаныя работы па дробных рамонтах, афармленні кабінетаў, пасадкі кветак, добраўпарадкаванні тэрыторыі навучальных устаноў, да таго ж у гэтым выпадку не можа ісці гаворка аб занятасці ў поўным рэжыме: заканадаўства дазваляе працаваць падлеткам ва ўзросце 14—16 гадоў максімум 4,5, а ва ўзросце 16—18 гадоў — не больш за 7 гадзін у тыдзень. Тым не менш галоўнае ў іншым. У выніку школьнікі могуць зарабіць цалкам рэальныя грошы — прынамсі па 200 тысяч рублёў за месяц.

Сяргей ГРЫБ.

Мінск—Крупкі.

Антыкрызісная эканоміка

ПРЫЯРЫТЭТ — БУДАЎНІЦТВА ЖЫЛЛЯ

У Гродне праектуюць новыя мікрараёны для індывідуальных забудоўшчыкаў і шукаюць інвестараў для будаўніцтва 23-павярховых дамоў

Паводле інфармацыі першага намесніка старшыні Гродзенскага гарвыканкама Аляксандра Цыбульнікава, у абласным цэнтры, на жаль, былі вымушаныя прыпыніць будаўніцтва шэрагу аб'ектаў, але гэта не датычыцца жылых дамоў. Сёлета па выніках паўгоддзя чакаецца нават некаторае апярэджанне вызначанага графіку ўводу жылля.

Калі летась уведзена 282 тысячы квадратных метраў жылля (ЖБК, індывідуальнае і камерцыйнае), то заданне на гэты год — 344 тысячы, а на наступны плануецца 535 тысяч квадратных метраў.

— Безумоўна, гэта немагчыма без ільготнага крэдытавання, — зазначае Аляксандр Цыбульнікаў. — І банкі сваё абяцанне вытрымліваюць, фінансаванне забудоўшчыкаў, асабліва льготных катэгорый, ажыццяўляецца ў поўным аб'ёме. Вельмі важную ролю адыгрывае і прэзідэнцкі Указ № 131, які дазваляе ўпраўленню капітальнага будаўніцтва на стадыі фарміравання жыллёва-будаўнічага кааператыва прыцягваць да трыццаці працэнтаў запланаваных на льготныя крэдыты сродкаў. Каб можна было разлічыцца з праекціроўшчыкамі і распачаць будаўніцтва, не чакаючы завяршэння адкрыцця індывідуальных крэдытных ліній.

Напрыканцы мінулага года ў Гродне ўведзены два шматкватэрныя дамы, дзе 87 кватэр атрымалі людзі з сацыяльнай чаргі і 103 — з аварыйнага жыллёвага фонду. Сёлета для гэтых катэгорый пабудаваны 144-кватэрны дом пабудаваны, а ў кастрычніку плануецца ўвод яшчэ аднаго такога ж. Такім чынам, у горадзе значна зменшыцца чарга па сацыяльных кватэрах і адсяленні з аварыйнага жылля.

Дарэчы, цяпер у Гродне прапрацоўваецца пытанне будаўніцтва 23-павярховых жылых дамоў з блокам абслугоўвання на ніжніх паверхах. Фарміруюцца і спісы ахвотных атрымаць участак для індывідуальнага будаўніцтва. У раённыя адміністрацыі на сёння па гэтым пытанні звярнулася каля 1500 чалавек і, згодна з чарговасцю падачы заяваў, пачалося выдзяленне ўчасткаў. Пакуль у наяўнасці 400 участкаў, аднак праектуюцца новыя мікрараёны і ў перспектыве людзі, якія хочуць палепшыць свае жыллёвыя ўмовы шляхам будаўніцтва індывідуальнага дома, атрымаюць яшчэ каля дзвюх тысяч участкаў.

А вось элітных шматпавярховікаў, з больш высокімі спажывецкімі якасцямі, у абласным цэнтры цяпер не будуюць. Прадаваць на аўкцыёнах зямлю пад такія дамы гарадскія ўлады пакуль неабходнасці не бачаць, улічваючы вялікую жыллёвую чаргу і тое, што камерцыйнае жыллё на сёння прыкладна ўдвая даражэйшае. Што ж датычыцца кошту будаўніцтва ў ЖБК, то, згодна з інфармацыяй намесніка начальніка ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Гродзенскага гарвыканкама Віктара Старацiторава, лічбы па выніках пяці месяцаў сёлета наступныя: адзін квадратны метр у дамах з цэглы і газасілікатных блокаў — да 1 мільёна 300 тысяч рублёў, у буйнапанэльных дамах — прыкладна на 100 тысяч рублёў танней.

Пры гэтым, зразумела, жыллёвае будаўніцтва лагічна разглядаць і з пункту гледжання антыкрызіснай эканомікі.

— Ад будаўніцтва самым непасрэдным чынам залежаць і многія іншыя вытворчыя сферы, — лічыць Аляксандр Цыбульнікаў. — За жыллём «цягнуцца» дарогі, крамы, іншая інфраструктура мікрараёнаў, людзі купляюць мэблю, электраабсталяванне, сантэхніку, апрацоўчыя матэрыялы...

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Дыскусійная трыбуна

«Беларускі» = «якасны»

Што зрабіць, каб так было заўсёды?

— Калі б вобраз беларускіх малочных прадуктаў быў бы цалкам выбудаваны ў Расіі, калі б усе расіяне ведалі, што беларускія малочныя прадукты — гэта здарова, цудоўна і карысна, то тады б так лёгка малочны скандал не адбыўся, — сказаў **Аляксей СУХЕНКА, кіраўнік расійскага прадстаўніцтва і партнёр Trout&Partners, кансультант па брэндзінгу і маркетынгавых камунікацыях на II Адкрытым форуме маркетолагаў у Мінску**. — Вельмі многія простыя расіяне пачалі б пісаць і абурацца, што зніклі малочныя прадукты. А так, колькі я працаваў з малочнымі фірмамі, большая частка іх спажыўцоў і не ведаюць, што любімае іх малако — беларускі прадукт. Тут, на форуме, ужо казалі да мяне, што нібыта беларускі абутак, беларуская мэбля і гэтак далей — гэта заўсёды якасць. Не, насамрэч гэта — перш за ўсё нізкая цана. Вось па што думаюць у першую чаргу расіяне, калі бачаць слова «беларускі» — што там нізкая цана. І гэта тое, што трэба выпраўляць.

Аляксей Сухенка лічыць, што беларускім прадпрыемствам неабходна выбудоўваць стратэгіі бізнэсу і надаваць больш увагі маркетынгу як інструменту гэтых стратэгій:

— Есць стэрэатыпы, якія зараз глухнуць. Напрыклад, той жа імідж малочных прадуктаў вельмі лёгка падняць, але пра гэта проста ніхто не нагадвае расіянам. Памылкова лічыць, што ўсе і так ведаюць пра добрую якасць беларускіх малочных прадуктаў. Можа хто і ведае, але трэба «пракачваць мазгі»... Ну добра, малако — гэта адно, а вось пра машынабудаванне — напрыклад, многія ўжо забываюцца, што Беларусь — высокаіндустрыйная дзяржава. Што там у Беларусі? Лес, Белавежская пушча... Ну так, трактар «Беларус», «БелАЗ»... Але вельмі многія лічаць, што гэта была зборачная пляцоўка, дзе няма нічога свайго...

На тым жа II Адкрытым форуме маркетолагаў цікавую тэму ўзняў **Андрэй КАЛЯДА, дырэктар маркетынгавай кампаніі «Indecom»** — пра асаблівасці нашага менталітэту:

— Я прыйшоў да цікавай высновы, што ў Беларусі, Расіі, ва Украіне лідарства па выдатках немагчыма, немагчыма таму, што мы такімі нарадзіліся, у нас закладзена такая ментальнасць. Мой кансалтынгавы вопыт працы з кліентамі падказвае, што з павелічэннем маштабу бізнэсу, з павелічэннем продажаў заўсёды падае якасць. Банальны прыклад : з'яўляюцца ў краме новыя семачкі. Купляеш у першы дзень — усё нармальна, рукі чыстыя. Купляеш праз месяц — рукі чорныя ад іх. Чаму ж так адбываецца?..

Прычыны Андрэй Каляда бачыць нават на моўным узроўні:

— Няма адэкватнага перакладу слова «performance» на рускую мову кароткім выразам. Сапраўднае значэнне яго — гэта калі ты прыйшоў на працу, працуеш там, працуеш добра, прычым пастаянна добра, а не так, што тыдзень добра, пакуль план не выканаў, а там можна і расслабіцца. І галоўнае, што ты павінен працаваць добра не толькі тады, калі цябе падганяюць зверху, а пастаянна. Вось гэта — «performance». Калі верыць, што мова — люстэрка душы, то мы дэманструем сваю недастатковую здольнасць працаваць і працаваць бездакорна нават на моўным узроўні. Я лічу, што пры астатніх роўных паказчыках з еўрапейскім бізнэсам у нас цяжка атрымаецца стабільны ўзровень якасці. У рускіх, беларусаў, украінцаў, палякаў ментальнасць іншая, у нас не «performance», а «achievement» — дасягненне. Мы дасягальны народ. Напрыклад, выйшлі ў космас таму, што стаяла задача выйсці першымі. Гістарычны факт, што па вытворчай эфектыўнасці СССР быў на другім месцы пасля ЗША, аднак калі мы дажылі да 80-х гадоў і ўбачылі, што паабяцанага камунізму няма, мы спыніліся. Такіх прыкладаў — шмат. Дарэчы, і ў Вялікую Айчынную вайну мы ў многім перамаглі, на маю думку таму, што немцы проста ваявалі, а ў нас была мэта — дайсці да Берліна, перамагчы...

Карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся ў Андрэя Каляды, што ж рабіць з нашым менталітэтам:

— Па-першае, трэба пастаянна ставіць мэты, прычым не доўгатэрміновыя, а кароткія, але якія будуць узаемазвязаныя з доўгімі. Па-другое, трэба праводзіць селекцыю кадраў, бо гаворка ішла пра сярэднестатыстычнага чалавека, а ёсць жа людзі больш адказныя, ёсць — менш. І па-трэцяе, трэба мяняць маркетынгавую стратэгію — прадаваць дорага, каб у нас былі рэсурсы, у тым ліку і фінансавыя, каб ажыццяўляць першае і другое, ну а калі казаць прасцей, то трэба прадавацца даражэй, каб мець грошы і час на выпраўленне якасці.

— А хто купіць, калі будзе дорага?

— Вы не паверыце, нават у час крызісу дарагія тавары прадаюцца. Чаму не прадаюцца беларускія дарагія тавары? Таму што мы не ўмеем іх прадаваць. Правільна сказалі сёння, што думаць, быццам усе нашы тавары ўспрымаюцца як якасныя — гэта самападман. Бо мы ўвесь час прадаём танныя тавары. Паглядзіце, у нас і на ўзроўні дзяржавы заўсёды кажуць, што тавары павінны быць таннымі. Гэта няправільна, бо на Захадзе дарагія тавары, але яны прадаюцца лепей, чым беларускія, бо забяспечаныя маркетынгам.

— У сваім выступленні вы казалі, што лягчэй кантраляваць тую ж якасць, і працу на малых прадпрыемствах нават пры нашым менталітэце. Дык мо Беларусі адмовіцца ад буйных заводаў і ісці па шляху развіцця малога бізнэсу?

— Ведаеце, гэта павінны быць паралельныя працэсы. Але малы бізнэс не з'яўляецца панацэяй, бо асноўную частку ВУП даюць буйныя прадпрыемствы. Калі, напрыклад, на нейкім з іх працуе, скажам, 20 тысяч чалавек, то яны ніколі не адкрыюць 20 тысяч малых прадпрыемстваў. Значная частка насельніцтва ў прынцыпе не схільная да прадпрымальніцтва, і гэта нармальна, яны павінны на кагосьці працаваць. Я ніколі не паверу, што малы бізнэс за 15—20 гадоў створыць столькі працоўных месцаў. Гэта паступовы працэс, на Захадзе ён ішоў стагоддзямі, а мы вунь 80 гадоў гэта «выразалі». Таму калі дзяржава не будзе падтрымліваць буйныя прадпрыемствы, то гэта будзе калапс. Іншая справа, што іх таксама трэба правільна падтрымліваць, а не заводзіць у тупік.

— А можа, мы як-небудзь з цягам часу пераламаем наш менталітэт?

— Не факт, што яго трэба пераломліваць. Калі б яго не было, мы б не выйгралі Вялікую Айчынную вайну. У медаля два бакі. Я ганаруся сваёй краінай, сваім дзедам, які ваяваў. Былі б мы немцамі — мы б прадулі. Трэба проста выкарыстоўваць іншыя механізмы. Мы спрабуем канкурыраваць з тымі ж немцамі нямецкімі інструментамі, не разумеючы, што гэта немагчыма. Трэба выйграваць пры дапамозе дыферэнцыяцыі, на ўзроўні эмоцый. Беларусы, рускія, украінцы ў большай ступені робяць эмацыянальныя пакупкі, гэта маркетынг, а мы спрабуем прадаваць рацыянальна — пры дапамозе цаны. Наш менталітэт класны, ён у пікавых сітуацыях выратоўвае краіну, проста не трэба капіраваць нешта ў немцаў, трэба правільна выкарыстоўваць сваё.

Павел БЕРАСНЕЎ.

КАМАРОЎКА АДКРЫВАЕ СЕЗОН

Найбуйнейшы харчовы рынак робіць апраўданую стаўку на перспектыўнае развіццё

Кожны дзень нашага вірлівага жыцця мае свае адметнасці. Нярэдка здараецца, што іх з цягам часу амаль зусім не заўважаеш. Нездарма ж кажуць, што да добрага прывыкаеш хутка. Такое меркаванне без усялякіх перабольшванняў можна аднесці да гандлю. Цяпер ужо нават і не верыцца, што калісьці адпаведнага сэрвісу практычна не было. Варта ўзгадаць хіба толькі чэргі і паўсюдны таварны дэфіцыт. Фарміраванне айчыннай гандлёвай сістэмы ва ўмовах рынкавых сацыяльна-эканамічных адносінаў адбывалася не без цяжкасцяў.

За гады такога даволі жорсткага працэсу многія прадпрыемствы проста «сышлі з дыстанцыі», не здолелі адаптавацца да новай мадэлі гаспадарання. Імклівыя змены праходзілі літаральна ў нас на вачах. Прычым шмат у чым гэта былі станоўчыя змены — гандлёвыя прадпрыемствы выйшлі на сучасны ўзровень. Яно і зразумела: у сённяшніх умовах інакш не выжывеш. Цяпер важна быць універсальным і задавольваць самыя разнастайныя патрабаванні спажыўцоў. У людзей з'явілася магчымасць выбару, таму чалавек безумоўна аддае перавагу лепшаму і «галасуе» ўласнымі грашыма.

Гэта ўжо не гады дэфіцыту і чэргаў, калі сэрвіс, арганізацыя абслугоўвання ўспрымаліся як другасная справа. Сёння колькасць прапаноў у шэрагу выпадкаў значна перавышае попыт. Адпаведна, узрастае канкурэнцыя сярод прадпрыемстваў, якія працуюць на рынку. Пры гэтым асноўная задача — не толькі прывабіць пакупніка шырокім асартыментам, добразычлівым абслугоўваннем, сучаснымі ўмовамі, належнымі суадносінамі цэнавага фактару і якасці прадукцыі, але і стварыць кола спажыўцоў, якія арыентуюцца менавіта на канкрэтнае гандлёвае прадпрыемства. Толькі ў такім разе можна не згубіць свае пазіцыі, а, наадварот, мець перспектыву, упэўненасць у заўтрашнім дні, пашыраць сваю гандлёвую нішу.

Новы змест цяпер набывае і работа рынкаў. Гэта ўжо зусім не тыя традыцыйныя «кірмашы», якімі доўгі час іх прывыклі бачыць. Зараз буйныя рынкі без усялякага перабольшвання можна аднесці да катэгорыі гандлёвых цэнтраў. Праўда, пры гэтым лепшыя з адпаведных прадпрыемстваў здолелі захаваць сваю адметнасць — скіраванасць на тое, каб найбольш (і, зразумела, найлепш) забяспечваць інтарэсы дбайных гаспадароў — вытворцаў і перапрацоўшчыкаў сельскагаспадарчай прадукцыі, а таксама прыватнікаў, якія займаюцца рэалізацыяй запатрабаваных спажыўцамі смачных тавараў. Напрамую гэта датычыцца найбуйнейшага айчыннага харчовага рынку — Камароўскага. Размешчаны ён у гістарычнай частцы горада і традыцыі мае вельмі моцныя. Цяпер тут не толькі шануюць мінуўшчыну і ўпэўнена адчуваюць сябе ў сённяшнім дні, але і будуюць вялікія планы на будучыню. Як жа справы ладзяцца, чым парадуе Камароўка сваіх пакупнікоў і шматлікіх дзелавых партнёраў? Каб даведацца аб усім гэтым, мы сустрэліся з ***дырэктарам гандлёвага камунальнага ўнітарнага прадпрыемства «Мінскі Камароўскі рынак» Станіславам ІОДЗІСАМ****.*

Начальнік аддзела сацыяльнага развіцця Таццяна СУХАРУКАВА з ветэранам вайны і працы Сяргеем КРУПНОВЫМ.

«Прыярытэт — за вытворцам»

— Станіслаў Антонавіч, пачнём адразу з таго, што, вядома, хвалюе многіх нашых чытачоў (сярод якіх шмат людзей, якія робяць пакупкі на Камароўцы, самі тут гандлююць): наколькі падрыхтаваны рынак да чарговага масавага «садавінна-агародніннага» сезона? Якія сёлета адметнасці?

— Сапраўды, можна з упэўненасцю сказаць аб тым, што сезон-2009 распачаўся. У маі актыўна ішла рэалізацыя расады, а цяпер пачалася пара агуркоў, клубніц, а пасля капусты, памідораў, бульбы і ўсёй садавіны і агародніны, якую людзі вырошчваюць. Для нас гэта надзвычай адказны час, да якога, зразумела, рыхтуемся загадзя. Правялі вялікую комплексную ўборку ўсёй тэрыторыі — і крытай часткі, і сезоннага рынку. Бягучы рамонт адбываецца ўвесь час, па меры неабходнасці. Неабходна трымаць адпаведны ўзровень, паколькі адчуваем вялікую адказнасць. Камароўскі рынак — гэта ўжо вядомы брэнд, таму тут нельга не тое што саступаць іншым, але і нават губляць пэўную дынаміку ў развіцці. Час бяжыць вельмі хутка і таму калі нават крыху замарудзіць вырашэнне той ці іншай справы, то гэта можа прывесці да непажаданых наступстваў.

Тое ж і з сезонам масавай рэалізацыі людзьмі садавіны і агародніны. Калі мы імкнёмся да таго, каб адпавядаць сучаснаму ўзроўню, то павінны былі пралічыць, як найлепшым чынам арганізаваць у гэты час гандаль. Раней даводзілася дадаткова выстаўляць некалькі радоў прыстаўных сталоў, паколькі інакш нельга было размясціць усіх людзей, якія прыязджалі рэалізоўваць прадукцыю. У гэтай частцы мы да сезона зрабілі спецыяльныя навесы і такім чынам атрымалася каля 120 дадатковых гандлёвых месцаў, абсталяваных так, каб усім было зручна і камфортна — як пакупнікам, так і прадаўцам. Такі крок аказаўся апраўданым і ўжо цяпер гэта відавочна.

— Гандлёвыя месцы бранiруюцца загадзя альбо існуюць і варыянты больш прыбліжаныя па часе да сезона...

— Галоўны наш прыярытэт — задавальненне патрэб вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі. Зразумела, перш за ўсё перавага захоўваецца менавіта за гаспадарамі прысядзібных участкаў. Камароўка была і застаецца менавіта рынкам для людзей, а не аптова-рознічнай базай (хоць мы не адмаўляемся і ад сучасных варыянтаў арганізацыі гандлю). Раней была практыка своеасаблівай «броні», аднак такая схема не зусім сябе апраўдала. Для таго, каб не падымаць ажыятажу, не ствараць нейкіх хваляванняў, мы пачалі рэгістрацыю па меры паступлення заяў, недзе за месяц. Цікава, што ў многіх ёсць канкрэтныя месцы, якія яны нават спецыяльна замаўляюць. Гэта асаблівасці рынку: кожны руплівы прадавец за пэўны час фарміруе кола пакупнікоў, якія прыходзяць менавіта да яго. Людзі вельмі хутка знаходзяць для сябе аптымальныя суадносіны кошту і якасці, а таксама прымальнага абслугоўвання.

— А ці ёсць у Камароўскага рынку ўвогуле пэўнае кола пастаянных пакупнікоў?

— Вядома ж, ёсць тыя людзі, якія заўсёды ходзяць менавіта на Камароўку. Мы імкнёмся да таго, каб з цягам часу колькасць такіх пастаянных спажыўцоў не змяншалася, а наадварот павялічвалася. Гэта стратэгічная задача кожнага гандлёвага прадпрыемства. І ў Камароўкі тут ёсць свае неаспрэчныя перавагі. Стаўка робіцца толькі на разнастайны, самы шырокі асартымент. Гэта датычыцца ўсіх тавараных пазіцый харчовай групы. Мы цудоўна разумеем: каб да нас ішоў пакупнік, то трэба яго магчымы попыт задаволіць у поўнай меры. На рынку сёння можна знайсці тое, чаго няма ў самых сучасных гіпермаркетах, не кажучы ўжо пра «стандартныя» крамы. Рынак павінен быць універсальным гандлёвым прадпрыемствам. Менавіта гэта самы прадукцыйны шлях, а паколькі мы робім стаўку на перспектыўнае развіццё, то не павінны з яго збочваць.

Для пакупніка вельмі зручна, калі ў адным месцы можна набыць усё неабходнае. І самае галоўнае, што на Камароўскім рынку такі выбар ёсць. У нас прапануецца літаральна ўвесь магчымы асартымент, які выпускаецца адпаведнымі вытворцамі. Вельмі шырока прадстаўлены айчынныя прадпрыемствы-перапрацоўшчыкі. У нас скаліся доўгатэрміновыя дзелавыя адносіны з беларускімі вытворцамі харчовай прадукцыі з большасці рэгіёнаў нашай дзяржавы. Сярод іх — многія з малочных заводаў, мясакамбінатаў, камбінатаў хлебапрадуктаў і г.д. Яны асартымент належным чынам забяспечваюць, ды і якасць заўжды на ўзроўні.

Адэля САФАРАВА і Ганна ЯНУШКЕВІЧ вырошчваюць шмат духмяных і карысных раслін.

Кацярына СЕГЛЮК штогод вязе ў Мінск свае цудоўныя клубніцы з вёскі Ляскавічы Іванаўскага раёна, што на Брэстчыне.

Час таму мы разаслалі афіцыйныя лісты ўсім упраўленням гандлю аблвыканкамаў, дзе звярнулі ўвагу на тое, што ў рэгіянальных вытворцаў ёсць магчымасць наладзіць рэалізацыю сваёй прадукцыі на Камароўскім рынку. Гэты зварот атрымаў актыўны водгук — прадпрыемствы пачалі гандляваць. Праўда, не ва ўсіх удалося паспяхова замацавацца. А ў асобных справы пайшлі нядрэнна: прадпрыемствы ўзялі гандлёвыя месцы, павільёны і цяпер туды шмат пакупнікоў прыходзіць. Нават чэргі можна заўважыць — гэта па сённяшніх мерках добры знак. Значыць, людзям падабаецца прадукцыя менавіта гэтых вытворцаў. Вось гэта вынік нармальнай канкурэнцыі.

Як я ўжо заўважыў, мы актыўна супрацоўнічаем з айчыннымі вытворцамі — сваю прадукцыю пакупнікам прапануюць дзясяткі прадпрыемстваў, так што выбраць заўжды ёсць з чаго. Але ж мы ніколькі не перашкаджаем рэалізацыі тавараў замежнай вытворчасці. Забяспечваюцца літаральна ўсе магчымыя патрабаванні нашых спажыўцоў. Прыватнікі, якія працуюць на рынку, заўсёды зыходзяць менавіта з попыту, з таго, што людзі актыўна набываюць. Менавіта такім чынам і складаецца асартымент. Атрымліваецца, што менавіта ад пакупніцкага попыту напрамую залежыць прапанова. Гэтая вядомая аксіёма знаходзіць сваё пацвярджэнне на практыцы.

«Пакупнік заўсёды ў выйгрышы»

— Станіслаў Антонавіч, ці не атрымліваецца ўсё ж такім чынам, што Камароўка ў большасці выпадкаў застаецца толькі рынкам для сталічных вытворцаў, якім даволі зручна без вялікіх перавозак рэалізоўваць сваю прадукцыю?

— Паверце, усе вытворцы ў нас у аднолькавых умовах і ніхто не падзяляецца па «месцы прапіскі». Неабходна на роўных канкураваць, а лепшага, у рэшце рэшт, вызначае менавіта пакупнік. Павінна быць менавіта так, а не інакш. Пэўны рэсурс тут мае значна абмежаваныя магчымасці.

На Камароўскім рынку штодзённа праводзіцца маніторынг цэнаў па большасці пазіцый. Кожны тыдзень параўноўваем адпаведныя паказчыкі з шэрагам буйных сталічных харчовых рынкаў і гіпермаркетамі. Павінен з усёй адказнасцю заўважыць: па цэнах Камароўка заўжды адрозніваецца ў лепшы бок, таму калі хочаце зэканоміць — калі ласка, завітайце. У нас пакупнік заўсёды ў выйгрышы.

— Гаспадары прысядзібных участкаў без усялякіх перашкод могуць рэалізаваць на Камароўцы вырашчаную прадукцыю. Гэта, вядома ж, надзвычай важна, паколькі рэалізацыя — надзённая праблема. Але ж стаяць доўгі час на рынку не кожны здолее. Магчыма, тут існуюць іншыя, больш хуткія варыянты?

— Ужо даўно заўважана — на працягу дня на сезонным рынку наплыў гандляроў адбываецца быццам бы хвалямі. Часта такі рух залежыць ад раскладу электрычак: людзі прывозяць на рынак вырашчаную прадукцыю альбо сабраныя ў лесе грыбы і ягады. Сярод іх вялікая колькасць пенсіянераў, для якіх асабліва важны гэты дадатковы даход, што яны атрымліваюць ад продажу прадукцыі. У шэрагу выпадкаў аб'ёмы невялікія — сама больш мех ці некалькі вёдзер. Калі чалавек мяркуе рэалізаваць прывезеную прадукцыю на Камароўскім рынку самастойна, то ўсё наладжана так, каб аператыўна размясціць яго належным чынам. Значным попытам карыстаюцца прапановы бюро гандлёвых паслуг — адпаведнае падраздзяленне арганізавана на рынку. Чалавек можа здаць прадукцыю і адразу ж атрымаць за яе грошы. Так што стаяць на рынку ўвогуле не спатрэбіцца. А прадукцыя тут жа выстаўляецца на продаж, прычым па вельмі прымальнай цане, праз уласную рознічную сетку рынку.

— Такім чынам, Камароўскі рынак актыўна развівае ўласны рознічны гандаль, чаго няма ў адпаведных прадпрыемствах. Навошта займацца такой даволі клапотнай справай?

— Згодны, справа даволі клапотная, аднак займацца ёй неабходна. Зразумела, для таго, каб арганізаваць уласную гандлёвую сетку, спатрэбілася пэўным чынам павялічваць штат. Аднак гэта — новыя працоўныя месцы, арганізацыя занятасці людзей. У сённяшніх умовах адпаведнае пытанне з разраду стратэгічных. Менавіта такі павінен быць дзяржаўны падыход. Але галоўнае, што ўдалося вырашыць праз арганізацыю ўласнага рознічнага гандлю, — стымулянне аб'ектыўнага цэнаўтварэння, рэгуляванне цэнаў.

— А як гэта адбываецца на практыцы?

— Нічога звышнатуральнага тут няма. Мы сваёй прапановай фарміруем ніжнія цэны на шэраг таварных пазіцый. Прывяду канкрэтныя прыклады. Летась дамовіліся з адной з фермерскіх гаспадарак на пастаўку агуркоў. Кошт агуркоў у нашых гандлёвых пунктах быў практычна напалову ніжэйшым, чым у сярэднім па рынку. Зразумела, людзі выстройваліся ў чэргі за таннай прадукцыяй, а на суседніх месцах — «зацішак». Таму многія з гандляроў сур'ёзна задумаліся над тым, па якой цане выстаўляць прадукцыю, каб яе рэалізаваць. Так што ўласны рознічны гандаль — значны фактар стымулявання, кантролю за цэнамі. Дарэчы, адміністрацыйны кантралёрамі. Дакладна адпрацавалі пытанні належнай арганізацыі гандлю, каб забяспечыць камфортныя ўмовы як пакупнікам, так і гандлярам. Дарэчы, для таго, каб належным чынам арганізаваць гандаль, цяпер у некаторай ступені мы змянілі рэжым работы адміністратараў і ўрачоў ветлабараторыі. Рынак працуе з 9 да 19 гадзін, пры неабходнасці можа быць прадоўжаны час працы сезоннага рынку (мы разглядалі такую магчымасць).

Знатныя венікі і жбанкі ад Андрэя ВІКТОРЧЫКА.

— А наконт уласнай сельгасвытворчасці планаў няма?

— Некалькі гадоў таму ў Камароўскага рынку з'явілася сельскагаспадарчае структурнае падраздзяленне. Мы інвестуем сродкі ў сельгаспрадпрыемства «Узлянка» Мядзельскага раёна. Рэфармаванне праходзіць даволі паспяхова — аднаўляецца вытворчая база, забяспечваем работнікаў жыллём. У людзей стабільны заробак і, самае галоўнае, — з'явілася ўпэўненасць у будучыні, перспектыва. Таму сюды на працу ўладкоўваюцца не толькі мясцовыя жыхары, ужо прыехала некалькі сем'яў, прычым адна з іх — з Магілёўскай вобласці. Цяпер мы сур'ёзна аднаўляем вытворчую базу, каб забяспечыць выкананне паказчыкаў па развіцці жывёлагадоўлі і раслінаводства. А ў далейшым, напэўна, можна будзе ўшчыльную падысці да таго, каб забяспечваць прадукцыяй уласны рознічны гандаль Камароўскага рынку. Такі падыход апраўданы, паколькі ў выніку атрымаецца замкнёны вытворчы цыкл: ад вытворчасці — да рэалізацыі. Нашым пакупнікам гэта будзе толькі на карысць.

«Якасць — заўжды на ўзроўні»

— Найважнейшы момант — забеспячэнне належнай якасці прадукцыі. А ў дачыненні да харчовых тавараў гэта адна з надзённых праблем. Як яна вырашаецца?

— Забеспячэнне якасці прадукцыі — адна з найважнейшых задач, вырашэнню якой мы надаём значную ўвагу. Па вялікім рахунку, гаворка ідзе пра аўтарытэт, імідж рынку. Пакупнік павінен быць упэўнены, што ў нас ён набудзе менавіта якасную прадукцыю, што гандляр не падмане кліента. Калі не падыходзіць да арганізацыі кантролю з усёй сур'ёзнасцю, то і гарантаваць адпаведны ўзровень абслугоўвання даволі складана. На Камароўскім рынку дзейнічае адна з найбольш моцна абсталяваных (сярод адпаведных прадпрыемстваў) ветэрынарных лабараторый. Тут працуюць 36 супрацоўнікаў — прафесійная каманда, якая кантралюе якасць усёй прадукцыі, у тым ліку і той, якая вырабляецца на прадпрыемствах. Контроль праводзіцца па шэрагу паказчыкаў. Гэта галоўная ўмова допуску на рынак. Арганізавана шматузроўневая сістэма кантролю. Працуе санітарная служба, таксама пэўным чынам арыентуем адміністратараў рынку. За кожным з адпаведных работнікаў замацаваны пэўны сектар і на працягу дня яны адсочваюць выкананне паказчыкаў па якасці прадукцыі. У гэтым плане мы жорстка падыходзім да парушальнікаў — аж да пазбаўлення гандлёвага месца.

Перад пачаткам чарговага сезона праведзены залікі з усімі адміністратарамі, а таксама з

ды на «стыхійных» рынках, каля шашы. На Камароўцы вы можаце быць упэўнены ў якасці (заўсёды можна і неабходна патрабаваць у прадаўца належныя паперы, якія выдае лабараторыя). Калі ўзнікаюць тыя ці іншыя спрэчныя пытанні, то заўжды звяртайцеся да кантралёраў. А ў падазроных месцах чысціню прадукцыі ніхто не гарантуе. Так што будзьце пільнымі.

«Неабходна падкрэсліць сваю адметнасць»

— Дарэчы, пра гандляроў. Даволі актуальным у пачатку гэтага года было пытанне наконт арэндnай платы. Як развівалася сітуацыя на Камароўскім рынку?

— Нармальна развівалася сітуацыя — проста неабходна заўсёды належным чынам працаваць з людзьмі, імкнуцца знайсці аптымальнае рашэнне актуальных праблем. Мы надзвычай сур'ёзна і ўзважана падышлі да вызначэння ставак арэнднай платы за гандлёвае месца. Прычым каэфіцыент напрамую залежыць ад яго размяшчэння. Каб знівеліраваць агульнае павелічэнне расцэнак, мы зменшылі плату за эксплуатацыйныя паслугі. Значную ўвагу надаём вырашэнню надзённых пытанняў гандлёвых работнікаў. Зрабілі кабінкі для пераапранання, у падвале правялі рэканструкцыю і абсталявалі асобныя кантэйнеры. Такая прапанова карыстаецца вялікім попытам сярод прыватнікаў. Прадаўцы заўсёды могуць замовіць гарачы абед у вакуумнай упакоўцы, які дастаўляецца прама на гандлёвае месца. На працягу дня па тэрыторыі рынку рэгулярна рухаюцца чатыры перасоўныя цялежкі, на якіх развозяць чай, каву, бутэрброды. Падсілкавацца таксама можна і ў павільёнах, якія размешчаны як у крытай частцы, так і на сезонным рынку.

Цяпер мяняем халадзільныя вітрыны. Раней адпаведнае абсталяванне закуплялі і ўсталёўвалі на рынку за ўласныя сродкі прыватнікі, якія тут гандлявалі. Гэта было даволі нязручна, паколькі абслугоўванне і рамонт (калі ўзнікала такая неабходнасць) прыходзілася таксама забяспечваць самастойна. Ды і халадзільныя вітрыны не ўсе былі аднолькавыя, што пэўным чынам псавала агульны выгляд гандлёвай залы. Цяпер сітуацыя змяняецца да лепшага: мы забяспечваем сэрвіснае абслугоўванне халадзільнага абсталявання, паляпшаецца і знешні выгляд. Як бачым, выгада — узаемная. Напэўна, такія сапраўды партнёрскія адносіны належным чынам ацанілі прыватнікі. Сёлета ў нас не толькі не зменшылася, а нават на 15 працэнтаў узрасла запаўняльнасць гандлёвых месцаў. Так што становішча даволі ўстойлівае, са станоўчымі перспектывамі на будучыню.

— Камароўка была і застаецца не толькі проста рынкам, не трэба забываць пра тое, што гэта гістарычны цэнтр Мінска. Таму само месца вельмі адметнае. Апошнім часам праведзена грунтоўнае добраўпарадкаванне, змяніўся выгляд плошчы, куды людзі прыходзяць адпачываць сем'ямі, разам з дзецьмі. Магчыма, разам з арганізацыяй сучаснага гандлю варта больш актыўна развіваць і менавіта інфраструктуру для адпачынку. Няўжо не скарыстаецеся такой магчымасцю?

— Зусім нядаўна пасля рэканструкцыі пачала працаваць вялікая кавярня — з добрай кухняй, дзе людзям можна камфортна адпачыць, пакаштаваць смачныя стравы. Тут магчыма правесці ўрачыстасці, карпаратыўныя мерапрыемствы. Карацей кажучы, гэта ўжо зусім не тая ўстанова, што была раней. Цяпер на рэканструкцыю закрыта сталоўка, на базе якой плануем зрабіць бістро. Ужо атрымаецца цэлы комплекс для адпачынку. У перспектыве мяркуецца таксама адкрыць дзіцячы малочны бар, а таксама пабудаваць вялікі сучасны рэстаран з відам на рынкавую плошчу.

Распрацаваны план мадэрнізацыі ўсяго рынкавага комплексу. Пасля выканання адпаведных работ (плануецца прымяніць унікальныя архітэктурныя рашэнні) Камароўка набудзе зусім іншы, самы сучасны выгляд. Паколькі мы знаходзімся ў такім адметным гістарычным месцы, то варта падкрэсліць сваю адметнасць.

Захар БУРАК,
Алена ДАЎЖАНОК.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.
УНП 100150586.



Якасць і бяспеку прадукцыі не толькі арандатары, але і кожны ахвотны можа праверыць у лабараторыі, што працуе на рынку.

Новыя навесы над бульбянымі і расаднымі радамі.

Сезон клубніц у разгары.

Таксама асаблівая ўвага надаецца кантролю за якасцю «дароў лесу». Дарэчы, ягады і грыбы ў нашай лабараторыі за невялікую плату можа праверыць кожны. Што надзвычай важна, паколькі нават з аднаго лесу можна сабраць як чыстую, так і забруджаную прадукцыю. Ад гэтага ніхто не застрахаваны. Тым больш апасайцеся набываць грыбы і яга-

Афіцыянтка Наталля БАЛАШКА рада наведвальнікам адноўленай кавярні «Любавушка».

Муз-news

Праект «Жывы Гук On Line» адраджаецца

Некаторыя, мабыць, яшчэ памятаюць гэту яркую музычную акцыю: сумяшчэнне жывога канцэрта беларускіх выканаўцаў з адначасовай яго інтэрнэт-трансляцыяй. Тады на пляцоўцы інтэрнэт-кавярні «Саюз On Line» іграли N.R.M., «Крамбамбуля», «Нейра Дзюбель», «Гарадзкія». Па відавочных і шмат разоў абмеркаваных прычынах праект у выніку быў закрыты. І вось цяпер лідар «Гарадзкіх», рок-гітарыст Піт Паўлаў вырашыў успомніць былое — і ўгаварыў уладальнікаў той жа пляцоўкі адрадзіць канцэрты. 27 чэрвеня адбудзецца першы з іх, прычым у адноўленым фармаце — цяперашнія канцэрты будуць арыентаваныя не на выступленні вялікіх альтэрнатыўных «зорак», а на стварэнне асаблівай атмасферы: ніякіх уваходных білетаў, жывы гук, танцы і жывыя стасункі.

Ідэя Паўлава выклікала надзвычайны ажыятаж. На «нястрогі кастынг» для першага канцэрта заявіліся больш як 30 гуртоў — ад даволі паспяховых і раскручаных «Джамбібум», «Hair Peace Salon», «Open Space», «Дядюшкинсон», «Naka» да пачаткоўцаў. «Вызначыць сярод іх тых, хто адкрые першы канцэрт адноўленага праекта, даволі цяжка, — прызнаецца прэс-сакратар праекта Ганна Трубачова, — бо ўсе прэтэндэнты выконваюць зусім розную музыку, якую даволі складана спалучыць на адной сцэне». У сувязі з гэтым прыём заявак нават быў часова спынены — да 17 чэрвеня, але далей прэс-служба працягне прымаць запісы і інфармацыю аб гуртах. А канцэрт — першы і ўсе астатнія — як запэўніваюць арганізатары, абавязкова адбудзецца, і праект «Жывы Гук On Line» раз на месяц будзе збіраць прыхільнікаў беларускай альтэрнатыўнай музыкі.

Гурт «Дразды» звязаўся з мадэлямі

Удзельнікі гурта, якіх дагэтуль ніяк нельга было западозрыць у сувязі з гламурам, нядаўна ўмудрыліся правесці ноч аж з 8 мадэлямі. Праўда, як сцвярджаюць самі музыканты, усё гэта дзеля творчасці — здымаўся новы кліп «Драздоў» на песню «Дзяўчаты».

Да падбору дзяўчат музыканты падышлі адказна: праз інтэрнэт абвясцілі конкурс, і дзяўчаты не толькі з Беларусі, але такса-ма з Украіны, Расіі і нават Польшчы дасылалі свае фота і запісваліся на кастынг у Мінску. У выніку прыдзірлівыя «Дразды» адабралі восем найбольш абаяльных і прывабных дзяўчат — з тым, каб тыя сыгралі... жаночы склад гурта «Дразды». «Мы аддалі галоўныя ролі ў кліпе мадэлям: яны спявалі, танцавалі і гралі на музычных інструментах замест нас, — расказаў саліст «Драздоў» Віталь Карпанаў. — Атрымаўся як быццам жаночы варыянт гурта. Будзе, думаю, вельмі цікава і нечакана ўбачыць, як дзяўчаты спяваюць маім голасам!». Ахвярай гламуру палі традыцыйныя для гурта інструменты — баян і балалайка, замест іх дзяўчатам уручылі клавішныя, гітары і трубу. А чым завяршылася ноч з топ-мадэлямі, стане вядома ўжо вельмі хутка — напрыканцы чэрвеня кліп «Дзяўчаты» плануецца паказаць у эфіры беларускіх тэлеканалаў.

«Ляпіс Трубяцкой» даў мультымедыйны парад

«Парад-алле» — пад такой назвай выйшаў у Беларусі мультымедыйны бокс гурта. У яго ўвайшлі два дыскі: на адным — альбом «Маніфест» з чатырма бонус-трэкамі, на другім — першы ў гісторыі гурта DV-зборнік кліпаў, сярод якіх ёсць і некалькі эксклюзіўных.

Калі пра «Маніфест» двойчы казаць не трэба, то на бонус-трэках варта спыніцца асобна. Сярод іх песні «Чорна-белы дзень» і «Дзяржава», запісаныя ў Кіеве з гукапрадзюсарам Віталем Цялезіным, а таксама два рэміксы на песню «Капітал»: ад расійскага электроншчыка Ігара Удовіна і расійскага ж альт-рок-рэпера Noize Mc. Што да DVD, то ў зборнік трапілі 17 кліпаў гурта, пачынаючы ад «Ау» і «Ружачкі» да сучасных работ, у тым ліку кліп «Belarus Freedom» і версія кліпа «Маніфест», якія раней не выдаваліся. Адметным атрымалася і афармленне вокладкі, для якой «Ляпісы» ўвасобілі свой слоган «Касмічны цырк аўтсайдараў»: удзельнікі гурта зрабілі фотасесію ў цыркавой рэтра-стылістыцы — у вобразе асілкаў, волатаў, клоунаў і г.д. Унутры ж, пад вокладкай «Парад-алле», дадаткова знаходзяцца два плакаты з фотаздымкамі ўсіх музыкантаў.

Вядучая рубрыкі Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Аўтааматар

НА АЎТО Ў ВОДПУСК

ЦЯЖКА не пагадзіцца з тымі, хто сцвярджае, што апошнім часам свет становіцца «плоскім». Гэта значыць, што падарожжа, напрыклад, на іншы кантынент, на якое некалі патрабавалася месяцы і нават гады, можна ажыццявіць за некалькі гадзін ці хоць бы суткі. Аднак многія аўтааматары дагэтуль аддаюць перавагу падарожжам на любімым аўто, што сёння таксама дазваляе за абмежаваны прамежак часу пакрыць даволі сур'ёзныя адлегласці. Паездкі на аўтамабілі падчас водпуску на мора па-ранейшаму папулярныя ў беларусаў. Да пачуццяў вандроўніка напрамку ў апошнія гады дадаўся і заходні — экскурсійныя падарожжы ў Еўропу.

Натуральна, для такой паездкі трэба мець як мінімум спраўны аўтамабіль. Але гэта яшчэ не ўсё. Падчас доўгага падарожжа нават на камфортнай іншамарцы вадзіцель непазбежна стамляецца. А гэта ўжо небяспечна. Некаторыя даследаванні паказваюць, што сонны кіроўца можа быць такім жа небяспечным, як і п'яны. Таму прапануем вам шэсць парад, як не заснуць і захаваць пільнасць у доўгай дарозе. Аднак памятайце: калі вы моцна стаміліся, лепш за ўсё ўсё ж з'ехаць на абочыну і падрамаць. Не грэбуйце гэтай магчымасцю і беражыце сябе!

ШТО ПІЦЬ, КАБ НЕ СПАЦЬ

Ужыванне прадуктаў і напояў, якія ўтрымліваюць кафеін, — самы стары і праверан ы метад, які выкарыстоўваюць мільёны кіроўцаў. Натуральна, лепш чорную натуральную каву прыгатаваць самому дома і прыхапіць з сабой тэрмас. Аднак для тых, хто па нейкіх прычынах гэтага не зрабіў, існуюць прыдарожныя кавярні. Кава там не лепшага смаку і часта толькі растваральная, але і яна выконвае патрэбную нам функцыю. Вадзіцелю лепш заказаць двайную каву.

Акрамя ўласна кавы існуюць таблеткі з кафеінам. Не прымайце іх занадта часта, і абавязкова запівайце вялікай колькасцю вады.

РАЗМАЎЛЯЙЦЕ З ПАСАЖЫРАМ

Гэты метад здаецца цалкам відавочным, і менавіта ён з'яўляецца самым простым і самым танным спосабам не заснуць за рулём. Калі дарога доўгая, а вас у машыне двое, і пакуль адзін вядзе, іншы спіць, гэта можа стаць праблемай: не можа ж ваш напарнік адначасова і спаць, і размаўляць з вамі.

Некаторыя кіроўцы таму не спяць абодва: па-першае, такім чынам у любы час два чалавекі сочаць за дарогай, а па-другое, абодва ацэньваюць сваю стомленасць. Калі пасажыр стаміўся, верагодней за ўсё і кіроўца таксама, а значыць самы час спыніцца і адпачыць.

ЭЛЕКТРОННЫЯ СІГНАЛІЗАТАРЫ СТОМЛЕНАСЦІ

Не так даўно ў продажы сталі з'яўляцца маленькія прылады на батарэйках, падобныя на модныя Bluetooth-слухаўкі для мабільных тэлефонаў. Яны выдаюць рэзкі гук, калі вы пачынаеце дзяўбці носам.

У тэорыі гэта, вядома, добра, аднак на практыцы, калі вы ўжо засынаеце, гэта значыць, што час спыніцца прыйшоў ужо даўно. У любым выпадку, яшчэ адна мера засцярогі лішняй не стане. Нядрэнна было б такі сігналізатар убудоўваць у сапраўдныя Bluetooth-слухаўкі для тэлефонаў.

ЧАСЦЕЙ СПЫНЯЙЦЕСЯ НЕНАДОЎГА, КАБ РАЗМЯЦЦА І АДПАЧЫЦЬ

Зрабіце гэта сваёй звычкай — кожныя 150—200 км знайдзіце сабе падыходнае месца і спыніцеся. Размінайцеся, драміце, дыхайце свежым паветрам, нарэшце — увогуле, зрабіце нешта, што дапаможа вам камфортна праехаць наступныя 200 км.

У ЗША, напрыклад, большасць супермаркетаў Wal-Mart дазваляюць спыняцца на іх стаянках, каб трохі падрамаць. Часам проста здзіўляе, які эфект можа аказаць усяго 15-хвілінны сон, так што не забывайцеся рабіць перыядычныя прыпынкі для адпачынку.

ЗАВЯДЗІЦЕ САБЕ ДОБРУЮ АЎДЫЁТЭКУ

Доўгая дарога — выдатны выпадак, каб паслухаць аўдыёкніжкі, да прыкладу. Цікавая гісторыя лёгка можа прымусіць вас забыцца на сон. Не забывайце, зрэшты, пераключацца час ад часу на якую-небудзь музыку, каб узмацніць гэты эфект.

ВАЗЬМІЦЕ З САБОЙ ШТО-НЕБУДЗЬ ПАЖАВАЦЬ У ДАРОГУ

Некаторыя кіроўцы, напрыклад, проста грызуць звычайныя сланечнікавыя семачкі. Па-першае, ад іх і так цяжка адарвацца, аднойчы пачаўшы, а па-другое, яны дадуць няхітры занятак, які зменшыць уплыў манатоннай дарогі.

Можаце нават забіць двух зайцаў: існуе такая экзотыка, як семачкі з кафеінам! Яшчэ добра дапамагаюць кіслыя, цвёрдыя ледзяшы, якія доўга не растаюць. З такой цукеркай у роце заснуць проста нерэальна. Ну а аматарам здаровага ладу жыцця падыйдуць і звычайныя яблыкі.

Удачы на дарогах!

ЭКАНАВІНКА

Mitsubishi Motors Corporation абвясціла аб старце продажу электрамабіля «i MiEV» у Японіі напрыканцы лістапада.

Сярод пераваг навінкі: запас ходу без падзарадкі каля 160 кіламетраў, выдатная дынаміка (да 40—60 км/г аўтамабільчык разгоніцца на трэць хутчэй за бензінавыя аналагі), нізкія эксплуатацыйныя выдаткі (у 9 разоў меншыя на бензін для машын таго ж класа), максімальная хуткасць — 140 км/г.

На працягу года мяркуецца рэалізаваць 1400 такіх электрамабіляў. На колькі гэта ўдасца — пакажа час, бо пры ўсіх пералічаных плюсах экалагічны аўто мае і адзін даволі істотны мінус — кошт у 30 тысяч долараў.

VOLVO І HUMMER СТАНУЦЬ КІТАЙСКІМІ

Кітайская кампанія Geely Automotive падпісала папярэднюю дамову аб куплі маркі Volvo з канцэрнам Ford. Пра гэта паведамляе Chinadaily.com са спасылкай на мясцовае выданне National Business Daily. Афіцыйныя прадстаўнікі ўдзельнікаў здзелкі гэтую інфармацыю пакуль не каментуюць.

Паводле інфармацыі кітайскіх CMI, пасля афармлення куплі Geely плануе разгарнуць выпуск аўтамабіляў Volvo ў Кітаі. У прыватнасці, у горадзе Донггуан, правінцыя Ганджоу, будзе пабудаваны завод па вытворчасці красовера Volvo XC90, якія цяпер збіраюць у ЗША.

Сума здзелкі паміж Geely і Ford пакуль не называецца, аднак, паводле ацэнак экспертаў, амерыканскі канцэрн наўрад ці прадасць марку Volvo менш чым за тры мільярды долараў ЗША.

Раней паведамлялася, што кітайскім хуткім часам можа стаць яшчэ адзін вядомы сусветны брэнд — канцэрн GM пагадзіўся прадаць марку Hummer кампаніі Sichuan Tengzhong Heavy Industrial Machinery за 500 мільёнаў долараў ЗША.

Кірмаш

штотыднёвы рэкламны выпуск № 12 (612)

аддзел рэкламы
287-17-79
Рэквізіты для аплаты: р/р 3012210270016 у ААТ "Белінвестбанк" г.Мінска, код 739 УНН 100155376

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

ПРАДАЕЦЦА

❒ Зруб, новы, 5х5 м, ёсць матэрыялы для крокваў, цана па дамоўленасці.
Тэл.: 8 01772 53 926, 8 029 550 39 28.

❒ Дом 7х10,5 м, участак 9 сотак у г. Клецку, нядорага.
Тэл.: 8 029 357 80 15, 8 029 394 30 65.

❒ Дом з г/п у в. Мачулішча Камянецкага раёна, 40 км ад Брэста, нядорага.
Тэл. 8 01727 84 578.

❒ Два пакоі на агульнай кухні, прыватызаваныя ў Мінску, метро «Партызанская», $24 тыс.
Тэл. Вэлком 295 02 80.

❒ Хутар, участак 25 сотак, сад, тэлефон, у Слуцкім раёне.
Тэл. 8 09 378 48 46.

❒ Кватэра 2-пакаёвая, 46 кв. м у в. Станькава Дзяржынскага раёна, 40 км ад Мінска.
Тэл. 776 33 06.

❒ Палова дома ў Мінску, з усімі выгодамі.
Тэл. 8 029 354 78 55.

❒ Прадаю 1/3 долю 2-пакаёвай кватэры ў г. Рагачове (танна).
Тэл. 8 029 778 33 38.

❒ Мёд майскі да 100 кг (Ушацкі раён).
Тэл. МТС 516 12 93.

❒ Эл. пліта шклокерамічная «Гефест», новая.
Тэл.: 8 017 295 96 84, 8 029 115 56 99.

❒ Вясельная сукенка 50—52-га памеру з усімі ўпрыгажэннямі, касцюм-тройка 46-га, 50-га памераў, новыя, упрыгажэнне на вясельную машыну (магчымы пракат).
Тэл. 8 029 558 23 15.

❒ «Аўдзі-100» 1989 г.в., 1,8 мона, седан, ц/замок, сігналізацыя, ABS, люк, новыя шыны, выдатны стан, $3450, торг.
Тэл. 8 029 771 51 78.

❒ «Жыгулі», кап. рамонт рухавіка, на з/ч.
Тэл. 8 029 354 78 55.

❒ Драўляная скульптура для вашага інтэр'ера, экстэр'ера, сада, лазні, дзіцячай пляцоўкі.
Тэл. 8 029 701 54 99.

❒ Каляска інвалідная пакаёвая і прагулачная.
Тэл.: 8 01774 59 23, 8 044 754 06.

❒ Эл. рухавік, вал і стол да дрэваапрацоўчага станка, халадзільнік «Атлант» (г. Узда)
Тэл. 8 029 378 15 36.

❒ Рухавік Д-243, Д-37 да трактара Т-40 — усё пасля рамонту, плуг 3-корпусны, акучнік 5-корпусны, 1-2-корпусныя плугі.
Тэл. 8 029 772 73 37.

КУПЛЮ

❒ Новы зруб для дома, лазні.
Тэл.: 8 0172 24 997 70, 8 029 689 78 98.

❒ Дом да 80 км ад Мінска (электрычнасць, вада), да $5 тыс.
Тэл. 8 029 672 01 97.

❒ Дом на хутары ў Мінскай вобласці.
Тэл. 8 029 357 64 51.

РОЗНАЕ

❒ Здыму кватэру ў г. Дзяржынску ці Фаніпалі, для сям'і, на доўгі тэрмін.
Тэл. 8 044 768 20 39.

❒ Кансультацыя па будаўнічамантажных і аздабляльных работах.
Тэл. 8 029 761 87 25.

ЗВЯЗДА

КУПОН ДЛЯ БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБ'ЯВЫ

Запоўніце разборліва, выражце і вышліце на адрас рэдакцыі:

220013 Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10 А. Тэлефон для даведак 287 17 79.

АБАВЯЗКОВЫЯ звесткі не для друку: ВАША ПРОЗВІШЧА, АДРАС, ХАТНІ ТЭЛЕФОН.

Пашпарт, серыя_____ № _____ Выдадзены_____

_____

Подпіс_____ Дата_____

Усміхнёмся!

На чэмпіянаце свету па шашках перамог есаул Ануфрэнка — ад яго шашкі яшчэ ніхто не сыходзіў!

☺

— Мілая, я пакахаў цябе 10 кілаграмаў таму!

☺

— Я вынайшаў безалкагольную гарэлку!

— Ды будзь ты праклята!

☺

На Сіцыліі няма «Сведак Іеговы».

Сіцылійцы наогул не любяць ніякіх сведак...

23 чэрвеня

Дзве даты

1065 год — першае ўзгадванне (у летапісе Быхаўца і Хроніцы Мацея Стрыкоўскага) горада Браслава (Брячыславль, Брятислав). Браслаў — старажытнае славянскае паселішча, размешчанае на мяжы славянскіх і літоўскіх плямёнаў. Паводле некаторых звестак, горад заснаваны полацкім князем унукам Рагнеды Брачыславам Ізяславічам. У 1500 годзе Браслаў атрымаў магдэбургскае права. У 1792-м зацверджаны герб — на блакітным полі залатое сонца, у цэнтры якога блакітны трохкутнік з выявай чалавечага вока.

930 год — створаны самы стары з дзейных сёння парламентаў свету — ісландскі альтынг.

Цытата дня

«Хто паважае сябе — унушае пашану і іншым».

Люк дэ Вавенарг (1715—1747), французскі пісьменнік.

РЫТУАЛЬНАЕ АДЗЕННЕ СЯМЕЙНА-РОДАВЫХ АБРАДАЎ

Па сведчаннях гісторыкаў і этнографаў, яшчэ ў пачатку мінулага стагоддзя ў Беларусі людзей хавалі ў белым саване. Сёння, згодна з традыцыяй, памерлага пакрываюць палатном белага колеру (тканінай абсалютна чыстай, без слядоў людскога ўздзеяння; у свеце продкаў пачынаецца новы адлік часу). Як і шмат гадоў таму, сёння існуе святое правіла апранаць памерлага чалавека ў новае (чыстае) адзенне.

● Людзі сталага ўзросту самі рыхтавалі сабе адзенне «на смерць», у «дарогу». Яго маглі апрануць толькі аднойчы, каб наведаць храмавае набажэнства, асвяціць яго. Пасля гэтага адзенне хавалі «да часу».

● Адзенне (нацельную бялізну) і пасцель (прасціну і навалачку), у якім памірaў чалавек, пасля пахавання спальвалі, каб гэтыя рэчы не перадавалі адмоўную энергетыку жывым (узгадайце казку «аб жывой і мёртвай вадзе»).

● Іншымі рэчамі памерлага, у тым ліку і яго адзеннем, дазвалялася карыстацца толькі пасля таго, як пройдзе 40 дзён пасля яго смерці.

● Калі чалавек яшчэ пры жыцці прасіў апрануць яму ў выпадку смерці тую ці іншую рэч, яго жаданне неабходна было абавязкова выканаць.

● Памерлую незамужнюю дзяўчыну апраналі ў вясельны строй. Яна на працягу свайго зямнога жыцця не здолела выйсці замуж, таму ішла ў свет продкаў адвечнай нявестай у адпаведным убранні.

● У адзенні памерлага стараліся не дапускаць прысутнасць чырвонага колеру. Лічылася, што гэта можа пацягнуць за сабой яшчэ адну смерць «кроўнага» роднага або сваяка.

● Асобае стаўленне было да адзення дзіцяці ад моманту нараджэння і на працягу першага года жыцця. Як толькі малы з'яўляўся на свет, бабка-павітуха загортвала яго ў што-небудзь старое, зношанае, «сямейнае»: кашулю бацькі, адзенне старэйшых дзяцей — каб працягваў традыцыі бацькі, сям'і, роду, каб сябраваў са старэйшымі братамі або сёстрамі.

● Для хрышчэння дзіцяці апраналі новае (ці атрыманае ў спадчыну ад старэйшага дзіцяці) белае адзенне. Але зверху завязвалі чырвоны пояс.

● Імкнуліся, каб нацельны крыжык, які ўпершыню дадуць дзіцяці, быў на чырвоным матузку.

● Рэчы, якія насіла дзіця да года, ніколі не прадавалі і нікому з чужых не перадавалі: усё захоўвалася, як казалі старыя, для свайго роду-племені.

● Вялікае значэнне надавалі нашы продкі таму адзенню, у якое былі апрануты маладыя на працягу ўсяго вяселля. Абавязковая ўмова вясельнага адзення — новае. Бо пачынаецца новае жыццё хлопца і дзяўчыны. Нявеста магла выкарыстоўваць ў сваім строі некаторыя элементы вясельнага адзення сваёй матулі (напрыклад, вэлюм ці ніжнюю спадніцу і г.д.), але пры ўмове, што маці пражыла з бацькам разам не адзін дзясятак гадоў.

● Самая галоўная забарона для маладых: нікому не даваць прымяраць сваё вясельнае адзенне.

● Пасля вяселля надзейным абярэгам для дзяцей становіцца вэлюм, у якім матуля выходзіла замуж.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказвае глыбокае спачуванне дэпутату Палаты прадстаўнікоў трэцяга склікання Саламуху Пятру Іванавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — заўчаснай смерцю СЫНА.

Міністэрства інфармацыі выказвае глыбокае спачуванне дырэктару УП «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі» Бяловай Таццяне Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БРАТА.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» глыбока спачувае дырэктару УП «Выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя ім. П. Броўкі» Бяловай Таццяне Уладзіміраўне ў сувязі з напаткаўшым яе вялікім горам — смерцю БРАТА.

Міністэрства інфармацыі выказвае глыбокае спачуванне дырэктару УП «Віцебскаблсаюздрук» Южык Людміле Віктараўне ў сувязі з непапраўнай стратай — смерцю МАЦІ.

Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» выказвае глыбокае спачуванне дырэктару УП «Віцебскаблсаюздрук» Южык Людміле Віктараўне ў сувязі з непапраўнай стратай — смерцю МАЦІ.

Фонд «Минскоблгосимущество» (организатор аукциона)

23 июля 2009 года в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 проводит аукцион

по продаже объектов, находящихся в государственной собственности, и права заключения договоров аренды земельных участков для их обслуживания, которые составляют единые предметы аукциона

На аукционные торги выставляются:

Предмет аукциона, место нахождения недвижимого имущества	Начальная цена предмета аукциона, рублей Сумма задатка для участия в аукционе, рублей	Сведения о предмете аукциона
Лот № 1: Здание «Кормоцех, комплекс» (инв. № 600/С-106233), расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Хатежинский с/с	311 449 534 (в том числе: недвижимое имущество – 301 673 671 право аренды земельного участка – 9 775 863) сумма задатка – 30 000 000	Здание двухэтажное, фундамент ж/бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие железобетонное, крыша рулонная, полы бетонные. Год постройки – 1981. Общая площадь – 868,7 кв.м. Площадь земельного участка – 0,3136 га. Срок аренды земельного участка – 30 лет. Имеются ограничения в использовании земельного участка площадью 0,0347 га; 0,083 га – охранная зона линии электропередачи, напряжением свыше 10 000 в.
Лот № 2: Здание «Блок подсобных помещений» (инв. № 600/С-73630), расположенное по адресу: Минская область, Минский район, Хатежинский с/с, южнее д. Старое Село	17 239 696 (в том числе: недвижимое имущество – 8 997 646 право аренды земельного участка – 8 242 050 сумма задатка – 1 700 000	Здание одноэтажное, фундамент бетонный, стены и перегородки кирпичные, перекрытие — железобетонные плиты, крыша рулонная совмещенная, полы бетонные. Имеются инженерные коммуникации. Год постройки – 1971. Общая площадь – 133,4 кв.м. Площадь земельного участка – 0,2644 га. Срок аренды земельного участка – 30 лет. Имеются ограничения в использовании земельного участка площадью 0,056 га и 0,015 га – охранная зона линии электропередачи, напряжением свыше 10 000 в.
Условие аукциона: разрешить победителям аукциона (лоты № 1-2) в установленном порядке изменение назначения недвижимого имущества и использование земельных участков для строительства складских помещений		
Продавец: Учреждение «Республиканский центр олимпийской подготовки конного спорта и коневодства», расположенное по адресу: Минская область, Минский район, пос. Ратомка, ул. Корицкого, 136, тел. 502 20 50, 502 20 60 **Арендодатель земельного участка:** Минский районный исполнительный комитет		

Фотографии продаваемых объектов, а также информация об объявленном аукционе и предметах аукциона дополнительно размещается на сайте Минского облисполкома: **www. minsk-region. gov. by** в разделе «Управления и комитеты облисполкома» на странице: фонд «Минскоблгосимущество».

К участию в аукционных торгах допускаются: граждане, юридические лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, а также иностранные инвесторы (иностранные государства, объединения, международные организации, иностранные юридические лица, иностранные граждане, граждане Республики Беларусь, имеющие постоянное место жительство за границей, и лица без гражданства), представившие в фонд «Минскоблгосимущество» в сроки, указанные в извещении:

заявление на участие в аукционе по форме, утвержденной постановлением Государственного комитета по имуществу от 23 апреля 2008 г. № 29 «Об утверждении форм документов», к которому прилагаются следующие документы:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства – документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованная в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Не допускается одновременное участие в торгах по одному и тому же предмету аукциона следующих лиц: близких родственников, а также супругов и их близких родственников;

юридических лиц, в уставном фонде которых одно и то же юридическое или физическое лицо имеет долю в размере двадцати и более процентов;

юридических лиц, одно из которых в соответствии с законодательством признается дочерним или зависимым по отношению к другому.

ПОБЕДИТЕЛЬ ОБЯЗАН:

1. В течение 10 рабочих дней со дня принятия райисполкомом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона, а также расходы, связанные с формированием земельного участка, изменением и прекращением существования земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией создания земельного участка.

2. Внести плату, взимаемую за право заключения договора аренды земельного участка (рассрочка не предоставляется).

3. После совершения победителем аукциона действий, названных в пунктах 1, 2, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке Продавцом имущества заключается договор купли-продажи недвижимого имущества, а Арендодателем земельного участка — договор аренды земельного участка.

4. После заключения с райисполкомом договора аренды земельного участка в 2-месячный срок со дня даты принятия решения о передаче победителю земельного участка осуществить государственную регистрацию права на земельный участок.

5. По лотам № 1-2: в случае изменения назначения недвижимого имущества получить в установленном порядке разрешение Минского райисполкома на проведение проектно-изыскательских работ, разработать строительный проект на строительство объектов в срок, не превышающий двух лет, и осуществить строительство объектов в сроки, определенные проектно-сметной документацией.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже объектов государственной собственности и на право заключения договора аренды земельного участка для обслуживания недвижимого имущества, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену.

В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявка (заявление) на участие в нем подана только одним участником, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Фонд «Минскоблгосимущество» вправе отказаться от проведения аукциона (продажи конкретного предмета аукциона) в любое время, но не позднее чем за три дня до даты его проведения.

Сумма задатка перечисляется на расчетный счет фонда «Минскоблгосимущество» **№ 3642900000841 в ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Минске, код 795, ул. Мясникова, 32, УНН 100128686.**

Заявки на участие в аукционе принимаются ежедневно в рабочие дни с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 320, тел. 224 39 76, 500 47 10.** Последний день подачи заявок **21 июля 2009 г. до 17.00. Заключительная регистрация участников 23 июля 2009 г. с 10.00 до 10.50.** К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

Рэктар Віцебскай ордэна «Знак Пашаны» дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны Антон ЯТУСЕВІЧ:

«МЫ РЫХТУЕМ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ВЫСОКАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ»

Рэктар Антон ЯТУСЕВІЧ.

ЗНАЁМІМ З СУРАЗМОЎЦАМ

Ураджэнец Палесся (Пінскі раён Брэсцкчыны). Там жа закончыў сямігодку і з «чырвоным» дыпломам — мясцовы сельскагаспадарчы тэхнікум. Далейшая вучоба ў 1967—1972 гадах — у Віцебскім ветэрынарным інстытуце. І зноў — дыплом з адзнакай. Затым была праца ў славутым на тыя часы калгасе імя Чырвонай Арміі Віцебскага раёна галоўным ветэрынарным урачом і запрашэнне вярнуцца ў інстытут на выкладчыцкую работу.

Доктар ветэрынарных навук, прафесар Антон Іванавіч Ятусевіч у гэтай вышэйшай навучальнай установе быў і асістэнтам, і дацэнтам, і загадчыкам кафедры, і прарэктарам па вучэбнай рабоце, і сакратаром партыйнага камітэта. З 1998 года з'яўляецца рэктарам акадэміі, у якую інстытут быў пераўтвораны ў 1994 годзе. Аўтар 610 навуковых работ, у тым ліку 44 падручнікаў і манаграфій, 32 патэнтаў і рацпрапаноў. Пад яго навуковым кіраўніцтвам выкананы 22 кандыдацкія і доктарскія дысертацыі.

Узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі», ордэнам Пашаны. Яму прысвоена ганаровае званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь». Летась амерыканскі біяграфічны інстытут узнагародзіў яго спецыяльным залатым медалём. Ён — віцэ-прэзідэнт Міжнароднай асацыяцыі паразітацэнолагаў, член Савета па абароне дысертацый пры Санкт-Пецярбургскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны і Беларускім НДІ эксперыментальнай ветэрынарыі.

А. Ятусевіч з'яўляецца членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Ён — намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і сацыяльным развіцці.

— Антон Іванавіч, мы ведаем пра такі цікавы факт: уся ваша сям'я звязала свой лёс з ветэрынарыяй...

— Гэта ні для каго не з'яўляецца сакрэтам. Жонка Валянціна Пятроўна, заатэхнік па спецыяльнасці, дацэнт у акадэміі. Тут жа пасля заканчэння дактарантуры працуе і сын Іван Антонавіч, а дачка Людміла Антонаўна — ветэрынарны ўрач гарадской ветстанцыі.

— А яшчэ мы ведаем, што акадэмія мае багатую гісторыю, што яна многае зрабіла па падрыхтоўцы спецыялістаў для сельскай гаспадаркі краіны, па развіцці гэтай галіны. Калі ласка, давайце перагорнем некалькі старонак яе біяграфіі.

— Ветэрынарны інстытут быў заснаваны ў 1924 годзе і насіў імя Касцрычніцкай рэвалюцыі. Сваю дзейнасць ён пачынаў са ста студэнтаў і адзінацаці выкладчыкаў. Сярод яго выпускнікоў і выкладчыкаў шмат слынных вучоных і практыкаў: дырэктар племзавода «Чырвоная Зорка» Клецкага раёна Герой Сацыялістычнай Працы Іосіф Іосіфавіч Плаўскі, былы міністр сельскай гаспадаркі Леанід Вячаслававіч Русак, былы рэктар акадэміі, буйны спецыяліст у галіне кармлення жывёлы Уладзімір Піліпавіч Лемеш, заснавальнік імуналагічнай навукі Міхаіл Сцяпанавіч Жакаў, вядомы вучоны па аднаўленні і гінекалогіі жывёлы Якаў Рыгоравіч Губарэвіч, вялікі інфекцыяніст Васіль Фёдаравіч Пятроў, а таксама Рыгор Сцяпанавіч Мастыка, які праславіўся ў галіне ветэрынарнай хірургіі і іншыя.

Не магу не сказаць яшчэ вось аб чым. Акадэмія ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», ганаровым Дзяржаўным сцягам Рэспублікі Беларусь за асаблівыя дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці. Ёй прысвоены статус вядучай навучальнай установы ў галіне ветэрынарыі. Мы ўзнагароджаны таксама памятным медалём «Еўрапейская якасць» Еўрапейскага дзелавога Савета за поспехі ў падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне ветэрынарыі, маем дыплом «Знак Пашаны» дзелавога Савета краін СНД за поспехі ў развіцці эканомікі. Нашаму калектыву прыемна было пачуць словы аднаго швейцарскага прафесара, які сказаў, што ён праехаў па краінах былога Савецкага Саюза да самага Урала і быў уражаны работай акадэміі. Дарэчы, нашу ВНУ наведалі дзве камісіі з Еўрасаюза і далі дзейнасці калектыву добрую ацэнку.

— Антон Іванавіч, колькі ў вас сёння займаецца студэнтаў?

— Пяць тысяч. На пяці факультэтах: ветэрынарнай медыцыны, зоаінжынерным, завочным, даінстытуцкай падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі. Выкладчыкаў — трыста дваццаць. Сёлета плануецца прыняць 365 студэнтаў на факультэт ветэрынарнай медыцыны і 100 — на зоаінжынерны.

— А якія конкурсы на іх звычайна бываюць?

— 1,5—2,4 чалавека на месца, а на завочны даходзіць нават да сямі. У нас рэалізаваны праекты па ўключэнні ў склад акадэміі Лужаснянскага аграрнага каледжа і адкрыцці філіялаў у Гомельскай і Брэсцкай абласцях (гарады Рэчыца і Пінск). У Рэчыцы сёлета адбудзецца першы выпуск філіяла. Неабходнасць адкрыцця гэтых філіялаў была звязана з тым, што ў так званых чарнобыльскіх і палескіх раёнах катастрафічна не хапала спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй нашага профілю. Тым самым зроблены важны крок па ўдасканальванні сістэмы вышэйшай аграрнай адукацыі.

У 2005—2006 гадах мы ажыццявілі інтэграцыю акадэміі з васьмю сярэднімі спецыяльнымі ўстановамі адукацыі зоаветэрынарнага профілю, што паслужыла базай для арганізацыі ступеньчатага навучання і стварэння рэспубліканскай асацыяцыі «Аграрная адукацыя, навука і вытворчасць». Мы адкрылі свой навукова-даследчы інстытут прыкладной ветэрынарнай медыцыны і біятэхналогіі, які рэзка падняў прэстыж акадэміі на міжнародным узроўні, займаемся распрацоўкай новых прэпаратаў для лячэння жывёлы, дапамагаем жывёлагадоўчай галіне вызначаць прычыны яе захворванняў, даследуем якасць кармоў, што вельмі важна для павышэння прадуктыўнасці жывёлагадоўлі.

Давайце паразважаем. Не так даўно ў сярэднім ад каровы атрымлівалі 2—3 тысячы кілаграмаў малака ў год, цяпер — 5—6 тысяч. Лічу, што ў гэтым ёсць пэўная заслуга і нашай акадэміі, якая для дасягнення сказанага падставіла сваё навуковае плячо. А Прэзідэнт краіны ставіць задачу павысіць надоі да 10 тысяч кілаграмаў. А гэта — суцэтны ўзровень, на які проста так, без выкарыстання навуковых рэкамендацый па многіх пытаннях, не выйдзеш. Так што работы хопіць і нам.

Ідуць практычныя заняткі на факультэце ветэрынарнай медыцыны пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры Станіслава СТАСЮКЕВІЧА.

— У шэрагу ВНУ рэспублікі, Антон Іванавіч, адкрываюцца новыя кафедры, розныя курсы, спецыялізацыі. А як у вас?

— Не з'яўляемся выключэннем і мы. Летась пачалі набор яшчэ на дзве спецыяльнасці — ветэрынарная санітарыя і экспертыза і ветэрынарная фармацыя, якія з'яўляюцца новымі для нашай краіны ўвогуле. Час патрабаваў падрыхтоўкі кадраў па гэтых напрамках дзейнасці, бо рэспубліка інтэнсіўна працуе з замежжам, пастаўляючы туды шмат жывёлагадоўчай прадукцыі, і адсюль вынікае, што павінны быць строгія санітарныя правілы не толькі ў працэсе перапрацоўкі сыравіны, але і ў вырошчванні жывёлы, утрыманні яе і адкорме. Адпаведна такі ж санітарны рэжым праводзіцца на пагранічных пераходах і мытнях.

— Адным словам, рыхтуеце экспертаў-урачоў па якасці жывёлагадоўчай прадукцыі?

— Абсалютна правільна. Што датычыцца ветэрынарнай фармацыі, то ў савецкія часы, на жаль, была слаба развітая ветэрынарная фармацэўтычная прамысловасць, бо лічылася, што ўсё можна купіць за мяжой, а пасля развалу СССР выявілася, што гэта — упушчэнне, і справы неабходна выпраўляць. Ветэрынарная фармацыя — гэта галіна ветэрынарнай медыцыны, якая займаецца вырабам, стандартызацыяй, даследаваннем, захаваннем і рэалізацыяй лекавых сродкаў. Такім чынам, у першым выпадку выпускнікі атрымаюць кваліфікацыю «ветэрынарна-санітарны ўрач», у другім — «правізар ветэрынарнай медыцыны».

Загадчык кафедры заалогіі Мікалай АЛЯХНОВІЧ.

Асобна хачу сказаць, што мы прапанавалі ў вытворчасць больш за сто прэпаратаў, сярод якіх ёсць і ўнікальныя, і тым самым дапамагаем сельскай гаспадарцы працаваць больш эфектыўна, дасягаць харчовай бяспекі краіны. Ды і наогул ёсць такі выраз: медыцынскі ўрач лечыць чалавека, ветэрынарны ўрач — чалавецтва.

— Наколькі мы зразумелі, Антон Іванавіч, першапачаткова размова ішла пра падрыхтоўку спецыялістаў на факультэце ветэрынарнай медыцыны. Нашаму чытачу будзе цікава інфармацыя і пра тых, хто вучыцца або будзе вучыцца на зоатэхнічным факультэце.

— Бадай што, няма ніводнай больш складанай сельскагаспадарчай прафесіі, чым заатэхнік. Добры зоаінжынер — гэта і вопытны біёлаг, які пазнаў тайны жывога, законы прыроды, і разумны арганізатар, які да тонкасцяў ведае ўсю тэхніку жывёлагадоўлі і глыбока разбіраецца ў пытаннях эканомікі, арганізацыі і аплаце працы, і знаўца розных, часам складаных машын, здольны пры неабходнасці стаць да кормараздатавальнага агрэгата або пульта дыяльнага апарата.

Названая прафесія абавязвае студэнта грунтоўна вывучаць навукі біялагічнага профілю: марфалогію, біяхімію, мікрабіялогію, фізіялогію, генетыку; агульнай і прыватнай зоатэхніі: кармленне, развядзенне сельскагаспадарчых жывёл, жывёлагадоўля, свінаводства, авечкагадоўля, конегадоўля, птушкагадоўля і інш. Акрамя гэтага студэнты асвойваюць тэорыю і практыку рынкавай эканомікі, маркетынг і менеджмент, бухгалтарскі ўлік, падаткаабкладанне і інш.

— Вы сказалі, Антон Іванавіч, што сёлета плануецца прыняць 365 студэнтаў на факультэт ветэрынарнай медыцыны і 100 — на зоаінжынерны. Магчыма, для арганізацыі гэтай справы праводзілася пэўная работа?

— А як жа. У 16 раёнах Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцей мы правялі Тыдні акадэміі. Такія мерапрыемствы, падчас якіх чытаем лекцыі, праводзім навуковыя канферэнцыі, сустрэчы з моладдзю і г.д., практыкуем кожны год. Лічым, што гэта важная форма падрыхтоўчай работы, і яна дае свой вынік. За кожным раёнам замацаваныя выкладчыкі акадэміі, якія наведваюць школы, выступаюць у прэсе і яны, і кіраўнікі нашай ВНУ. У розных абласцях краіны маецца 23 ліцэйскія класы, з навучэнцамі якіх мы падтрымліваем цесныя сувязі, расказваем ім пра акадэмію, яе дасягненні. Гэта нібы шэфства. Вядома ж, працуюць у нас і падрыхтоўчыя курсы, дні адчыненых дзвярэй і г.д.

Не магу тут не паўтарыцца вось пра што. Чатыры гады таму па рашэнні Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання была створана зоаветэрынарная асацыяцыя, на чале якой — наша акадэмія. Сюды ўваходзіць адзінаццаць аграрных каледжаў, у якіх рыхтуюць спецыялістаў для жывёлагадоўлі і ветэрынарыі. У рамках асацыяцыі таксама праводзім розныя мерапрыемствы. Напрыклад, нядаўна прайшоў фестываль «Студэнцкая аграрная вясна», у праграме якога і выступленні самадзейных артыстаў, і спартыўныя спаборніцтвы, і конкурсы фотаработ. Цікавай і, вядома ж, карыснай была і студэнцкая канферэнцыя, у якой удзельнічалі і навучэнцы каледжаў. Правялі мы і семінар з іх выкладчыкамі. Мэты падобных мерапрыемстваў — актывізацыя работы з будучымі кадрамі сельскагаспадарчай галіны, павышэнне якасці іх падрыхтоўкі. Усе працы, якія выдаюцца акадэміяй, мы перадаём каледжам. А гэта і манаграфіі, і вучэбная, і навуковая літаратура.

— Антон Іванавіч, а што можна сказаць пра вучэбна-матэрыяльную базу акадэміі?

— Зноў вярнуся да таго, што сказаў швейцарскі прафесар, калі наведаў яе: лепшага абсталявання для падрыхтоўкі ветэрынарных урачоў у дзяржавах былога СССР, чым у нас, ён не бачыў. Яно ў нас і нямецкае, і англійскае, і расійскае. Самае сучаснае. З яго набыццём праблем не было. У апошнія пяць гадоў на гэтыя мэты было адпушчана сем мільярдаў рублёў.

У нас выдатны студэнцкі гарадок, сем інтэрнатаў, вучэбныя корпусы, бібліятэка, у якой каля аднаго мільёна экзэмпляраў кніг, навуковай і мастацкай літаратуры, тры чытальныя залы, сталовая, спартыўныя пляцоўкі, актавая зала. Падрыхтавана пляцоўка для будаўніцтва новага корпуса. Намечана таксама будаўніцтва стадыёна і жылога дома для аспірантаў і студэнтаў. Усё гэта ў планах.

— На вашым стале, Антон Іванавіч, мы бачым нашу газету «Звязда» і кнігу «Ветэрынарная энцыклапедыя» на беларускай мове...

— З'яўляюся пастаянным чытачом вашай газеты. Яна мне вельмі падабаецца не толькі змястоўнымі матэрыяламі на розныя тэмы, але яшчэ і тым, што актыўна прапагандуе родную мову. А наконт «Ветэрынарнай энцыклапедыі» справа такая. Мы вырашылі перакласці яе на беларускую мову, і ў 1995 годзе пры падтрымцы Вярхоўнага Савета выдалі яе тыражом пяць тысяч экзэмпляраў.

— Добрую справу зрабілі. Зычым вашаму калектыву новых поспехаў.

— Дзякуй.

Матэрыял падрыхтавалі Уладзімір ПЕРНІКАЎ, Алена ДАЎЖАНОК, Марыя ЖЫЛІНСКАЯ (фота).

5-курснік Аляксей БАЗЫЛЕЎСКІ любіць і ўмее даглядаць жывёл. Ягуана нядрэнна адчувае сябе на руках Аляксея.

Студэнтка факультэта ветэрынарнай санітарыі і экспертызы Юля АСІНЦАВА.

210026, г. Віцебск, вул. 1-я Даватара, 7/11
Факс (0212) 37 02 84
УНП 300002681

Кафедра акушэрства і гінекалогіі жывёл. На прыёме — хворая Рагуля.

Прыгожае жыццё

НЯВЕСТЫ пры парадзе

Праліўны дождж скарэктаваў праграму «Парада нявестаў» — давялося адмовіцца ад масавага катання на каруселях, запуску сотні паветраных шарыкаў і скараціць аўтамабільную прагулку па горадзе. Але нявесты навярсталі ўпушчанае ў сталічным клубе «Арыён», дзе адбылася заключная вечарынка і ўзнагароджанне пераможцаў. А вызначыць апошніх сярод 7 яркіх, таленавітых і харызматычных камандаў было няпроста: настолькі відовішчнымі былі тэатр ценяў і рэтра-дэфіле, харэаграфічная пастаноўка ў стылі рок і смелы канкан, сола на саксафоне і спалучэнне «Волагды» з хітом Глюкозы «Танцуй, Расія»... Акрамя таго, журы ацэньвала вершаваныя экспромты і эксклюзіўны взлюм ад кожнай каманды.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Нявестаў падзялілі на 7 камандаў па 7 чалавек (для параўнання: летась было 6 па 6). Для кожнай з камандаў — «Байкершы», «Лясныя німфы», «Lady in Red» «Нявесты-стылягі», «Рускія прыгажуні», «Рыжыя шэльмы», «Нявесты-рэтра» — стылісты распрацавалі свае адмысловыя вобразы, падабралі макіяж, прычоскі і аксесуары. Зрэшты, і самі дзяўчаты не спалі ў шапку. Парад-2009 стартаваў у Беларускім дзяржаўным музеі архітэктуры і побыту, дзе нявесты пазнаёміліся з беларускімі вясельнымі абрадамі «Апрананне маладой» і «Брама шчасця». Потым картэж даставіў дзяўчат у Парк імя Горкага, дзе пры падтрымцы артыстаў беларускай эстрады кожнай камандзе трэба было ўсяго за 120 секундаў зрабіць самапрэзентацыю. І хоць надвор'е ў гэты час канчаткова сапсавалася, але захаваўся сонечны настрой у балельшчыкаў і саміх удзельніц — дзяўчаты спявалі і танцавалі, паказвалі тэатральныя мініяцюры і ладзілі дэфіле, так што натоўп гледачоў пад каляровымі парасонамі не разыходзіўся некалькі гадзін.

Арганізатары пакуль таксама не загадваюць, якім будзе «Парад нявестаў-2010», але не сумнявающца, што ён абавязкова адбудзецца, незалежна ад надвор'я, што ён стане яшчэ больш маштабным (магчыма, 8 камандаў па 8 нявестаў? **— Аўт.**) і яркім. «Праект, заснаваны маскоўскім фатографам Кацярынай Аляшынскай, ахоплівае ўсё больш гарадоў і ўжо не адну дзяржаву. Гэта пацвярджае рост увагі да яго і важнасць радасных эмоцый ад ідэі замужжа. У гэтым і ёсць наша мэта як арганізатараў — папулярызаваць шлюб як святочную падзею, ад якой можна атрымліваць задавальненне і асалоду ўсё жыццё, — сцвярджае Алеся Какошнікава. — Таму мы плануем працягваць развіваць праект». У прыватнасці, магчыма, што налета ў «Парадзе нявестаў» возьмуць удзел больш сталыя жанчыны і нават бабулі — бо, напэўна, кожнай жанчыне незалежна ад узросту хочацца не проста ўспомніць, як гэта было, але і зноў адчуць сябе самай прыгожай, самай каханай і самай шчаслівай...

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.
Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ і Сяргея ЧОРНАГА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.38	21.46	17.08
Віцебск —	4.19	21.44	17.25
Магілёў —	4.28	21.36	17.08
Гомель —	4.34	21.23	16.49
Брэст —	4.55	21.59	17.04
Гродна —	5.05	21.50	16.45

Месяц

Маладзік 22 чэрвеня.
Месяц у сузор'і Рака.

Імяніны

Пр. *Антаніны, Мікалая, Паўла, Цімафея.*
К. *Агрыпіны, Ванды, Пятра, Юзафа.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



...у суседзяў

ВАРШАВА	+21..+23°С	КІЕЎ	+29..+31°С	РЫГА	+21..+23°С
ВІЛЬНЮС	+17..+19°С	МАСКВА	+17..+19°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ	+20..+22°С

Віншую **з 18-годдзем** любага ўнука **Арцёма Вадзімавіча ФІЛІМОНЧЫКА**. Зычу моцнага здароўя на доўгія гады, удачы і поспехаў у тэсціраванні.

Дзед, *г. Мінск.*

Дарагая сястрычка **Лёня ГРАКОВІЧ**, сардэчна віншую **з вялікім юбілеем**. Жадаю моцнага здароўя, добрага настрою, шчасця і радасці на доўгія гады.

Твой родны брат Аляксандр.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by;

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значкам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.444 Індэкс 63850. Зак. № 3346. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12